Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 ЖНІЎНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 145
(26503)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада неадкладна выправіць сітуацыю з пастановай № 991

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада неадкладна выправіць сітуацыю з пастановай № 991 «Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Беларусі».

Пасля вяртання кіраўніка беларускай дзяржавы з Кыргызстана да яго паступілі шматлікія скаргі наконт прынятай урадам пастановы № 991. За растлумачэннямі гэтага рашэння Савета Міністраў звяртаюцца і ў Адміністрацыю кіраўніка дзяржавы. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду неадкладна разабрацца і прыняць меры па выпраўленні негатыўнай сітуацыі, што склалася.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Урад Беларусі прызнаў страціўшай сілу пастанову Саўміна № 991

Урад Беларусі прызнаў страціўшай сілу пастанову Савета Міністраў ад 28 ліпеня 2009 года № 991 «Аб некаторых пытаннях набыцця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь». Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове ўрада ад 4 жніўня 2009 года № 1020, паведамілі ў Апараце Саўміна.

Новы дакумент уступіў у сілу з 2 жніўня 2009 года.

БЕЛТА.

СТАЛІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ

РАСЦЁМ!

Сёння ў будаўнічай галіне сталіцы працуе больш за сто тысяч чалавек. Узвядзенне новых будынкаў — гэта не толькі хлеб для будаўнікоў, але яшчэ і працоўныя месцы для людзей, якія задзейнічаны на заводах па вытворчасці матэрыялаў, у праектных інстытутах. Акрамя таго, новае жыллё — гэта і дадатковыя працоўныя месцы для арганізацый, якія будуць іх абслугоўваць. І ў час крызісу будаўнічая галіна павінна працаваць стабільна, нарошчваць магутнасці. У гэтым упэўнены **намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй Ясючэня**. «Для таго, каб будаўніцтва працягвалася, неабходна забяспечыць яго фінансаванне. А гэта немагчыма рабіць толькі за сродкі бюджэту, бо паступленні ў яго ў выніку зніжэння аб'ёмаў прамысловасці скарачаюцца. Таму адзін з кірункаў, якога мы павінны прытрымлівацца, — задзейнічаць рэсурсы грамадзян і арганізацый. Дзякуючы гэтаму тэмпы жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы пастаянна нарошчваюцца. Дзяржава стварыла сістэму падтрымкі па будаўніцтве жылля, людзі атрымліваюць крэдыты. Але гэта рэсурсы, якія вяртаюцца, акрамя таго насельніцтва выкарыстоўвае свае зберажэнні. Так, на сёння ўклады на будаўніцтва жылля на 50 працэнтаў складаюцца з ільготных крэдытаў, і яшчэ на 50 — гэта няльготныя крэдыты і сродкі грамадзян».

Прынамсі, тое, што гэта сістэма зладжана працуе і грошы грамадзян знаходзяцца ў актыўным абароце, дапамагае не толькі забяспечваць працай людзей, звязаных з увядзеннем жылля, але і часткова стрымліваць інфляцыю. Да таго ж паляпшаюцца ўмовы пражывання мінчан, з кожным годам усё большая колькасць жыхароў сталіцы можа атрымоўваць кватэры. Так, сёлета будзе здадзена адзін мільён чатырыста тысяч квадратных метраў жылля, з іх не менш за 75 працэнтаў для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У наступным годзе лічбу па ўведзеным жыллі плануецца павялічыць да 1 мільёна 740 тысяч. Дарэчы, кошт квадратнага метра для чаргавікоў, якія ўступаюць у ЖБК, сёння складае каля паўтара мільёна рублёў, і **ў найбліжэйшы час гэта лічба не будзе істотна мяняцца**.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

«ХАЧУ Ў АРМІЮ, БУДУ ТАНКІСТАМ...»

Напісаў у заяве ў ваенкамат чачэрскі юнак Віктар Мазураў, калі яго выклікалі на ўручэнне ваеннага білета і вызвалення ад службы, як сіраты. З ім правялі растлумачальную гутарку, параілі падумаць, не спяшацца. А хлопец стаяў на сваім. Паспяхова прайшоў медкамісію і на паўтара года развітаўся з «грамадзянкаю». «Дзівак», — напэўна гэтак падумалі пра яго равеснікі: — Меў «халяву» не служыць, зрабіў жа наадварот». Я знайшоў яго ў адным з падраздзяленняў, дзе служаць танкісты, каб зрабіць гэты фотаздымак. І зразумеў: юнак па-ранейшаму перакананы, што зрабіў правільны выбар.

Навабранец Віктар Мазураў праз некалькі дзён прыме воінскую прысягу, а цяпер, як і належыць, ён праходзіць курс маладога байца ў вайсковай часці 25853: вучыцца хадзіць строем, запраўляць ложак, падшываць варатнічок. Памер абмундзіравання 44, рост 2, памер абутку 41. Учора маладому прызыву ўпершыню далі аўтаматы і вучылі страляць. Так што Віктар нават порах панюхаў. Меркаванне, што цяжка перанесці першыя паўгода, пацвердзіць любы, хто служыў. Малады баец кажа, што першыя дні жыцця па гадзінніку, пад'ёмы ў шэсць раніцы і поўнае падпарадкаванне для яго нязвыклыя, але выгляду, што цяжка, не падае. На лёгкае жыццё ён не разлічваў. Кажа, што ведаў куды ідзе і маральна быў падрыхтаваны.

Трынаццаць гадоў Віктар выхоўваўся ў дзіцячым доме сямейнага тыпу. У сям'і Галіны і Мікалая Родзічаў з Чачэрска, пра якую мне даводзілася неаднойчы расказваць, такіх, як ён, было дванаццаць і ўсе — сацыяльныя сіроты. Віктар быў адным з першых, каго сям'я Родзічаў узяла на выхаванне, у шэсць гадоў патрапіў. Стаў родным чалавекам. Сёлета скончыў ПТВ, атрымаў прафесію шафёра-газзваршчыка. Паспеў папрацаваць у чачэрскім агратэхсэрвісе. Меў прывілеі вучыцца далей. Галіна, як любая маці, перажывае за Віктара, прасіла нават, каб адмовіўся ад рашэння. Але не ўгаварыла. «Ён у нас самастойны, — сказала па тэлефоне Галіна Аляксееўна і дадала: летась ездзіў на будаўніцтва дарогі ў Расію, ажно на Таймыр». У чачэрскім ваенкамаце сказалі коратка-трапна: «Вельмі добры хлопец».

Фотаздымак зроблены па завяршэнні стрэльбішчаў. Першы прывал. Віктар сярод гэткіх жа як сам навабранцаў з Гомельшчыны. Землякі. Амаль усіх іх чакае служба ў танкавых войсках. Будзе цяжка. Але хто кажа, што абараняць Радзіму — лёгкая справа?

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

ЗАМАРОЖАНЫЯ БУДПЛЯЦОЎКІ СТАЛІЦЫ БУДУЦЬ ПЕРАРАЗМЯРКОЎВАЦЦА

За першае паўгоддзе сёлета ў краіне было ўведзена ў эксплуатацыю 3 млн 97,8 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, што адпавядае 103,3 працэнта ад запланаванага Урадам задання, паведаміў учора журналістам першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Міхаіл АБРАМЧУК.

Паўгадавое заданне па будаўніцтве жылля выканалі ўсе рэгіёны краіны за выключэннем Мінска, дзе пры плане ў 700 тыс. кв. метраў было ўведзена ў эксплуатацыю толькі 518,9 тыс. кв. метраў жылля. Чаму адбылося такое адставанне па Мінску ў аб'ёме больш за 180 тысяч жыллёвых квадратаў?

Адказваючы на гэта пытанне журналістаў, Міхаіл Абрамчук адзначыў, што ў свой час горад параздаваў будаўнічыя пляцоўкі розным інвестарам, на якіх планавалася пабудаваць жылыя дамы і аб'екты сацкультбыту агульнай плошчай больш за 4 млн квадратных метраў. Аднак цяпер, у сувязі з сусветным фінансавым крызісам, вялікая колькасць камерцыйных структур прыпыніла сваю інвестыцыйную дзейнасць і нават замарозіла будаўніцтва жыллёвых аб'ектаў. Менавіта таму цяпер мэрыя сталіцы збіраецца пераразмеркаваць раней выдадзеныя будаўнічыя пляцоўкі іншым, больш актыўным інвестыцыйным структурам.

Тут існуе і другі бок праблемы. Сёлета ў Мінску запланавана пабудаваць 1 млн 740 тысяч кв. метраў жылля. Разам з тым, магутнасць усіх арганізацый аб'яднання «Мінскбуд» дазваляе пабудаваць у горадзе падрадным спосабам толькі каля 900 тысяч квадратных метраў жылля. Атрымліваецца, што астатнія бадай 800 тысяч квадратаў павінны пабудаваць камерцыйныя арганізацыі. Адставанне назіраецца якраз па гэтым аспекце будаўніцтва. У мінулыя гады камерцыйнае жыллё ў сталіцы будавалася па кошце ад 1,5 да 2 тысячы долараў за квадратны метр і яно прадавалася на першай стадыі будаўніцтва. Такіх цэнаў на жыллё сёння ўжо не існуе. Істотна паменшыўся і попыт на камерцыйнае жыллё. А ў выніку сёння ў кожным камерцыйным доме 30—40 кватэр так і не маюць сваіх гаспадароў. Пры дэфіцыце жывых грошай інвестары вымушаны браць дарагія крэдыты пад 17—23 працэнты гадавых і далей актыўна будаваць жыллё ўжо не могуць.

Чаму пустуюць кватэры ў даволі ліквідных дамах? У маналітна-каркасных дамах камерцыйных структур мінімальным попытам карыстаюцца вялікія двухпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай 80—85 кв. метраў і трохпакаёўкі плошчай да 100—105 «квадратаў». Такія кватэры сёння не могуць дазволіць сабе і чаргавікі, бо не вырашана пытанне па льготным крэдытаванні кватэр вялікай плошчы ў поўным аб'ёме. Для чаргавікоў ільготны крэдыт можа выдавацца толькі на нарміраваную плошчу на кожнага члена сям'і. Астатнія грошы за лішнія метры трэба шукаць ужо ва ўласнай кішэні... Міхаіл Абрамчук паведаміў, што сёння спецыялістамі міністэрства распрацоўваецца рашэнне, каб на лішкі такой жыллёвай плошчы вялікіх кватэр прадугледзець выдачу не льготных, але і не вельмі дарагіх крэдытаў, што прадугледжаны на агульных падставах.

Асобна намеснік міністра спыніўся на тэме кошту будаўніцтва жылля. За апошнія 8 месяцаў кошт будаўніцтва камерцыйнага жылля знізіўся амаль удвая, з 1,5—2 тысяч да 1—1,2 тысячы долараў за квадратны метр. Для асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па чарзе будуецца жыллё з дзяржаўнай падтрымкай па кошце ад 500 да 600 долараў. Жыллё па такім невялікім кошце ў нашых суседзяў ужо даўно не будуецца, лічыць Міхаіл Абрамчук. Суразмоўца ўпэўнены, што сёлета кошт і камерцыйнага жылля, і жылля з дзяржпадтрымкай будзе заставацца амаль нязменным. Невялікія ваганні цаны будаўніцтва магчымыя толькі ўслед за павелічэннем памераў інфляцыі.

А вось у наступным годзе будаўніцтва жылля можа падаражэць больш моцна, у тым выпадку, калі краіне давядзецца купляць у Расіі больш дарагі газ і іншыя энерганосьбіты. Міхаіл Абрамчук паведаміў, што сёлета будзе завершана рэканструкцыя камбінатаў буйнапанэльнага домабудаўніцтва ў Віцебску, Магілёве і Гомелі. Тады запланавана перайсці на вытворчасць новых серый дамоў па сучасных тэхналогіях. Магутнасць такіх домабудаўнічых камбінатаў будзе дасягаць больш як 200 тысяч кв. метраў жылля ў год.

Сяргей КУРКАЧ.

У эпіцэнтры дзяржаўнай палітыкі

ХЛЕБ ІНДУСТРЫІ КРАСНАСЕЛЬСКАЙ ЗАГАРТОЎКІ

Генеральны дырэктар акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы» Валянцін Алегавіч ВЕРАЦІЛА.

Можна толькі здагадвацца, колькі ўсяго карыснага, важнага, патрэбнага людзям зрабіць працавіты, адказны чалавек, пражыўшы на зямлі ні многа, ні мала 95 гадоў. А калі гэта шматтысячны калектыў? Такі, як калектыў акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы», што шчыруе ў Ваўкавыскім раёне... Толькі за апошняе дзесяцігоддзе аднаго цэменту ён выпрацаваў амаль 13 мільёнаў тон. Такой колькасцю «хлеба індустрыі» можна загрузіць больш за 185 тысяч хапроў, і састаў са спецыяльных вагонаў расцягнецца на тысячы і тысячы кіламетраў.

Гэтая прыгожая дата — 95 гадоў з дня заснавання — супадае (ці амаль супадае) з прафесійным святам будаўнікоў і ўсіх працаўнікоў будаўнічай індустрыі. З гэтай нагоды творчая брыгада «Звязды» пабывала на прадпрыемстве, сустрэлася з яго кіраўнікамі і радавымі работнікамі, ветэранамі працы.

Спыніцца ў развіцці — значыць, сысці з дыстанцыі

На пытанні «Звязды» адказвае генеральны дырэктар акцыянернага таварыства Валянцін ВЕРАЦІЛА.

— Дзень будаўніка мы заўсёды адзначаем усім калектывам, бо лічым за гонар адносіць сябе да гэтай вялікай працавітай сям'і, — з самага пачатку падкрэсліў Валянцін Алегавіч. — Яе члены ўзводзяць канкрэтныя аб'екты, якія можна ўбачыць, ацаніць, палюбавацца. Вынік бачны адразу, а яго аснова — гэта прадукцыя, што выпускае наш калектыў: цэмент, вапна, сухія будаўнічыя сумесі і г.д. Наш унёсак відавочны, і ён дае права пры ўшанаванні будаўнікоў не забывацца і пра нас. Тым больш што мы імкнёмся, каб наш прадукт быў заўсёды якасным, сучасным, па даступных для спажыўца цэнах.

Дабівацца ўсяго гэтага дапамагаюць пастаянная мадэрнізацыя вытворчасці, новае будаўніцтва, тэхнічнае і тэхналагічнае «пераўзбраенне», ажыццяўленне энергазберагальных мерапрыемстваў. Для параўнання скажу, што стары цэментны завод даваў у год 820 тыс. тон, і расход паліва на ім быў 270 кілаграмаў умоўнага паліва на адну тону клінкеру. Мы пабудавалі новы завод, які здольны даваць народнай гаспадарцы 1 мільён 800 тысяч тон з расходам паліва 199 кілаграмаў умоўнага паліва на тону клінкеру. Замест таго, каб спыніцца, «перавесці дух», пачынаем будаўніцтва па сутнасці новага цэментнага завода, які будзе працаваць па так званым сухім спосабе, дзякуючы чаму расход паліва скароціцца прыкладна да 135 кілаграмаў, што зробіць нашу прадукцыю яшчэ больш таннай.

— Наколькі мы ведаем, справа не ў адным толькі сухім спосабе...

Віншуем: 9 жніўня — Дзень будаўніка

— Каб таварыства не было цалкам залежным ад такога віду паліва, як газ, на новай вытворчасці асноўным палівам стане альтэрнатыўнае, непараўнальна больш таннае — вугаль. Бо сёння 52 працэнты ў цане цэменту — газ і электраэнергія.

Гэта будзе сучасная вытворчасць еўрапейскага кшталту, з эфектыўнымі сістэмамі пылаўлоўлівання, якія зробяць прадпрыемства цалкам бяскшкодным для экалагічнага асяроддзя. Адна яго печ дазволіць выпускаць цэменту столькі, колькі зараз яго даюць чатыры нашы печы, і нават крышку больш. На гэтых чатырох мы, напружваючы дастаткова моцна людзей і вытворчасць, выпускаем недзе 1 мільён 800 тысяч тон у год, там будзем выпускаць 2 мільёны тон на адной тэхналагічнай лініі. І калі попыт на цэмент застанецца такім жа, як сёння, то зможам пакінуць дзеючыя тэхналагічныя лініі, асабліва дзве апошнія па часе ўводу. І будзем здольны даць краіне каля двух з паловай мільёнаў тон цэменту — па меншэнергаёмістай тэхналогіі, што зробіць больш таннымі як сам цэмент, так і будматэрыялы, у якіх цэмент выкарыстоўваецца як сыравіна.

— Але ж вы і без таго самы буйны вытворца «хлеба індустрыі» ў краіне...

— Так, сёлета плануем вырабіць каля 1 720 000 тон цэменту, а гэта больш, чым даюць іншыя цэментныя заводы Беларусі. Чаму не 1 800 000, як летась, хоць магутнасці засталіся тыя ж? Рынак сёння паказаў, што крыху знізіўся попыт на цэмент з большай колькасцю дабавак, і аб'ёмы яго вытворчасці мы зменшылі. Усё больш запатрабаваным становіцца высакамарачны цэмент. У яго, плюс да высокай якасці канечнага прадукту, меншыя тэрміны «схоплівання», інакш кажучы зацвярдзення, ён патрабуе меншых затрат пры выкарыстанні, зусім іншыя энергазатраты на тую ж прапарку. Таму сёлета выпусцім цэменту крышку менш, але больш высокіх марак, якія патрабуе рынак краіны. Бо будуюцца такія ўнікальныя аб'екты, як «Мінск-Сіці», «Мінск-Арэна», «Сіліконавая даліна», набірае размах жыллёвае будаўніцтва. Усё часцей выкарыстоўваюцца найноўшыя будаўнічыя тэхналогіі — каркаснае і маналітнае домабудаванне. І патрэбен цэмент высокіх марак.

Калі далей гаварыць пра нашых «імянітых» спажыўцоў, то ў Гродзенскай вобласці ўзводзіцца Нёманская ГЭС — туды ідзе толькі наш цэмент. Прычым той, выпуск якога мы наладзілі зусім нядаўна, у другой палове мінулага года — пясчаністы цэмент ПЦП 500. Сёння ў выглядзе бетону ён закладваецца ў плаціну Нёманскай ГЭС. Пасля яе ўзвядзення ніжэй па цячэнні будзе закладвацца яшчэ адна гідраэлектрастанцыя.

Ужо пачынаюць разгортвацца работы на Беларускай атамнай станцыі, а там — і жылы гарадок для будаўнікоў, і пасёлак жылых дамоў для абслуговага персаналу, затым падыдзе чарга на будаўніцтва самой станцыі, спатрэбяцца высакамарачныя бетоны. І я ўпэўнены, што для вытворчасці такіх бетонаў будзе выкарыстоўвацца толькі наш цэмент. Не вязці ж яго з Крычава ці Касцюковічаў.

Другі па значнасці наш прадукт — вапна, — працягвае свой расказ генеральны дырэктар. — Яна карыстаецца сур'ёзным попытам, нягледзячы на тое, што цана дастаткова высокая. Расход паліва пры вытворчасці таксама не малы — 300 кілаграмаў умоўнага паліва на тону. Але мы распачалі праект, які дазволіць у другой палове 2010 года выпускаць 120 тысяч тон вапны, таксама сухім спосабам, з расходам паліва ўжо 180 кілаграмаў умоўнага паліва на тону. (Параўнайце: 300 і 180.) Гэта дасць магчымасць айчынным вытворцам знізіць цану на сілікатную цэглу і блокі з ячэістага бетону. Мала таго, мы імкнёмся тыя ж блокі з ячэістага бетону выпускаць і ў сябе, бо попыт на іх на рынку ўзрастае. А чаму б і не? Сёння прадпрыемствы краіны, якія выпускаюць блокі, выкарыстоўваюць менавіта наш цэмент і нашу вапну. Для гэтага возяць іх да сябе за многія кіламетры, у выніку накладныя расходы адчувальна ўзнімаюць цану.

Гэты наш праект — па выпуску ўласных блокаў — спадзяёмся рэалізаваць ужо ў жніўні, і да таго, што маем сёння, — цэмент, вапна, трубы, шыфер, сухія будаўнічыя сумесі, поліэтыленавая плёнка — будзем яшчэ выпускаць і блокі. Гэта дасць магчымасць пашырыць гаму выпускаемай прадукцыі. І што цікава: усё тое, што я назваў, за выключэннем хіба плёнкі, вырабляецца на сыходным прадукце, які выпускаем самі, — цэменце і вапне. Што патрэбна яшчэ? Пясок? Маем уласныя кар'еры пяску з патрэбным хімічным і мінералагічным саставам, які ўжо выкарыстоўваецца намі ў вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў і будзе шырока выкарыстоўвацца ў вытворчасці блокаў з ячэістага бетону.

Можна не сумнявацца, што новая наша прадукцыя — ячэістыя блокі, будзе самай таннай. Чаму больш таннай, чым у іншых вытворцаў? Бо сыравіна — уласная, і браць яе самі ў сябе будзем па сабекошце, без «накрутак». Блокі будуць найвышэйшай якасці, бо выпуск іх наладжваецца на сучасным абсталяванні і з выкарыстаннем сыходных матэрыялаў, у якасці якіх мы ўпэўненыя. Нашы сыходныя прадукты — цэмент і вапну — ведаюць у Еўропе. Мы набылі лінію «Маза Хенке» для вытворчасці блокаў, і гэтай марцы таксама давяраюць у Еўропе. Так што пакупнікі з Польшчы, з Літвы, ведаючы ўсё гэта, будуць добра разумець, што мы прапануем ім сучасны якасны блок. І мы будзем вывозіць у суседнія краіны ўжо прадукт з больш высокай прыбавачнай вартасцю, чым проста цэмент ці вапну. Мы разумеем, што станем нязручным канкурэнтам для тых, хто ўжо сёння выпускае гэтую прадукцыю. Нас не пужае, што блокаў з ячэістага бетону ў Беларусі на душу насельніцтва выпускаецца больш, чым у любой іншай еўрапейскай краіне. Рынак расставіць усё па палічках. Гэта самарэгулюючая «субстанцыя», і нашы 250 тысяч метраў кубічных абавязкова знойдуць свайго спажыўца.

Так што, як бачыце, на месцы не стаім, і калі ўзяць прамежак часу паміж нашымі 90-годдзем і 95-годдзем, то за гэты перыяд рэалізаваны буйныя праекты па вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў, гідратнай вапны, тратуарнай плітак. І вось сёння ў стадыі завяршэння праект па вытворчасці блокаў з ячэістага бетону, а на падыходзе — іншыя.

Ужо ў наступным годзе вы зможаце ўбачыць, як дзейнічае новая лінія па вытворчасці вапны сухім спосабам, пра што я згадваў крыху вышэй. Зусім іншая тэхналогія, зусім іншае абсталяванне — з Германіі, Даніі, Чэхіі. Гіганцкая «этажэрка», на якой будуць устаноўлены велізарныя «Цыклоны» і іншае начынне, пачне супернічаць сваёй пяцідзесяціметровай вышынёй з дымавымі трубамі на вапнавым заводзе і зможа ўразіць нават чыста знешне. А спецыяліста яна перш за ўсё ўразіць зусім іншымі энергазатратамі, а значыць, і іншай цаной прадукцыі.

(Працяг на стар. 2, 7.)

ISSN 1990 - 763X

ХЛЕБ ІНДУСТРЫІ КРАСНАСЕЛЬСКАЙ ЗАГАРТОЎКІ

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

— У свой час вашы сухія будаўнічыя сумесі (СБС) былі самымі таннымі на рынку краіны. Вы збіраліся давесці іх выпуск да 70 тысяч тон...

— Сённяшняя цана па-ранейшаму самая нізкая, у тым ліку і сярод завазных сумесяў, хоць яна і дазваляе гэтай нашай вытворчасці працаваць з невысокай рэнтабельнасцю. Цэх дасягнуў праектнай магутнасці, але як толькі з'явяцца фінансавыя магчымасці, мы абавязкова паклапоцімся пра далейшае павелічэнне выпуску СБС.

А зараз увага, сілы і наяўныя фінансавыя рэсурсы сканцэнтраваны на тым, каб кваліфікавана, нават ювелірна правесці «на маршы» перабудову вытворчасці на нашых філіялах у сувязі з усімі тымі навацыямі, якія ўжо адбыліся ці чакаюць нас у недалёкай будучыні — мы пра іх гаварылі. Гэта было няпроста: не спыняючы дзейнасць прадпрыемства, скараціць колькасць ліній па вытворчасці шыферу з сямі да дзвюх, і побач змантаваць дзве фарбавальныя лініі, і ўвесь гэты комплекс паранейшаму дае прадукцыю, якая карыстаецца попытам.

Засталіся толькі дзве лініі па вытворчасці азбестацэментных труб. (Менавіта тут, на выслабаненых тэрыторыях філіяла, пасля навядзення адпаведнага парадку і ўстаноўкі фундаментаў вядзецца мантаж абсталявання для выпуску блокаў з ячэістага бетону.)

Нам па ходу даводзіцца вырашаць многія задачы. Патрэбна захаваць кожнага з 650 чалавек, якія працуюць на заводзе азбестацэментных вырабаў, заняць іх ужо цяпер і перавучыць пад новыя тэхналогіі. Каб удыхнуць «другое жыццё» ў філіял, укладзены немалыя сродкі — больш за 50 мільярдаў рублёў, аддачу ад якіх будзем мець ужо сёлета.

У больш аддаленых планах — замена адной з дзвюх дзеючых шыферных ліній на лінію па вытворчасці прынцыпова іншага дахавага матэрыялу, у якім цалкам будзе адсутнічаць азбест. А ўжо затым падыдзе чарга на пашырэнне вытворчасці сухіх сумесяў. З цягам часу зменяцца будаўнічыя тэхналогіі, і СБС стануць яшчэ больш запатрабаванымі.

Шырокае выкарыстанне сухіх будаўнічых сумесяў павінна быць закладзена ўжо ў праектна-каштарыснай дакументацыі. І тады на любым аб'екце генпадрадчык і субпадрадчыкі ў рамках праекта будуць карыстацца СБС, а не кустарна вырабленым тынковачным растворам. І якасць работ у іх будзе іншай, і затратная частка, я ў гэтым упэўнены.

Мы клапоцімся пра сваіх спажыўцоў, таму для іх зручнасці развіваем сетку ўласных гандлёвых прадпрыемстваў, імкнёмся адкрываць іх у буйных гарадах. У Мінску ўжо ёсць адно гандлёвае прадпрыемства, але збіраемся адкрыць яшчэ адно, бо з'явяцца блокі. Гандлёвыя прадпрыемствы дзейнічаюць у Брэсце і Гродне, у Гомелі. Паспяхова працуе такое прадпрыемства нават у Магілёве, хоць на Магілёўшчыне — два сваіх цэмзаводы. І гэта правільна, рынак павінен быць цывілізаваным. Мы прысутнічаем з нашым цэментам у Польшчы і Літве, хоць у гэтых краінах ёсць уласныя заводы, і мы не вельмі зручны для іх канкурэнт, але яны нас церпяць. Яны стараюцца канкурыраваць з намі больш цывілізаванымі метадамі — шляхам стварэння пэўных прэферэнцый для сваіх вытворцаў, альбо рэалізацыяй тавару ў растэрміноўку, з наступнай праплатай. Для сваіх дзейнічае сістэма зніжак. А якасцю яны нас узяць не могуць. Калі ўжо нас дапусцілі на рынкі Еўропы, то якасць загадзя праверылі, яна — еўрапейская.

Сённяшняя прадукцыя цалкам канкурэнтаздольная па цане і якасці на замежных рынках, у тым ліку на расійскім. Але тут заспакойвацца не варта. Бо растуць цэны на энерганосьбіты. Таму ўсе нашы праекты, рэалізацыяй якіх мы зараз занятыя, дазволяць знізіць энергаскладнік сабекошту прадукцыі. Раней было як? Пабудавалі цэментны завод, і ён 25 гадоў лічыўся заводам з сучаснымі тэхналогіямі. А мы ў 2000 годзе пусцілі адну лінію, у 2002-м — другую. І без асаблівага перапынку заняліся новай, па сухой тэхналогіі. Выкарысталі крэдыт, які выдзяляе кітайскі партнёр, каб ажыццявіць тэхналогіі, што адпавядаюць сусветным узроўням і сусветным стандартам, і каб павялічыць выпуск прадукцыі — пры далейшым павышэнні яе якасці, а таксама апраўданым, матываваным зніжэнні цаны. Вось ключ да таго, каб і ў далейшым, у перспектыве, упэўнена адчуваць сябе на ўнутраным і знешнім рынках.

Але самае галоўнае, што ў нас ёсць, — гэта калектыў, які ўмее працаваць. Вось чаму наша прадукцыя карыстаецца попытам, вось чаму яна сертыфікаваная і рэалізуецца не толькі ў Расіі, але і ў краінах ЕС. А там патрабаванні да якасных параметраў надзвычай высокія.

Дырэктар завода азбестацэментных вырабаў Мікалай КУЗМІЦКІ (на другім здымку) пазнаёміў нас з ходам мантажу новага абсталявання.

— У вашага калектыву ў самыя розныя часы быў свой запас трываласці. Здаецца, што цяпер час прадэманстраваць тую самую трываласць. Якая стратэгія калектыву ў сённяшніх умовах гаспадарання? Гэта стратэгія выжывання, ці наадварот — паўнавартаснай вытворчай дзейнасці?

— З нашай размовы вы адчуваеце, што мы жывём напружаным, цікавым, стваральным жыццём, бачым уласную перспектыву. Інакш не развівалі б вытворчасць далей і не фінансавалі свае новыя праекты: на заводзе азбестацэментных вырабаў — блокі з ячэістага бетону; на заводзе па вытворчасці вапны — сухі спосаб; сухі спосаб на цэментным заводзе. Банкі не даюць крэдытныя рэсурсы тым, хто «ляжыць», альбо ледзь зводзіць канцы з канцамі. А мы карыстаемся даверам і, адпаведна, крэдытамі банкаў — і на агульнабудаўнічыя работы, і на набыццё абсталявання. Сакрэт нашай фінансавай устойлівасці ў тым, што ўся прадукцыя «Краснасельскбудматэрыялаў» з году ў год карыстаецца попытам у спажыўцоў. Мы эфектыўна гаспадарым, забяспечваем дзень сённяшні і клапоцімся пра свой заўтрашні дзень.

Безумоўна, даводзіцца клапаціцца пра эканомію, таму «замарозілі» некаторыя праграмы. Пакуль вырашылі не набываць яшчэ адзін шагаючы дзесяцікубовы экскаватар, ён каштуе каля дзевяці мільёнаў долараў. Няхай гады два папрацуе ў поўную сілу яго ранейшы сабрат. Для работы ў кар'ерах патрэбны яшчэ чатыры новыя бульдозеры, але пакуль купілі тры і такім чынам таксама зэканомілі некалькі мільёнаў долараў.

Мы не пайшлі на чарговае павышэнне заработнай платы, але людзі нас зразумелі. Калектыў з разуменнем ставіцца да намеру зэканоміць нават на ўласных дахадах, але рэалізаваць запланаваныя праграмы, якія дадуць яшчэ больш цвёрдую «глебу» пад нагамі.

Хачу сардэчна павіншаваць са святам, якое мы будзем адзначаць 9 жніўня, усіх будаўнікоў і работнікаў будаўнічай індустрыі, сваіх калег па «гарачым цэху». І, безумоўна, калектыў акцыянернага таварыства «Краснасельскбудматэрыялы».

Шчыра жадаю ўсім здароўя, дабрабыту і — аптымізму. Лічу, што ўсе, хто працуе ў будаўнічай галіне, нягледзячы на тыя ці іншыя крызісныя праяўленні ў сусветнай эканоміцы, кожны на сваім працоўным месцы закладвае трывалы падмурак для ўстойлівага далейшага развіцця краіны.

Нашы самыя цёплыя віншаванні і шчырыя пажаданні ветэранам акцыянернага таварыства. Мы памнажаем вашы працоўныя поспехі, працягваем традыцыі, закладзеныя вамі. Няхай нашы старэйшыны жывуць доўга і шчасліва. Гэта наша жывая гісторыя, мы раўняемся на іх, і ў нашых сяброўскіх, шчырых адносінах увасабляецца стваральная сувязь часоў.

Першыя па колькасці і якасці

Уладзіслаў КАВАЛЕВІЧ, дырэктар цэментнага завода:

— Ніводны будаўнічы матэрыял не карыстаецца такім попытам, як цэмент. Мы выпускаем і адгружаем яго больш за пяць тысяч тон у суткі. Учора адгрузілі сем тысяч тон. Прыкладна палова ідзе самавывазам, у тым ліку для будаўніцтва ў вёсцы. Шаснаццаць тысяч тон пойдзе ў ліпені на экспарт, у прыватнасці ў Калінінградскую вобласць. Якасць цэменту традыцыйна высокая, мы навучыліся яго рабіць і на сусветным узроўні. Калі б мелі яшчэ столькі, прадалі б яшчэ роўна столькі, а то і больш. Не выпадкова на перспектыву кіраўніцтва акцыянернага таварыства задумала з падтрымкай дзяржавы запусціць новую лінію — сапраўдны цэментны завод прадукцыйнасцю яшчэ пяць тысяч тон клінкеру ў суткі. Працаваць ён будзе па эканамічным сухім спосабе. Плануецца, што праект павінен ажыццявіцца на працягу двух бліжэйшых гадоў.

Ёсць салідная, абгрунтаваная праграма па спальванні вугалю замест газу, гэта дасць значны эканамічны эфект. І сабекошт цэменту будзе меншы. І мы зможам з большай колькасцю сваёй прадукцыі выйсці на рынкі Еўропы. Параўнальна нядаўна я быў з дэлегацыяй у Польшчы, пад Беластокам плануецца будаваць міжнародны аэрапорт, і наш цэмент будзе запатрабаваны там у даволі вялікіх аб'ёмах.

Усё гэта прыдае пачуццё перспектывы, а яшчэ — гонару за тое, што ў Беларусі мы ідзём першымі і па колькасці, і па якасці. На прадукцыю ніводнага завода няма такога попыту, як на нашу.

Сродкі, што ўкладваюцца ў новыя праекты, акупяцца і прынясуць немалыя дывідэнды. Пераконвае ў гэтым такі прыклад. Вельмі складана прыжываўся пясчаністы цэмент, пакуль у яго паверылі. Учора ў першым сіласе (складзе) у нас было 1300 тон пясчаністага цэменту. Сёння няма і паловы. Вывезлі за дзень аўтатранспартам. Хто разбіраецца ў цэменце, той разумее, што гэты ідзе другім пасля бездабавачнага. Мы выпускаем і ПЦП (партландцэмент пясчаністы) маркі 500, і партландцэмент маркі 500 Д 20, дзе да 20 працэнтаў — дабаўкі. Для вытворчасці першага нам не трэба плаціць валюту за дабаўкі і вазіць граншлак з-за мяжы, а па сваіх якасцях ён можа прымяняцца як бездабавачны. Напрыклад, для вытворчасці блокаў з ячэістага бетону, сухіх будаўнічых сумесяў, таварных бетонаў.

Калі нехта напачатку сумняваўся, што мы зможам стабільна падтрымліваць заяўленыя характарыстыкі новага прадукту, то цяпер такіх сумненняў ужо няма. Гэты від цэменту паспяхова прысутнічае на рынку Беларусі, ёсць нават тэндэнцыя павелічэння попыту, і мы з цягам часу плануем павялічваць яго вытворчасць. Ён больш танны, чым бездабавачны (амаль на 20 %), што эканамічна выгадна любому прадпрыемству.

Будаўнічыя работы на пляцоўцы новага цэментнага завода цяпер толькі разгортваюцца. Сёння вядзецца падрыхтоўка пляцоўкі пад новую лінію, выконваюцца геадэзічныя работы, актыўна распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя. Галоўным падрадчыкам выступае кітайская кампанія CITIC, якая з'яўляецца асноўным распрацоўшчыкам тэхналогіі з прымяненнем кітайскага, нямецкага і беларускага абсталявання.

Да свята хацеў бы назваць «наўскідку» прозвішчы лепшых працаўнікоў завода. Гэта машыніст экскаватара Сяргей Ігнатовіч з цэха перапрацоўкі сыравіны (ён вылучаны на грамату абласнога савета ў сувязі з Днём будаўніка), майстар Галіна Манчынская з таго ж цэха, абпальвальшчыкі Віктар Хомка і Віктар Касіла з цэха абпальвання клінкеру, іх таварыш Юрый Мазец, намеснік начальніка цэха памолу цэменту Уладзімір Колтак, млынар па памоле сыравіны Аляксандр Кірэеў, начальнік цэха чыгуначнага транспарту і ўпакоўкі гатовай прадукцыі Яўген Мазец, брыгадзір электрарамонтнага цэха Аляксандр Санцэвіч, электрагазазваршчык параводасілавога цэха Іван Броска і многія іншыя.

Характары — крэмніевыя

Дырэктар завода па вытворчасці вапны Віталь НОСКА:

— У нас пяць тэхналагічных ліній для вытворчасці вапны магутнасцю 100 тысяч тон кожная. Дзейнічаюць таксама вытворчасць дробнагранулявanага мелу магутнасцю 100 тысяч тон і вытворчасць гідратнай вапны — 70 тысяч тон у год. Праўда, цяпер працуюць чатыры лініі па вытворчасці вапны, а на адной лініі выраблям клінкер, неабходны для вытворчасці цэменту.

Перспектыва такая: пачата будаўніцтва хуткаснага агрэгата па вытворчасці 120 тысяч тон вапны ў год сухім спосабам. Дзякуючы гэтай тэхналогіі мы будзем мець молатую вапну высокай якасці, актыўнасцю 92-93 працэнты, што адпавядае вапне першага гатунку. Каштарысны кошт будаўніцтва — 36,9 мільярда рублёў, пуск намечаны на чацвёрты квартал наступнага года.

Пры дзеючай «мокрай» тэхналогіі мел, які мы прывозім з кар'ера, растваряем вадой, ператвараючы ў шлам з вільготнасцю 39-40 працэнтаў, затым ён падаецца ў печ для абпальвання. Пры гэтым затрачваюцца велізарныя энергетычныя рэсурсы — на выпарванне той вільгаці, якая была выкарыстана для вытворчасці шламу.

Пры сухім спосабе мел кар'ернай вільготнасці будзе змяльчацца, адразу сушыцца і падавацца на абпальванне, чым дасягаецца значная эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў. І высокая прадукцыйнасць працы — за кошт скарачэння тэхналагічных аперацый, што сталі «лішнімі». Выключаецца памол, бо прадукт будзе гідраціравацца на вытворчасці гідратнай вапны з магутнасцю 70 тысяч тон у год. А астатнія 50 тысяч будзем адгружаць спажыўцам, якія цяпер выкарыстоўваюць парашковую вапну для вытворчасці блокаў з ячэістага бетону, газасілікатнай цэглы, вырабу тынковачных і будаўнічых сумесяў. Акрамя таго, яна прымяняецца для выдзелкі скур, у працэсах металургічнай і іншых вытворчасцяў.

На будаўнічай пляцоўцы пачалося ўзвядзенне сыравіннага аддзялення — ідзе забіўка буранабіўных паляў пад новую тэхналагічную лінію. Ідзе разметка і вынас восяў пад мантаж хуткаснага абпальвальнага агрэгата. Хуткаснага — таму што абпальванне вядзецца на вялікай паверхні кантакту мелу з распаленымі газамі. Таму тэхналогія атрымання парашковай вапны і называецца энергаэфектыўнай, хуткаснай. Сам корпус цэха будзе сабраны з лёгкіх металаканструкцый, і будаўнікі павінны ўправіцца хутка. Генпадрадчык — наш «Цэмбуд».

Ужо ад маці-прыроды мы атрымліваем сыравіну той якасці, што дазваляе вырабіць вапну, якая патрэбна. А далей — сучаснае абсталяванне, сучасныя тэхналогіі і падрыхтаваныя кадры. Вось складнікі высокай якасці прадукту. У нашай сыравіне прысутнічае крэмній, які пры падрыхтоўцы шламу асядае на дно балтушкі, і затым мы яго ўтылізуем. А вось характары, вобразна кажучы, «крэмніевыя», у нашых людзей застаюцца. Вельмі карысная рыса для таго, каб працаваць паспяхова.

— Вось ён, наш цэмент, адзначаны за высокую якасць прэміяй Урада, — з гонарам дэманструе прадукцыю дырэктар цэментнага завода Уладзіслаў КАВАЛЕВІЧ.

У такім «мяшэчку» роўна тысяча кілаграмаў «хлеба індустрыі».

Цэмент фасуецца таксама і ў меншыя аб'ёмы. За пультам кіравання лініяй тэрмаўпакоўкі аб'ектыў убачыў майстра змены Андрэя АЛЬШЭЎСКАГА.

Высокатэхналагічная вытворчасць суседнічае з маляўнічым азеляненнем заводскай тэрыторыі. Вядучы інжынер па кадрах Таццяна БАЛАШОВА прапанавала сфатаграфаваць клумбу з ружамі, якія квітнеюць тут не горш, чым у Батанічным садзе.

Выдатна працуюць на сваіх працоўных месцах абпальвальшчык вапны Іван Крэчка, начальнік цэха ветэран гэтай вытворчасці Фёдар Качароўскі, машыніст млына Пётр Сямак, начальнік цэха памолу вапны Барыс Чэрвонік, машыніст пнеўматычных помпаў Андрэй Радзіваноўскі, аператар пульта кіравання Максім Харкоў — пералік можна працягваць.

Аргументы для спажыўца

Дырэктар завода азбестацэментных вырабаў Мікалай КУЗМІЦКІ:

— Наш філіял — адзін з буйнейшых у акцыянерным таварыстве. Пасля рэарганізацыі, праведзенай у сувязі з маючым адбыцца пускам магутнасцяў па вытворчасці блокаў з ячэістага бетону, уключае ў сябе цэх па вытворчасці азбестацэментных вырабаў, які выпускае шыфер, перш за ўсё фарбаваны, з шырокай каляровай гамай. А таксама азбестацэментныя трубы самых розных дыяметраў. Затым — новы цэх па вытворчасці блокаў з ячэістага бетону і кампазіцыйных матэрыялаў (гэта ўласна блокі з ячэістага бетону, сухія будаўнічыя сумесі, плёнка). Транспартны цэх і шэраг дапаможных падраздзяленняў. На нашай тэрыторыі размешчана і новая міні-ЦЭЦ, ад якой мы атрымліваем электраэнергію, а з пускам вытворчасці блокаў атрымаем танныя пар і цяпло.

Калектыў — больш за 600 чалавек. Штат стараемся не павялічваць, клапоцімся пра прадукцыйнасць працы, таму аб'ёмы работ выконваем наяўнай колькасцю, а аб'ёмы — сур'ёзныя.

У красавіку намі была пушчана другая фарбавальная лінія, дзякуючы чаму падвоілі колькасць фарбаванага шыферу і цалкам знялі праблему дэфіцыту на яго. Сёння, пафарбаваны ў два слаі, па спецыяльна распрацаванай намі тэхналогіі, шыфер прапаноўваецца ў свабодны продаж, на яго няма нейкіх абмежаванняў, размеркаванняў ці чэргаў.

Мы працягваем працаваць са знакамітым «Капаролам», але ўсё ў большых аб'ёмах супрацоўнічаем з айчыннымі вытворцамі — лідскай «Лакафарбай». Разлічваем, што гэта дазволіць знізіць сабекошт шыферных лістоў, а значыць, і іх цану для спажыўца. Ужо цяпер наш афарбаваны ліст на 10—11 тысяч рублёў больш танны, чым у бліжэйшых канкурэнтаў. У нас нават з дастаўкай атрымліваецца танней. І гэта — сур'ёзны аргумент для пакупніка.

Цяпер пра галоўнае на сёння — блокі. Мы фактычна завяршаем мантаж абсталявання, і ў канцы ліпеня — пачатку жніўня прыступаем да пусканаладачных работ. Будзе весціся ўся праграмная і электронная начынка і настройка абсталявання. Шэф-мантаж ажыццяўляе нямецкая фірма-пастаўшчык «Маза Хенке», якая станоўча зарэкамендавала сябе на аднатыпных заводах у Беларусі. Гэта самая перадавая еўрапейская тэхналогія па выпуску трывалага аўтаклаўнага ячэістага бетону з высокай дакладнасцю геаметрыі і з рознай шчыльнасцю. Прычым блокі будуць і гладкія, і з пазгрэбенем і нават захопамі для рук.

А зараз мы з вамі прысутнічаем на мантажы аўтаматызаванай лініі (Мікалай Лявонцьевіч наладзіў невялікую экскурсію для журналістаў), якая з'яўляецца сэрцам будучага цэха. Тут гарачы масіў будзе рэзацца нацяжнымі нажамі-струнамі вертыкальна і гарызантальна на асобныя блокі. Допуск дакладнасці геаметрыі — 1-2 мм. А вось у гэтых гіганцкіх аўтаклавах, што нагадваюць балістычныя ракеты, блокі будуць прапарвацца пры высокім ціску.

Калі гаварыць пра нашых перадавікоў, то хацеў бы пачаць з тых, на каго я абапіраюся ў рабоце. Гэта галоўны інжынер Аляксандр Губіч — вельмі адказны чалавек, які добра ведае вытворчасць. Начальнік цэха азбестацэментных вырабаў Уладзімір Буракоў — наш ветэран, які працуе на заводзе 35 гадоў. Вельмі адказна, нават творча працуюць рабочая цэха вытворчасці блокаў з ячэістага бетону і кампазіцыйных матэрыялаў Святлана Мартынюк, Уладзімір Васільчук з рамонтна-механічнага цэха... Як бачыце, у нас усё ёсць для таго, каб зрабіць якасныя, канкурэнтныя па цане блокі, у тым ліку старанныя і добра падрыхтаваныя людзі, сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы.

Пра нашы аб'екты ведае краіна

Дырэктар «Цэмбуда» Аляксандр ГАЎРУШАЎ:

— «Цэмбуд» быў арганізаваны ў 1987 годзе шляхам зліцця некалькіх аднатыпных арганізацый з мэтай цэнтралізацыі будаўнічых і рамонтных работ у аб'яднанні. З самага пачатку ён займаўся яшчэ і абслугоўваннем жылога пасёлка цэментнікаў — узвёў тут Дамы быту, пральні, жылыя пяціпавярховыя дамы, каля 150 катэджаў. І штогод капітальна рамантаваў да 40 кватэр.

А на нашай вытворчасці намі ў асноўным рамантаваліся і мадэрнізаваліся тэхналагічныя лініі, выконвалася футыроўка печаў. У больш позні перыяд, калі «Цэмбуд» набраўся сілаў, то пачаў браць на сябе буйныя аб'екты капітальнага будаўніцтва. За апошнія гады ўзведзены сушыльнае аддзяленне на цэментным заводзе, цэх па вытворчасці сухіх сумесяў, міні-ЦЭЦ. Усе гэтыя аб'екты былі на слыху грамадскасці, і яны маюць надзвычай важнае значэнне ў вытворчым жыцці акцыянернага таварыства.

Зараз мы адначасова ўдзельнічаем у трох буйных інвестыцыйных праектах — перш за ўсё гэта вытворчасць ячэістых блокаў, дзе мы з'яўляемся генеральным падрадчыкам. Пачынаем праект па пераводзе вапнавага завода на сухі спосаб, таксама ў якасці генпадрадчыка. І ўдзельнічаем у пераводзе цэментнага завода на сухі спосаб.

(Заканчэнне на стар. 7.)

Гідратная вапна шырока выкарыстоўваецца ў народнай гаспадарцы. Фотаздымкі зроблены падчас адпраўкі чарговай буйной партыі заказчыкам і знаёмяць з тымі, хто адказвае за складское захоўванне, улік і пагрузку прадукцыі — вадзіцелем электракара Юрыем АМШТЭЙНАМ і кладаўшчыцай Вольгай КАСІЛА.

Рэха публікацыі

ІМЯ І ПАМЯЦЬ ПРА ГЕРОЯ ЎВЕКАВЕЧАНЫЯ

У нумары «Звязды» ад 19 сакавіка была змешчана прапанова-просьба, у тым ліку да мясцовых органаў улады, ад пенсіянера (колішняга настаўніка гісторыі), старшыні пярвічнай арганізацыі ветэранаў вайны і працы КУСГП «Зарубы» Дубровенскага раёна Мікалая Іванавіча Мартынава: увекавечыць памяць земляка, героя-танкіста Вялікай Айчыннай вайны Андрэя Міхайлавіча Усава (пра подзвіг экіпажа, які ў адным баі знішчыў 22 нямецкія танкі, мы неаднойчы падрабязна пісалі). У прыватнасці, наш чытач прапаноўваў прысвоіць Зарубскай сярэдняй школе, дзе некалі вучыўся Андрэй Усаў, яго імя, а перад фасадам будынка ўсталяваць помнік слыннаму земляку. «Гэта было б вельмі правільна і справядліва ў дачыненні да чалавека, чые баявыя подзвігі і ўсё жыццё якога з'яўляюцца прыкладам для нашчадкаў», цытавалі мы слова Мікалая Іванавіча.

Праз нейкі час на старонках газеты быў змешчаны і афіцыйны адказ на публічны зварот нашага чытача. Дубровенскі раённы выканаўчы камітэт даволі падрабязна распавёў, якая ў раёне праводзіцца праца па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны, што загінулі пры вызваленні Дубровенскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, землякоў, якія здзейснілі баявыя подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Апроч іншых асобаў ішла гаворка і пра танкіста Андрэя Усава. У прыватнасці, на будынку Зарубскай сярэдняй школы планавалася ўсталяваць у яго гонар мемарыяльную дошку. Нам таксама паведамлялі, што піянерская дружына гэтай навучальнай установы змагаецца за права насіць імя слыннага земляка. Тое было ў планах.

І вось з Дубровенскага райвыканкама рэдакцыя атрымала яшчэ адзін ліст. У ім паведамлялася, што і піянерскай дружыне Зарубскай сярэдняй школы прысвоена імя Андрэя Усава, і на будынку навучальнай установы ўсталявана, як і планавалася, мемарыяльная дошка. Яна была выраблена і заняла сваё пачэснае месца па ініцыятыве раённага камітэта ГА «БРСМ» за кошт сродкаў, зароблены падчас працоўнай акцыі «Маладосць. Традыцыі. Будучыня».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Прамая лінія

СЭРЦА І СТРАЎНІК

Пытанні аб лячэнні сардэчна-сасудзістай сістэмы і страўнікава-кішачнага тракта можна задаць загадчыцы тэрапеўтычнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння **Ірыне Фрыдрыхаўне ЯКІМОВІЧ** падчас «прамой лініі», якая адбудзецца **17 жніўня з 14.00 да 15.00** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах:

8 (017) 287 18 36
(Вольга Шаўко)
і 8 (017) 287 18 29
(Святлана Барысенка).

РАТУЕМСЯ АД СПЯКОТЫ

У спякотныя дні людзям, якія маюць хранічныя захворванні, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў. Дрэнна пераносяць гарачыню тыя, хто мае немалы запас тлушчу, хворыя з павышанай функцыяй шчытападобнай залозы. У людзей, схільных да паніжанага артэрыяльнага ціску, менавіта ў спякотныя дні праяўляюцца такія непрыемныя сімптомы, як слабасць, галавакружэнне, замаруджванне сардэчнага рытму і г.д. Для такіх хворых у спякоту рэкамендуецца танізуючая гарбата.

Гіпертонікам гарачыня таксама не ў радасць. Як нам расказала **ўрач-кардыёлаг блока інтэнсіўнай тэрапіі інфарктнага аддзялення № 2 10-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцы Ірына ГРЫШЫНА**, менавіта ў спякотныя дні колькасць пацыентаў у іх аддзяленні павялічваецца. Больш трапляе людзей з гіпертанічнымі крызамі, параксізмамі мігальнай арытміі, спякота правакуе і пачашчэнне прыступаў стэнакардыі.

— Таму, — адзначае спецыяліст, — людзям, схільным да павышанага артэрыяльнага ціску, у гарачыя дні трэба абмежаваць колькасць вадкасці, разам з сокамі і садавіной — не больш як 1 л у дзень, бо шмат вадкасці правакуе павышэнне ціску. Есці менш салёнага. Не сядзець на адкрытым сонцы, асабліва людзям сталага веку. Дозы прымаемых прэпаратаў застаюцца ранейшымі, але, калі ціск павышаецца, іх трэба павялічыць.

Выратаваца ад спякоты дапамогуць і наступныя агульныя парады.

На вуліцы. Традыцыйны спосаб не перагрэцца ў спякотны дзень: панамкі, капелюшы, лёгкае светлае адзенне. Гэта зніжае ўздзеянне прамых сонечных промняў на скуру.

Калі ў цені даходзіць да 30°С, трэба аблівацца вадой. Калі піць, то абавязкова дабаўляць крыху солі. Інакш пры перагрэве будзе праблема з недахопам электралітаў, натрыю, калію, хлору.

Насіце з сабой пастаянна бутэльку з вадой. Можна змочваць галаўны ўбор і насіць яго мокрым. Бо перагрэў галавы вельмі небяспечны.

У выпадку цеплавога шоку пацярпелага трэба перанесці ў цень, абліць вадой, махаць над ім, стваральчы вецер. Можна абкласці замарожанымі прадуктамі з маразільніка.

Вельмі небяспечны перагрэў для дзяцей. Таму галаўны ўбор здымаць з дзіцяці нельга. Дзеці шмат бегаюць, пацеюць, п'юць. Не шкадуйце для іх вады. Таксама можна даць ім адзін раз у дзень кавалачак воблы, і ў іх усё будзе ў парадку з электралітным абменам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дома. Абматайце трубы з гарачай вадой у прыбіральні і ваннай непатрэбнымі анучамі ці хоць бы газетамі, стварыўшы такім чынам цеплаізаляцыю — паветра ад іх будзе награвацца менш.

Калі ў вас у кухні выцяжка, якая выдаляе паветра з памяшкання, а не проста фільтруе яго, уключайце яе кожны раз, як толькі ўключаеце пліту, нават калі вы паставілі чайнік.

Купіце святлоадбівальную плёнку. Яе можна проста прыляпіць на шкло, а можна прымацаваць да фіранкі (з боку акна), і тады вечарам можна будзе адсоўваць яе.

На працы. Устанавіце вентылятар насупраць адчыненага акна ці форткі, каб ён не проста «ганяў» паветра, а праветрываў памяшканне.

Піце больш гарачага, пажадана зялёнага чаю.

Устаўце ў бутэльку з мінеральнай вадой пульверызатар і час ад часу апырсквайце ёй твар і іншыя адкрытыя ўчасткі скуры. Гэта значна палегчыць ваш стан.

Як не прастудзіцца. Прыйшоўшы дадому, не варта «даваць нырца» ў халодную ванну, а лепш прыміце гарачы душ. Усе сасуды расшырацца, і вы выйдзеце з душу свежым і бадзёрым.

Нават у моцную спякоту не выходзьце з дома ў мокрым адзенні і з вільготнымі валасамі: пачуццё прахалоды ў гэтым выпадку кароткачасовае, а вось бранхіт зусім верагодны яшчэ да таго, як адзенне прасохне.

Не трымайце напоі ў халадзільніку, каб не было спакусы глынуць ледзяной вады. У спякоту халодная вада для арганізма — вялікі стрэс.

Вольга ШАЎКО.

СЯСТРЫЧКІ З ВЁСКІ КРЫНІЧКІ

Гісторыя з пажарам у вёсцы Крынічкі Барысаўскага раёна не новая, але нагадаць пра яе нялішне яшчэ раз. І не толькі злосным аматарам-падпальшчыкам сухой травы, гаспадарам вясковых сядзібаў і дачнікам. Кожнаму неабходна ведаць меры перасцярогі і абыходжання з агнём, каб не нарабіць шкоды ні сабе, ні людзям і не дай Бог пацярпець, як здарылася гэта з сёстрамі Зінаідай Кульцёнак і Раісай Волкавай (на фотаздымку) і іхнімі суседзямі. Агонь не даруе свавольства і безадказнасці, пра што жудасна сведчаць папялішчы крынічкаўскіх сядзібаў, ад якіх засталіся адны коміны. Нават цяперашні травастой не здольны схаваць адбіткі вялікай бяды, у якой сёстры ніколечкі не вінаватыя.

Зінаіда і Раіса жывуць цяпер у другім канцы вёскі ў хатах, якія дагэтуль стаялі пустыя. Яны і цяпер — суседкі. Тады наогул жылі адна насупраць другой. Я папрасіў іх прыгадаць пра бяду, якая абрынулася на іх гэтак нечакана ў сёлетнюю Радаўніцу.

«Было вельмі горача і ветрана, — прыгадвае старэйшая сястра Раіса дзень 28 красавіка, — прыблізна а палове на чацвёртую пасля паўдня загаръэўся мой дом. Я паспела схапіць грошы і крыху адзежы».

А Зінаіда нічога не паспела вынесці, затое ўратавала свайго невідушчага мужа, які шэсць гадоў пакутуе ад глаўкомы. «Я выйшла з хаты і ўбачыла, што гарыць наш хлеў. Што, адкуль, чаму — я нічога не разумела, — дадае Зінаіда Захараўна. — Пабегла назад, схапіла дзеда і хутчэй на двор».

У той дзень Зінаіда, як і многія вяскоўцы, збіралася наведаць могілкі, але нешта яе спыніла. «Каб пайшла, напэўна мужа ніхто б не выратаваў».

Звычайна на Радаўніцу бывае шмат выхадных і ў вёску прыязджаюць усе дачнікі. Зразумела, гэта самы час навесці парадак і пасадзіць агароды. А калі яшчэ і надвор'е спрыяе... Але ў той дзень яно спрыяла яшчэ і бядзе. Адзін з колішніх дачнікаў запаліў ці то смецце, ці старую салому, а сам, як пазней дазналіся вяскоўцы, заняўся агародам. Пра агонь узгадаў, калі ўласная хата была ахоплена полымем. Вецер сапраўды дапамагаў агню, як бензін, раздуваў лёгка і перакідваў яго на іншыя пабудовы. «Вёска гарэла, як у вайну», — сказалі жанчыны і дадалі, што іхняя вёска ў вайну якраз і не пацярпела. Неадкладна выклікалі пажарных і, безумоўна, толькі дзякуючы ім не згарэла ўсё. Але ж восем сядзібаў сталі попелам...

Як ні дзіўна, у лёсе Зінаіды Кульцёнак гэта не першая бяда ад агню. 18 гадоў таму ад няспраўнай электраправодкі згарэў яе папярэдні дом. Пагаравалі тады з мужам, але знайшлі моцы і пабудавалі новы. І вось зноў чырвоны певень акрамя хаты паглынуў пуню з сенам, хлявы для каровы і для кабылы, старую і новую лазні, істопку, дзве паветкі, дзесяць машын дроў... Цяпер новы дом ім ужо не патрэбен. За грошы, якія выплаціла дзяржава, пагарэльцы-пенсіянеры прыдбалі сабе старое жыллё. Дзеці дапамаглі ўладкавацца. Зінаіда і Раіса маглі б застацца ў дзяцей у Барысаве, але як іх не ўгаворвалі, вярнуліся назад. «Толькі дадому», — адказалі дзецям. Бо дом для іх больш чым дом. Гэта і суседзі, і зямля навокал, і лес, і рэчка, і могілкі. Вярнуліся, таму што не трымаюць ні на кога зла, што даравалі. Ці скардзяцца на лёс? Якраз гэтага я і не пачуў.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

БЕРАЖЫСЯ АЎТАМАБІЛЯ, за рулём якога п'яны

Субота — самы небяспечны дзень для кожнага, хто нават міжволі становіцца ўдзельнікам дарожнага руху. Такі вынік можна зрабіць на падставе аналізу, праведзенага дзяржаўнай аўтаінспекцыяй УУС Гомельскага аблвыканкама. Яно і зразумела: менавіта ў суботу мы расслабляемся пасля цяжкага тыдня. А тым часам пільнасць, уласцівая ў іншыя дні, адыходзіць кудысьці ўбок. Сітуацыя пачынае змяняцца да горшага ўжо ў пятніцу, калі пасля адносна спакойных сутак і чацвярга адбываецца больш ДТЗ, а ў суботу яна дасягае піку. Між іншым, у нядзелю паводзіны вадзіцеляў і пешаходаў на дарозе таксама не вельмі дысцыплінаваныя. Так і становяцца выхадныя дні самымі «ўраджайнымі» на дарожныя аховары.

Што датычыцца гадзін, тут таксама ёсць зразумелыя заканамернасці. Менш за ўсё аварый адбываецца раніцай — да 11.00, а вось пасля поўдня паступова здарэнняў становіцца больш. Рэзка пагаршаецца сітуацыя на дарозе пасля 17 гадзін. Пакуль большасць з вадзіцеляў не загоняць сваіх жалезных коней у гаражы (гэта прыкладна да 23 гадзін), не трэба страчваць пільнасць. Між тым, статыстыка сведчыць і яшчэ аб адным піку аварыйнасці на дарогах — пасля гадзіны ночы. Відаць, у гэты момант пачынаюць дэманстраваць зухаватасць тыя аўтааматары, якім ужо мора па калена — да дзвюх ночы, пакуль нарэшце не знойдуць прыгоды на сваю галаву...

Выканаўца абавязкаў начальніка ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар МАКУШЭНКА расказвае, што за выхадныя дні можна «злавіць» на дарогах Гомельшчыны больш за 120 вадзіцеляў у нецвярозым стане. І прыводзіць прыклады.

— 5-гадовае дзіця загінула сёлета ў Калінкавіцкім раёне. Яго збіў супрацоўнік сілавых структур непасрэдна ў населеным пункце. Ён наехаў на маленькага веласіпедыста, які рухаўся па абочыне. Віноўнік аварыі знік з месца здарэння. У ходзе пошукавых мерапрыемстваў вадзіцель быў устаноўлены — ён адпачываў дома. Экспертыза пацвердзіла, што ў момант здарэння грамадзянін быў у нецвярозым стане.

Адказнасць за падобнае кіраванне машынай — вельмі жорсткая. Тым не менш сёлета ў Гомельскай вобласці 4482 вадзіцелі былі затрыманы ў стане алкагольнага ап'янення за рулём. За паўторнае кіраванне транспартным сродкам ў нецвярозым стане даведзены ўжо крымінальныя справы ў дачыненні да 334 вадзіцеляў. Менавіта так, у апошнім выпадку наступае не адміністрацыйная, а крымінальная адказнасць. Яна цягне за сабой да 6 месяцаў папраўчых работ або штраф да 1000 базавых велічынь. Супрацоўнікі ДАІ сцвярджаюць, што суд сёння на справе, а не толькі ў тэорыі прымяняе санкцыі, якія палягчаюць кішэню парушальнікаў дарожнага руху на 20 мільёнаў рублёў.

І яшчэ адна акалічнасць. Сёлета ў вобласці за ваджэнне аўтамабіля ў нецвярозым стане былі затрыманы 23 адказныя асобы. Адзін з чыноўнікаў кіраваў аўтамабілем не толькі п'яны, але і пазбаўлены раней вадзіцельскага пасведчання па той жа прычыне. У дачыненні да яго заведзена крымінальная справа. Сярод тых, хто пад добрым градусам садзіўся за руль, заўважаны кіраўнікі розных установ, напрыклад: загадчык кафедры Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта, камандзір узвода ліцэя МНС, спецыяліст транспартнай інспекцыі. Кіраўнік адной з ПМК вобласці п'яны кіраваў службовым аўтамабілем. Штодзень супрацоўнікі ДАІ затрымліваюць у сярэднім 30—35 нецвярозых вадзіцеляў.

Між іншым, што датычыцца яшчэ адной з самых распаўсюджаных прычын здарэнняў на дарозе — перавышэнне хуткаснага рэжыму, кіраўніцтва ДАІ папярэджвае: дарожнае брацтва ў выглядзе перамігвання фарамі становіцца неактуальным — сёння міліцыя аснашчана такой апаратурай, якая здольная «засекчы» перавышэнне хуткасці там, дзе парушальнікі менш за ўсё чакаюць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ЛЕЦІШЧА З ПАЎДНЁВЫМ КАЛАРЫТАМ

Пад Слаўгарадам жонка і муж Міхайлавы вырошчваюць 38(!) гатункаў вінограду. Са жніўня яны запрашаюць турыстаў адпачыць «На Сожы ў Еўдакіі».

Еўдакія Паўлаўна — гаспадыня сядзібы. Яна больш за 30 гадоў пражыла і адпрацавала ў Бішкеку, а ў пачатку 1990-х гадоў перасялілася з Кіргізіі ў Беларусь.

— Я — прафесійны юрыст і працавала суддзёй, а цяпер увесь свой час аддаю прыгажосці прыроды, кветкам, агароду і пчолам, — прызнаецца маладжавая пенсіянерка.

Барыс Іванавіч, у мінулым спецыяліст па электроніцы, цяпер цалкам падтрымлівае памкненні жонкі. Ён паказвае пакой, амаль гатовы для прыёму гасцей. У жніўні тут мяркуюць жыць мінчане і турысты з Ізраіля, якія прагнуць чыстага паветра і спакою.

— Тут у нас цішыня і харство! — запэўнівае Еўдакія Паўлаўна.

Моладзі гаспадары прапануюць ставіць палаткі прама на ўзбярэжжы Сожа. Нават з прыступак на ганку лецішча праз вінаградную лазу адкрываюцца бяскрайнія зялёныя краявіды.

У садку Еўдакіі Паўлаўны — кветкі, арэлі і абвітыя вінаградам аркі. Вінаград — гэта захапленне Міхайлавых.

— Я ўсё жыццё марыў мець кавалак зямлі, каб саджаць вінаградную лазу і вырошчваць спелыя гронкі, — кажа Барыс Іванавіч. — Але такіх умоў не было. Цяпер нарэшце я маю магчымасць займацца сваім хобі. Паверце, і пад Слаўгарадам вінаград цудоўна выспявае!

Яны выпісваюць саджанцы розных гатункаў, вырошчваюць смачны вінаград і частуюць сваіх гасцей хатнім сухім віном.

Другое захапленне гаспадароў — гэта пчолы. Сотня пчаліных сем'яў забяспечваюць сядзібу мёдам.

— Тут добрыя лугі, ліпы і сланечнікі, — расказвае Еўдакія Паўлаўна. — У нашай акрузе няма сельскай гаспадаркі, таму не ўносяцца і ўгнаенні. Атрымліваецца экалагічна чысты мёд, што і пацвярджана сертыфікатамі.

Цікава, што гаспадыня сядзібы прапануе не толькі мёд, але і пчолатэрапію. Яна ўпэўненая, што ўкусы пчолаў, калі няма алергічнай рэакцыі, маюць станоўчае ўздзеянне на арганізм.

— Паводле даследаванняў, пчаляры практычна ніколі не пакутуюць на ракавыя захворванні, — пераконвае пенсіянерка. — Я звычайна закрываю ад пчол толькі галаву, а там няхай кусаюць. І, ведаеце, я ніколі нічым не хварэю, маю моцны імунітэт!

Калі хто за больш традыцыйнае стаўленне да прадуктаў пчалярства, то цяпер кошт літра мёду Міхайлавых каштуе 24 тысячы рублёў. А вось цану на адпачынак на лецішчы гаспадары назваць не могуць: яна будзе дагаворная, у межах 40—60 тысяч рублёў на чалавека за суткі з харчаваннем. Цэнасная палітыка, запэўніваюць гаспадары, у разумных межах, дзе прыярытэт аддаецца суайчыннікам.

Усе харчовыя справы на сядзібе раяць гасцям абавязкова перадаць у рукі Еўдакіі Паўлаўны, якая стала сапраўднай знаўцай азіяцкай кухні. Для гатавання бешбармака, лагмана і іншых страў з мудрагелістымі назвамі гаспадыня нават вырошчвае на агародзе спецыяльныя зёлкі, а гатункі агародніны яна прывезла з Кіргізіі.

Рэцэпты Міхайлава не хавае. Напрыклад, расказала яна, дым-ляма гатуецца ў казане: яго дно засцілаецца кавалкамі нятлустай ялавічыны ці бараніны, а потым слаямі кладзецца агародніна — цыбуля, салодкі перац, капуста, баклажан, таматы. Прычым кожны слой трэба перасыпаць зелянінай і дадаваць спецыі. На маленькім агні ва ўласным соку гэты «торт» будзе тушыцца 1 гадзіну 20 хвілін. Рэкамендуецца падаваць такім чынам, кабы былі бачныя слаі.

Праўда, нават карпатлівае запісванне ўсіх складнікаў і кухарскіх прыёмаў не гарантуе смачнага выніку: на сярэдзіне рэцэпта дымлямы можна засумаваць, збіцца і нарэшце зразумець, што такія кулінарныя шэдэўры наўрад ці па сіле аматару хуткіх сненданняў і лёгкіх вячэраў. Так што на Слаўгарадчыну па азіяцкую кухню?..

Дарэчы, у будучыні прыём турыстаў на экасядзібе Еўдакіі Паўлаўна і Барыс Іванавіч мяркуюць пашырыць і зрабіць сямейным бізнэсам. Дачка, юрыст, вывучылася таксама на менеджара ў сферы турызму, а ўнучка выдатна ведае англійскую мову і імкнецца стаць перакладчыкам. Менавіта ім і давядзецца ажыццявіць мару Міхайлавых: не аддаць і не прадаць унікальнае лецішча ў Аляксандраўцы-2, а пакінуць яго ў спадчыну нашчадкам, якія стануць сапраўднымі гаспадарамі ў прыгожым кутку сваёй радзімы.

Ілона ІВАНОВА.

Слаўгарадскі раён.



І БОТЫ — «НАГРАДОЙ ЗА СМЕЛОСТЬ»

Тым, што служылі ў войску, могуць пахваліцца многія мужчыны. Не многія (у тым ліку і я!) ганарацца тым, што ў ПДВ (паветрана-дэсантных войсках)!

У пэўны час камандаваў імі легендарны Васіль Піліпавіч Маргелаў — беларус, удзельнік і герой Вялікай Айчыннай, вельмі суровы і справядлівы чалавек. Менавіта з яго лёгкай рукі ў ПВД з'явіліся блакітныя берэты, а сама назва (па-руску ВДВ) стала расшыфроўвацца як «Войска дзядзькі Васі».

Дык вось. Аднойчы паехаў гэты дзядзька ў Каўнас — інспектаваць дывізію. А заадно і адпачыць хацеў. Спецыяльна для гэтага на беразе Нёмана дачу падрыхтавалі. І ўсё ў ёй генералу, як быццам, падабалася, але ж да пары. Дзён праз пяць грыміць яго каманда строіцца. Павыскаквалі ўсе — уся дывізія — роўненька пасталі, чакаюць. З'яўляецца разгневаны Маргелаў. Крычыць:

— Офицеры, ко мне!

А паміж салдатамі ўжо шумок: рыхтуйцеся, маўляў, праз гадзіну дэсантуемся ў Шамхор (гэта пустыня такая ў Азербайджане). Месца — ворагу не пажадаеш... А галоўнае не зразумела, што ж здарылася, за што?

Камандуючы між тым падымаецца на трыбуну і ў мікрафон крычыць: ну што, маўляў, дажыліся — у каго, у камандуючага ПДВ боты скралі!.. Таму, хто гэта зрабіў, даю дзесяць хвілін — каб сазнацца...

Над пляцам павісае напружаная цішыня — хвіліна, другая... Раптам — крок... Ды смелы, чаканны: выходзіць сяржант разведроты, ідзе да трыбуны.

— Ты украл сапоги? — пытаецца ў яго спадар Маргелаў.

— Так точно, товарищ генерал армии! Я...

— Зачем?

— Дембель, товарищ генерал... Хотел в них домой заявиться...

Камандуючы (спакойна і ўжо да ўсёй дывізіі):

— Я знал, что в ВДВ служат самые смелые воины!.. Сержант, десять суток гауптвахты! Потом сразу на дембель... А сапоги... Сапоги я тебе дарю... За честность...

А яна, між іншым, не заўсёды была — нават у дэсантнікаў.

Па святах, напрыклад, яны ладзілі сапраўдныя шоу, дзе было ўсё — скачкі з парашутамі, страляніна, кіданне нажоў, прабіванне сцен...

Дык вось гэта, апошняе, рабіў статны каўказец Дзагіеў (прозвішча я змяніў. — **Аўт.**) — метры пад два ростам, з цэнтнер вагой... Прычым рабіў хораша: выходзіў, здымаў блакітны берэт, адзяваў каску, размінаўся, потым, пад барабанны дробат пачынаў разбег, адштурхоўваўся ад мосціка і... Ляцеў галавою ўперад — «прашываў» сцяну... Шквал апладысментаў!

Бо толькі адзінкі ведалі, што ў цэнтры той «сцяны» ніякай цэглы няма, ёсць пафарбаваная пад яе... фанера.

Гэта мо яшчэ доўга было б загадкай, калі б салдат Дзагіеў не стаў старасслужачым, не пачаў любаваць і здзекавацца над маладымі. Найбольш даставалася аднаму з іх — за прозвішча Іваноў...

Колькі ён там цярпеў, сказаць не бяруся, але аднойчы рашыў адпомсціць: цішком выняў са сцяны фанеру, паклаў цэглу — на цэментны раствор.

І вось наступае свята — абвяшчаюць каронны нумар! Выходзіць герой, размінаецца, разбягаецца і... не прабіўшы галавой цаглянай сцяны, спаўзае на пляц. «Хуткая « адвозіць яго ў шпіталь.

Казалі, што ачуняў ён і адразу ж стаў прасіцца ў звальненне. Яму кажуць, што ты там будзеш рабіць — такі слабы? На што ён, заікаючыся, адказваў:

— П-п-паеду в часть, у-у-уб'ю І-і-іванова.

Таго — ад грэху падалей — адправілі ў іншую вайсковую часць. А Дзагіеў, расказвалі, заікам так і застаўся.

А.І. Марцуль,
в. Рэзы, Шчучынскі раён.

МАЙСТАР-КЛАС ПА-ВЯСКОВАМУ

Некалі нас з братам бацькі штолета адвозілі да бабулі на Гомельшчыну. Вёска там вялікая, жылі ў ёй (ужо тады!) пераважна старыя. І толькі летам яна ажывала, бо амаль у кожную хату з гарадоў звозілі дзяцей. Усяго ім даставалася цягам летніх канікулаў — сушыць сена, палоць грады, карміць і пасвіць куранят, адпасваць кароў. Але самым ненавісным — асабіста для мяне — было без гарачай вады «са сценкі», чатыры разы ў дзень мыць кубкі, відэльцы, лыжкі, талеркі...

Каюся, я мазала ёдам ці зялёнкай пальцы (быццам яны параненыя), я хавала міску для мыцця і чаго толькі яшчэ ні прыдумвала, каб пазбегнуць гэтай штодзённай кары. Да таго ж аднойчы заўважыла, што бабуля (чаго раней не было) уважліва назірае, як я мыю.

Прычыну гэтага недаверу я зразумела, калі на выхадныя прыехалі бацькі, і бабуля стала расказваць ім пра суседа.

Дзед той жыў у хаце насупраць, на лета таксама прымаў унукаў, але не ўнучак. А бабка ўжо старая была і хворая: сямейства сваё пакорміць і кажа дзеду, што яна, маўляў, усяго нагатавала, а ён — хай хоць посуд памые, бо хлопцы малыя яшчэ.

Дзеду што рабіць заставалася — згаджаўся: моўчкі, у міску, збіраў усё са стала, ішоў на задні двор, потым вяртаўся. І з чысцюткім посудам! Бабка нарадавацца на яго не магла. Пакуль аднойчы ёй не собіла пайсці следам за дзедам і ўбачыць, як жа ён мые... Ноу-хау заключалася ў тым, што місу з посудам дзед выносіў на двор, выбіраў адтуль усе талеркі і па чарзе ставіў іх... перад сабакам. Той у міг вока чысценька «вымываў»-вылізваў іх, так што старому заставалася толькі спаласнуць — са шланга. «Вось так: і сам не пялешчышся, і сабака сыты», — раіў потым дзед вяскоўцам.

Але яны не спяшаліся пераняць гэты досвед, бо добра бачылі, як яго жонка, з палкай (і адкуль толькі сілы ўзяліся?) бегала за ім па вёсцы. І такі ж дагнала.

Таццяна Хахлова, *г. Гомель.*

НІ ЗА ЯКІЯ ГРОШЫ

Вясна, а за ёй і лета на дварэ; усе дзяўчаты-жанкі параспраналіся, як ні зірну — маладыя, прыгожыя, а мяне — ну хоць у качарэжнік... Думаю, трэба з гэтым нешта рабіць. Паклала ў кашалёк пенсію і ранічкай паехала ў горад, у «Салон маладосці». Парог пераступіла, чую:

— Бабка, а чего вы хотели?

Пытае пра гэта нейкая дзеўка.

— Ды, — кажу, — папрыгажэць... Памаладзець... Гадоў на 25.

— О-о, это можно, — абяцае яна, — если денежки есть?

— Ёсць, — кажу, — не хвалюйся. Я ўсю пенсію ўзяла.

То пасадзіла яна мяне ў крэсла і давай шчыраваць: твар і валасы па чарзе нечым пахкім мазала-мыла-сушыла, нажніцамі ляпала, апараты нейкія ўключала. Сэрцайка маё дрыжала ад страху акурат як хвост у галоднага сабакі. Дачакацца не магла, каб хутчэй адпусцілі... І жывой.

А ў люстэрка не глядзелася. З прынцыпу — дурню ж палову работ не паказваюць. Вось і я рашыла — разлічуся за ўсё, а потым і пагляджу.

Сонца на захад пайшло... Ну і я нарэшце — да касы, грошы аддаваць.

Зазірнула і ў люстэрка —
Ледзь сябе пазнала:
Усе грошы аддала, —
Маладой не стала.

...Загадка такая ёсць: чаго ні за якія грошы не купіш і не прадасі? Маладосць... І старасць. Хто б сумняваўся, а я не буду.

Л.Ф., *Стаўбцоўскі раён.*

ЧАГО НЕ ЗРОБІШ ДЛЯ ЖОНКІ...

Мой брат — вялікі «прыкаліст». Пра гэта даўно і добра ведаюць нашы бацькі, нашы бабулі з дзядулямі, нашы суседзі і сябры, адналасснікі, настаўнікі ў школе...

Пра гэта, ну безумоўна ж, магла здагадвацца яго жонка, але на першым годзе сумеснага жыцця яшчэ толкам не ведала. А выпалі яны, іх першыя гады, на часы страшэннага дэфіцыту: на блаце альбо адстаяўшы ў даўжэзных чэргах тады куплялася ўсё — мэбля, складаная бытавая тэхніка, адзенне, абутак, каўбаса... Ды што там, нават туалетная папера.

Зрэшты, быў яшчэ адзін «канал» — нейкі дэфіцыт можна было замовіць у людзей, якія хоць зрэдчас ды выязджалі «за кардон». У братавай жонкі — ездзіла туды сяброўка, Люся...

І вось у чарговы раз яна збіраецца — ехаць, грошай на нешта істотнае ў браціхі няма — таму замаўляецца штось па драбязе з касметыкі ды калготы. І сяброўка прывозіць...

Што далей было, мне расказваў брат.

Значыць, забраў ён у Люсі тыя абновы, прынёс дамоў. Паглядзець закарцела. Распакаваў, асцярожна адклеіў пакецік з калготамі, выцягнуў, патрымаў у руках, ды такія ж пяшчотныя, пашкадаваў, што жонкі дома няма (у другую змену працуе) — яна б памерала...

А потым, казаў, быццам чэрці панеслі: у шафе, у «хламоўніку» знайшоў жончыны старыя парваныя калготы, акуратненька (як тыя новыя) злажыў, праз вільготную марлю папрасаваў, накруціў на кардонку, спакаваў у... фірмовы пакет і заклеіў. Ды так, што камар носа не падточыць!

З'явілася жонка. Узрадавалася... Калготы тут жа рашыла памераць. Распранулася, села на канапу, толькі ўсунула ступню ў мяккі пяшчотны насок і на табе — дзірка... Ад костачкі!.. І «стрэлка» за ёй. У палец...

Усмешку з твару жанчыны як вецер садзьмуў, слёзы набеглі, твар выцягнуўся ў запытальнае «як жа так»?

— Гэта ж не я парвала? Не я... Ты бачыў... Гэтак... было? — пытаецца яна ў мужа. — Гандляры падманулі — усунулі Люсьцы нейкі брак... Ці гэта яна... падманвае нас?..

Ад неразумення, ад крыўды браціха заплакала, брат, як мог, суцяшаў. Казаў, прынамсі, што любіць яе, што дастане ёй усё: ну калі не зорку з неба, то хоць новыя, шыкоўныя калготы. Прычым — вось зараз жа (хай ноч-апоўнач!) пойдзе і прынясе іх.

Ён сапраўды пайшоў... І сапраўды прынёс... Хоць без упакоўкі. Жонка памерала — якраз. І вельмі прыгожа! Таму заснула яна цалкам шчаслівай, на мужавым плячы. А раніцай ён усё расказаў...

Далей нічога смешнага ўжо не было. Аж да новых прыколаў.

А. Волкава, *г. Маладзечна.*

Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР.

Не страляйце ў шэрую гусь

Да адкрыцця летне-асенняга паляванне на водна-балотных птушак у Беларусі грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) звяртаецца да беларускіх паляўнічых з просьбай не страляць шэрых гусей. Пакольку ўсе гусі вельмі падобныя паміж сабой, АПБ падрыхтавала мініінструкцыю гусей у выглядзе паштоўкі.

Шэрая гусь з'яўляецца адзіным з чатырох відаў гусей, якія гняздуюцца на тэрыторыі нашай краіны. У пачатку мінулага стагоддзя гэты від знік у нас і зноў з'явіўся на гнездаванні толькі ў 1970 гадах. У якасці рэдкага віду шэрая гусь была ўнесена ў апошняе выданне Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь у 2004 годзе. Аднак ужо праз год яе выключылі з Чырвонай кнігі і ўнеслі ў спіс паляўнічых відаў. Гэта неяк своеасаблівы парадокс у справе аховы прыроды ў нашай краіне, лічаць спецыялісты АПБ. Насамрэч колькасць шэрых гусей, што гняздуюцца ў Беларусі, яшчэ вельмі малая для таго, каб лічыць беларускую папуляцыю гэтых птушак упэўнена стабільнай. Між іншым, паляванне на шэрую гусь адкрыта.

На паштоўцы — якасныя малюнкі ўсіх 4 відаў гусей, якія сустракаюцца на тэрыторыі нашай краіны.

Паштоўка дазваляе навучыцца вызначаць гусь-піскульку — глабальна знікаючы від, які занесены ў Міжнародную Чырвоную кнігу і Чырвоную кнігу нашай краіны. Гусь-піскулька гняздуецца ў тундры і мігруе праз тэрыторыю Беларусі ў змешаных чародах разам з іншымі гусямі.

Любы паляўнічы, які хоча навучыцца вызначаць гусей, можа атрымаць гэтую паштоўку. Для гэтага трэба звярнуцца ў сакратарыят АПБ (8017 263 01 30) або паведаміць свой паштовы адрас па электронай пошце info@ptushki.org. Акрамя гэтага, паштоўка будзе выслана ва ўсе інспекцыі па ахове жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Беларусі і Мінпрыроды.

Нагадаю, што спыненне веснавога паляванне падтрыманае шырокай грамадскасцю, а звыш 20 тысяч чалавек пакінулі свае подпісы пад зваротам аб гэтым, які быў накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У рамках літаратурнага конкурсу АПБ спецыяльна для паляўнічых быў створаны ліст-зварот шэрай гусі да людзей планеты:

Просьба

Я — простой серый гусь,
Житель синих озер.
В поднебесье я мчусь
Простирая вдаль взор.
И молю я людей:
Не стреляйте в меня,
Ведь от ваших потех
Гибнет наша родня.
Что увидят они,
Дети ваших детей?
Если нас истребите
Для забавы своей.
Может кто-то из вас
Вдруг услышит меня
И, прицелясь, в тот час,
Дрогнет ваша рука.

Аляксандр Ефіменка, 12 гадоў, г. Клімавічы Магілёўская вобласць.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРК

У эканоміцы Беларусі ў ліпені намецілася стабілізацыя

У эканоміцы Беларусі ў ліпені намецілася стабілізацыя. Аб гэтым Прэзідэнту краіны Аляксандру Лукашэнку далажыў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

Як было даложана Прэзідэнту, усе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі за сем месяцаў у цэлым выкананы.

Курс беларускага рубля да кошыка валют на працягу месяца практычна не змяняўся. Нацбанк вёў актыўную работу па крэдытаванні рэальнага сектара эканомікі, дзяржаўных праграм, стабільна працавала плацежная сістэма. У 1,6 раза ў параўнанні з чэрвенем скараціласа адмоўнае сальда куплі валюты Нацбанкам. Паводле папярэдніх звестак, удалося дабіцца зніжэння складскіх запасаў на прадпрыемствах.

Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на неабходнасці аказання падтрымкі рэальнаму сектару эканомікі, у прыватнасці тым, хто пастаўляе прадукцыю на экспарт і ўнутраны рынак. Кіраўнік Нацбанка адзначыў, што ў найбліжэйшы час будуць уважліва вывучаны ўсе магчымасці для ўзмацнення крэдытавання банкамі рэальнага сектара эканомікі.

Кіраўнік дзяржавы таксама спыніўся на пытаннях, звязаных з правядзеннем сельскагаспадарчых работ. Ён запатрабаваў, каб з боку банкаўскай сістэмы былі вырашаны ўсе праблемы фінансавання, каб у працаўнікоў вёскі не ўзнікла складанасцяў з нарыхтоўкай і здачай збожжа, ільну і іншай прадукцыі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абмен старых «чарнобыльскіх» пасведчанняў на новыя будзе праводзіцца ў Беларусі з 1 студзеня па 31 снежня 2012 года

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 жніўня падпісаў Указ № 407 «Аб некаторых пытаннях абмену дакументаў, што пацвярджаюць права грамадзян на льготы».

Указам устаноўлена, што абмен пасведчанняў удзельнікаў ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, выдадзеных да ўступлення ў сілу Закона ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» (да 16 ліпеня 2009 года), на пасведчанні пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый новага ўзору будзе праводзіцца ў перыяд з 1 студзеня па 31 снежня 2012 года.

Згодна з указам да завяршэння абмену дакументаў «чарнобыльскія» льготы грамадзянам будуць прадастаўляцца на падставе пасведчанняў старога ўзору (выдадзеных у адпаведнасці з Законам ад 22 лютага 1991 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС»).

Грамадзянам, у якіх права на льготы, устаноўленыя Законам ад 6 студзеня 2009 года «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый», узнікла пасля ўступлення яго ў сілу, будуць выдавацца пасведчанні старога ўзору ў перыяд з 16 ліпеня 2009 па 31 снежня 2011 года з называнням артыкулаў гэтага закона, на падставе якіх прадастаўляюцца льготы. Указ уступае ў сілу з 16 ліпеня 2009 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўных узнагародаў Беларусі ўдастоены 33 чалавекі

Дзяржаўных узнагародаў за шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, узорнае выкананне службовых абавязкаў, мужнасць і храбрасць, праяўленыя пры затрыманні злачынцаў, заслугі ў галіне аховы здароўя, культуры, мастацтва, адукацыі і спорту ўдастоены 33 грамадзяніны Беларусі. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 жніўня.

Медалём «За адзнаку ў воінскай службе» ўзнагароджаны начальнік упраўлення сувязі і інфармацыйных тэхналогій Дзяржаўнага пагранічнага камітэта палкоўнік Уладзімір Жук. Медаля «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» ўдастоены намеснік камандзіра па тыле батальёна забеспячэння вучэбнага працэсу цэнтра забеспячэння вучэбнага працэсу Ваеннай акадэміі капітан Дзмітрый Лабажэвіч.

За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы ўзнагароджаны медалём пяцёра пагранічнікаў, у тым ліку маёр Уладзіслаў Бруеў і капітан Іван Кіслякоў. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены 11 грамадзян. У іх ліку — галоўурач Мінскага кансультацыйна-дыягнастычнага цэнтра Анатоль Талкачоў, старшыня Нясвіжскага райвыканкама Ігар Макар, загадчык кафедры эпідэміялогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Рыгор Чысценка. Сямёра чалавек узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, у тым ліку дэкан вакальна-харавога факультэта Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Валерый Аўраменка, галоўны рэжысёр канцэртных залаў Белдзяржфілармоніі Ніна Осіпава і іншыя.

Акрамя таго, шэрагу грамадзян прысвоены ганаровыя званні заслужанага ўрача, заслужанага будаўніка і заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЎТОБУСЫ НА МАСКВУ — ШТОДНЯ

Адкрыты штодзённы рух аўтобусаў па міжнародным маршруце «Мінск — Масква (АС «Цёплы стан») — Мінск», паведамілі ў КУП «Мінсктранс».

Адпраўленне аўтобусаў з Мінска: з аўтавакзала «Усходні» ў 19.10, з дыспетчарскай станцыі «Дружная» у 19.30, з аўтавакзала «Маскоўскі» ў 20.00. Кошт праезду — 60 000 беларускіх рублёў. Прыбыццё ў Маскву ў 8.30. Адпраўленне з Масквы штодзённа ў 21.00. Кошт праезду — 700 расійскіх рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ШЭРЫЯ» БАНКЕТЫ Ў «ЕЎРОПЕ»

Як паведамілі ў прэс-цэнтры МУС, гэта гісторыя пачалася ў верасні 2008 года, калі ў галоўнае ўпраўленне па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі паступіла аператыўная інфармацыя аб тым, што ў рэстаране першай у Беларусі пяцізоркавай гасцініцы «Еўропа» праводзяцца левыя банкеты. У рэстаране сапраўды праводзіліся банкеты, якія не адлюстроўваліся ў бухгалтарскай справаздачнасці. У ролі арганізатара і кіраўніка гэтых супрацьпраўных дзеянняў выступала былы намеснік дырэктара па харчаванні. З гэтай мэтай яна адшукала магчымага выканаўцу злачынстваў — бухгалтара і схіліла яе да ўдзелу ў іх. Падазроныя ўчынілі крадзеж у буйным памеры на агульную суму 20,8 мільёна рублёў, а таксама службовы падлог на суму 447,2 мільёна рублёў.

Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».

Інфарм-укол

ПАДРЫХТОЎКА ДА НАГРУЗАК

Для большасці людзей карысць, якую яны атрымліваюць ад фізічных нагрузак, намнога перавышае магчымую рызыку. Аднак калі ў вас ёсць хранічныя захворванні або выражаныя і істотныя фактары рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў, трэба прыняць некаторыя меры засцярогі. Пагаварыце са сваім урачом, калі:

- Вы пакутуеце ад захворванняў сэрца ці нырак і калі ў вас цукровы дыябет ці артрыт.
- Вам больш за 40 гадоў.
- Вы пакутуеце ад атлусцення.
- У вас ёсць сваякі або браты ці сёстры, у якіх ішэмічная хвароба сэрца ўзнікла ва ўзросце да 55 гадоў.
- Вы не ўпэўнены ў добрым стане свайго здароўя.

Магчыма, урач парэкамендуе правесці пробу з фізічнай нагрузкай, каб вызначыць, ці не з'явіцца фізічная нагрузка прычынай недастатковага паступлення кіслароду да сардэчнай мышцы, ці не справакуе яна парушэння сардэчнага рытму. Абмяркуйце з урачом усе абмежаванні фізічных нагрузак, якіх ён параіць вам прытрымлівацца згодна з вашым здароўем. Калі да гэтага вы вялі сядзячы лад жыцця, то пачынайце з працягласці заняткаў па 5-10 хвілін і паступова даводзьце ўзровень нагрузак да пажаданага ўзроўню. Урач можа параіць, да якой частаты вам трэба даводзіць пульс падчас выканання практыкаванняў, каб давесці іх да канца. Дасягненне такой мэтавай частаты пульсу дазволіць вам атрымаць максімум карысці ад фізічных практыкаванняў.

ІНФАРКТ МІЯКАРДА: МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ

Жанчыны часта думаюць, што іх не датычыцца клопат аб магчымых сардэчна-сасудзістых расстройствах. Сапраўды, мужчыны пачынаюць хварэць на ішэмічную хваробу і іншыя сардэчныя захворванні ў больш маладым узросце. Аднак далей шанцы мужчын і жанчын памерці ад інфаркту міякарда выроўніваюцца.

Да палавога выспявання хлопчыкі і дзяўчаткі маюць прыкладна аднолькавы ўзровень халестэрыну ліпапратэінаў высокай шчыльнасці — «добрага» халестэрыну, і ніякі ўзровень халестэрыну ліпапратэінаў нізкай шчыльнасці — «дрэннага» халестэрыну. Гэта служыць натуральнай абаронай дзяцей і падлеткаў ад развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. Аднак падчас палавога выспявання ўзровень «добрага» халестэрыну ў мужчын зніжаецца, і яны становяцца больш уразлівымі да гэтых захворванняў. У жанчын высокі ўзровень утрымання эстрагенаў у крыві падтрымлівае высокую канцэнтрацыю «добрага» халестэрыну і малую — «дрэннага». Пасля менапаўзы, калі ўзровень эстрагенаў у крыві жанчын зніжаецца, яны становяцца падвержанымі інфаркту міякарда. Да 60 гадоў мужчыны — першыя кандыдаты на інфаркт міякарда. Пасля 60 розніца ў гэтых суадносінах паміж мужчынамі і жанчынамі пачынае згладжвацца.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

СТАЛІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Улады горада імкнуцца рабіць ўсё магчымае, каб крызіс не адбіваўся на будаўніцтве бюджэтных аб'ектаў. Сёння ў сталіцы іх будуецца і праектуецца 815. Новыя жылыя забудовы не застануцца без сацыяльнай інфраструктуры, паркаў і скверaў.

Але зараз, па словах Андрэя Ясючэні, назіраецца некаторы спад у будаўніцтве аб'ектаў камерцыйнага кірунку, бо некаторыя інвестары маюць праблемы з фінансаваннем. Аб'екты ўзводзяцца больш марудна, чым планавалася...

Наша сталіца будзе разрастацца і паступова паглынаць тэрыторыі, якія раней належалі Мінскай вобласці. Ужо ў 2011, 2012 гадах Мінск выберацца за кальцавую дарогу, на новых тэрыторыях пачнуць узнікаць дамы шматпавярховыя, сярэднепавярховыя і катэджныя забудовы. Акрамя такіх аб'ектаў у Шчомысліцы, Тарасаве, Дзегцяроўцы, жылыя кварталы з'явяцца ў Ельніцы, Новым Двары. За кальцавой дарогай праектуецца ўзводзіць не толькі жыллё, прапрацоўваецца ўзвядзенне будынкаў грамадскага харчавання (рэстаранаў і кавярняў), гіпер- і супермаркетаў, аўтазаправачных станцый, каб больш эфектыўна выкарыстоўваць добрую пад'язную базу.

Мяняем аблічча

Горад будзе расці ў шырыню, але і яго ўнутранае асяроддзе пераўвасабляецца.

У будучыні зменіцца аблічча некаторых раёнаў. Так, элітная забудова з'явіцца ў межах вуліц Янкі Купалы і Максіма Багдановіча: будынкі 2-й клінічнай бальніцы і «Бел-Экспа» плануецца знесці, а замест старых забудоў узнікнуць гасцініца, аб'екты гандлю і жыллё самай высокай якасці. Зразумела, будзе рэканструявацца і ўзбярэжжа ракі Свіслач. Як сказаў Андрэй Ясючэня, сёння прапрацоўка гэтага праекта знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

Так, 2-я клінічная падлягае вынасу, але бальніц у горадзе менш не стане — праектуецца вялікі бальнічны комплекс ў пасёлку Навінкі. А цяпер ужо будуецца бальніца па вуліцы Першамайскай.

Праз некаторы час можна будзе не пазнаць і ваенныя гарадкі. Напрыклад, у Масюкоўшчыне вайскоўцаў чакае перасяленне, для іх будуюцца новыя «апартаменты». А замест ваеннага гарадка з'явіцца жылы раён з усімі неабходнымі сацыяльнымі, гандлёвымі і іншымі аб'ектамі.

У сталіцы паболее гасцініц. Адну з іх плануецца ўзвесці недалёка ад Палаца Рэспублікі і музея Вялікай Айчыннай вайны. Падшукваецца месца яшчэ для аднаго гатэля ў рэёне плошчы Перамогі. Праз некаторы час для турыстаў пабудуецца жыллё і побач з Мінск-Арэнай. Распрацоўваецца праект рэканструкцыі гасцініцы «Беларусь», яна набудзе больш сучасны фасад і ўнутранае начынне, разглядаецца пытанне аб магчымым будаўніцтве побач з ёй яшчэ аднаго гасцінічнага будынка.

Рэканструкцыя і рамонт будынкаў чакаюць Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм».

Забурліць новае жыццё вакол Нацыянальнай бібліятэкі: поле, што знаходзіцца цяпер за цыркам шапіто, будзе забудавана. Там з'явіцца адміністрацыйна-дзелавы комплекс і жылы раён «Усходні маяк Мінска».

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ГРЫП А (H1N1) АСАБЛІВА НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ З АТЛУСЦЕННЕМ

Згодна са звесткамі Еўрапейскага цэнтра кантролю за захворваннямі, колькасць захварэлых на грып А (H1N1) перавысіла ў свеце ўжо 188 тысяч чалавек і 1265 чалавек загінулі ад гэтай хваробы. У Еўрапейскім рэгіёне выпадкі захворвання зарэгістраваны ў 47 краінах. На тэрыторыі Еўрасаюза пацверджана 27 337 выпадкаў захворвання, 40 з іх завяршыліся лятальным канцом (30 — у Вялікабрытаніі, 7 — у Іспаніі, па адным — у Венгрыі, Бельгіі і Францыі). «Засвяціўся» новы высокапатагенны грып таксама і ва ўсіх краінах, з якімі мяжуе Беларусь. У Латвіі пацверджана 19 выпадкаў грыпу A(H1N1), у Літве — 22 выпадкі, Эстоніі — 42, Польшчы — 93 і адзін — ва Украіне.

Расійская Федэральная служба па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека пацвярджае 55 выпадкаў інфіцыравання расійскіх грамадзян грыпам А (H1N1): хворыя ёсць не толькі ў Маскве і Маскоўскай вобласці, але і ў Пярмі, Екацерынбургу, Новасібірску, Южна-Сахалінску, Томскай, Чалябінскай і Ніжагародскай абласцях. Усе зарэгістраваныя выпадкі каліфарнійскага грыпу — завазныя, а ўнутры краіны фактаў перадачы інфекцыі пакуль вызначана не было. Аднак маскоўскія ўлады загадзя страхуюцца: так, у прыватнасці, з-за пагрозы распаўсюджвання грыпу А (H1N1) кіраўнік маскоўскага ўпраўлення Расспажыўнагляду Мікалай Філатаў прапанаваў прэфектам адміністрацыйных акруг расійскай сталіцы абмежаваць правядзенне масавых мерапрыемстваў у закрытых памяшканнях і рэкамендаваў маскоўскім уладам выдзеліць дадатковыя сродкі на закупку лекавых прэпаратаў для прафілактыкі і лячэння хворых на каліфарнійскі грып. Яшчэ раней Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Расіі Генадзь Анішчанка заклікаў балельшчыкаў не ехаць на футбольны матч паміж зборнымі камандамі Уэльса і Расіі і забараніў выезд у Вялікабрытанію арганізаваных дзіцячых груп.

Дарэчы, спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя канстатуюць, што ў большасці краін (ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, Японіі) пераважная колькасць выпадкаў захворвання на пандэмічны грып паранейшаму рэгіструюцца сярод маладых асобаў, сярэдні ўзрост якіх складае ад 12 да 17 гадоў. Аднак па меры далейшага распаўсюджвання пандэмічнага віруса сярод насельніцтва сярэдні ўзрост захварэлых пачынае ўзрастаць. Магчыма, гэты звязана з тым, што самыя ранніе выпадкі інфіцыравання адбываліся ў дзіцячых калектывах, а затым вірус распаўсюджваўся і на іншыя катэгорыі насельніцтва. Да фактараў рызыкі цяжкага працякання грыпу А (H1N1) эксперты адносяць сардэчна-сасудзістыя, рэспіраторныя, анкалагічныя захворванні, дыябет і астму. Нядаўна была атрымана інфармацыя, якая дае падставы меркаваць, што яшчэ адным фактарам рызыкі цяжкага працякання хваробы можа быць атлусценне. Цяжарнасць таксама з'яўляецца сур'ёзным фактарам рызыкі. Аднак поўная эпідэміялагічная карціна распаўсюджвання пандэміі яшчэ не зусім зразумелая, паколькі ў многіх краінах цыркулююць паралельна вірусы як сезоннага, так і пандэмічнага грыпу, а пандэмія знаходзіцца яшчэ на адносна ранняй стадыі свайго развіцця.

Дзіўным чынам Беларусь працягвае заставацца астраўком, куды грып А (H1N1) пакуль не трапіў. Але расслабляцца санэпідслужба не збіраецца. За здароўем пасажыраў, якія прыбываюць у нашу краіну авіятранспартам з небяспечных у эпідэмічным плане краін, наладжаны пастаянны маніторынг. Толькі за адзін дзень 3 жніўня ім былі ахоплены 28 рэйсаў, у тым ліку транзітныя і чартарныя рэйсы ЗША, Канады, Англіі, Італіі, Аўстрыі, Германіі, Турцыі, Расіі, Польшчы, Чэхіі, Латвіі, Ізраіля, Кітая, Казахстана, Францыі, Балгарыі, Эстоніі і Фінляндыі: 1781 пасажыр і 150 членаў экіпажа. Напрыканцы мінулага тыдня санэпідслужбай быў выяўлены пасажыр з тэмпературай і прастуднымі сімптомамі, які прыляцеў з Пізы (Італія) у аэрапорт Гомеля. На шчасце, апасенні медыкаў не пацвердзіліся. Канчатковы дыягназ, які быў яму пастаўлены — «вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя, фарынгіт».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Самы дарагі жыллёвы «квадрат» — за 3550 USD

Паводле інфармацыі сектара аналізу і маніторынгу рынку нерухомасці Нацыянальнага кадастравага агенцтва, у чэрвені была зафіксавана самая дарагая здзелка ў Мінску за апошнія некалькі месяцаў.

Тады трохпакаёвая кватэра па вуліцы Старынаўскай была прададзена на другасным рынку жылля прыкладна за 310 тысяч долараў. Кошт квадратнага метра такой трохпакаёўкі склаў 3550 долараў, што лічыцца своеасаблівым рэкордам.

А вось самымі таннымі невялікімі кватэрамі ў Мінску лічацца аднапакаёвыя «хрушчоўкі». Паводле інфармацыі **старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА,** за апошнія некалькі месяцаў было прададзена некалькі такіх кватэр на кошце 37—38 тысяч долараў. Самы танны жыллёвы «квадрат» існуе сёння на другасным рынку сталіцы ў сегменце не вельмі якасных двух- і трохпакаёвых кватэр. Квадратны метр такога жылля набываецца па кошце 1040—1100 долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Мытны кантроль вывазу тавараў фізічнымі асобамі ў Беларусі спрошчаны

Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Барысюк, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Гэта датычыцца ўліку кошту і колькасці тавару, адзначыў прадстаўнік ДМК. Ён растлумачыў, што калі раней былі пэўныя абмежаванні на вываз айчынных тавараў фізічнымі асобамі, напрыклад, чалавек хацеў вывезці машыну будаўнічага матэрыялу (цэглы), то цяпер ствараць перашкоды тут ніхто не будзе. Адзіная ўмова: партыя тавару павінна суправаджацца таварным чэкам і іншымі дакументамі, якія пацвярджаюць легальнасць набыцця тавару на тэрыторыі Беларусі.

АЎТОБУС У... ХАЦЕ

У Лепелі (Віцебская вобласць) аўтобус, які перавозіў працаўнікоў мясцовага малочна-кансервавага камбіната, урэзаўся ў жылую хату. Супрацоўнікі МНС эвакуявалі з месца аварыі кіроўцу і 12 пасажыраў, 1 чалавек быў шпіталізаваны.

Ул. інф.

ДАЎЖНІКІ — ПА КОЛЕРЫ

Мінчане, якія маюць запазычанасць па аплаце за кватэру, сталі атрымліваць каляровыя жыроўкі. Тым, хто мае запазычанасць ад аднаго да трох месяцаў, адрасаваныя рахункі-квітанцыі зялёнага колеру, звыш трох месяцаў — чырвонага.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Абзац

Група японскіх навукоўцаў з Такійскага ўніверсітэта змагла вырасціць у мышы паўнавартасны зуб на месцы выдаленага. Даследчыкі ўзялі клеткі зародка зуба мышаняці, вырасцілі іх у калагенавай сумесі і перасадзілі дарослай мышы на месца вырванага разца. Праз 37 дзён зуб прабіўся праз дзясну, а яшчэ праз 50 дасягнуў сваёй звычайнай велічыні. Вучоныя выявілі ў ім нерв і крывяносныя сасуды. Поспех эксперымента адчыняе новыя магчымасці ў галіне рэпрадукцыйнай медыцыны, так як тэхналогія можа быць прыменена і да чалавека. Па ацэнцы экспертаў, практычнае выкарыстанне тэхналогіі стане магчымым не раней чым праз 5 гадоў.

Кембрыджскі ўніверсітэт прысвоіў навуковую ступень дворніку з 30-гадовым стажам. Справа ў тым, што ў вольны ад асноўнай працы час 52-гадовы Алан Брыгхам праводзіць экскурсіі для турыстаў. Ён расказвае ім пра гісторыю і архітэктуру горада, дзе знаходзіцца адзін з самых славутых універсітэтаў свету. Кіраўніцтва навучальнай установы вырашыла не пакідаць без увагі асветніцкую дзейнасць дворніка. Параіўшыся, вучоны савет прысвоіў яму ганаровае званне.

Поўны абзац

Шакалад па кошце золата будуць прадаваць у брытанскіх крамах. На продаж будуць выстаўлены шакаладныя батончыкі Wispa Gold. Батончык пакрыты тонкім слоем харчовага золата і загорнуты ў залатую абгортку. Яго кошт — 961,48 фунта стэрлінгаў — роўны кошту залатога злітка той жа вагі. Гэта самы дарагі шакалад, які калі-небудзь паступаў у продаж. Невялікая колькасць такіх батончыкаў будзе дастаўлена пад узмоцненай аховай у лонданскія супермаркеты. На працягу тыдня шакалад будзе выстаўлены ў ювелірных аддзелах крамаў. Усе выручаныя ад іх продажу грошы пойдуць у фонд дапамогі хворым на сіндром Лоу — рэдкага генетычнага захворвання.

У Калінінградскай вобласці на дарозе адбыўся незвычайны інцыдэнт. Інспектар бяспекі дарожнага руху пацярпеў ад дзеянняў 32-гадовай жанчыны, якую спыніў для праверкі дакументаў. Жанчына-вадзіцель была п'яная. Інспектар запатрабаваў, каб яна выйшла з машыны, аднак у адказ жанчына моцна ўкусіла яго за руку. Пасля таго, як міліцыянер паспрабаваў дастаць жанчыну з салона, яна ўдарыла яго нагой у твар. Цяпер давядзецца адказваць і за напад на інспектара, і за кіраванне ў п'яным стане аўтамабілем.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

МІНЧАНКА ЗНАЙШЛА КОБРУ Ў КВАТЭРЫ

Каралеўскую кобру злавілі сталічныя выратавальнікі ў кватэры дома № 17 у другім завулку Багратыёна.

Як паведаміў **прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Аляксандр ЛАПАНІК,** выратавальнікаў выклікала сястра гаспадыні кватэры, якая прыехала з дачы і знайшла на падваконні змяю. Рэптылія была каля 1,5 метра даўжынёй. Выратавальнікі змясцілі кобру ў скрыню і адвезлі ў заапарк. Надзвычайнае здарэнне адбылося ў кватэры на сёмым паверсе, з чаго можна зрабіць выснову, што змяя ўцякла з чыйгосьці хатняга тэрарыуму.

Уладзімір ЖДАНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 809,00
▲ 1 еўра	4 040,75
1 латвійскі лат	5 759,69
1 літоўскі літ	1 171,00
1 чэшская крона	156,09
1 польскі злоты	985,37
▼ 1 расійскі рубель	90,23
1 украінская грыўня	356,47

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	31,1326
UAH	39,3585
1000 BYR	11,0911
EUR	44,7780

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Дзержинский райагросервис», КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже 2-этажного кирпичного административно-хозяйственного здания, об. пл. 393,9 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 4. Начальная цена с НДС – 440 216 700 бел. руб. Площадь земельного участка 0,0808 га. Объект продается без условий. Задаток в сумме 25 000 000 белорусских рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Возможна корректировка сроков оплаты по соглашению сторон до подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Объект обременен договорами аренды. Аукцион состоится **09.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

Извещение о проведении аукциона

По поручению СПК «Агрофирма «Лучники» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимости в составе: **Лот № 1:** здание клуба, об.пл. 210,4 кв.м, Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Подлипцы. Начальная цена с НДС — 30 200 000 бел. руб. Пл. зем. уч. 0,1279 га. **Лот № 2:** здание электроцеха, об.пл. 228,6 кв.м; здания гаражей электроцеха, об.пл. 74,1 кв.м; 71,9 кв.м, Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Серяги. Начальная цена с НДС — 25 000 000 бел. руб. Пл. зем. уч. — 0,4035 га. **Лот № 3:** здание коровника, об.пл. 1 404,4 кв.м, Слуцкий район, Серяжский с/с, д. Павловка. Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) — 50 466 315 бел. руб. Пл. зем. уч. 0,8642 га. Объекты продаются без условий. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты подписания договора купли-продажи. Возможна корректировка сроков оплаты по соглашению сторон до подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **08.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША БУДУЦЬ УСЯЛЯК СУПРАЦЬДЗЕЙНІЧАЦЬ ШЫРОКАМУ МІЖНАРОДНАМУ ПРЫЗНАННЮ АБХАЗІІ І ПА

Пра гэта заявіў намеснік міністра абароны па пытаннях міжнароднай бяспекі Аляксандр Вершбоу.

Ён выступіў у сенацкім камітэце па замежных справах Кангрэса ЗША, дзе адбыліся слуханні на тэму: «Грузія — год пасля жнівеньскай вайны».

Хоць Абхазія і Паўднёвая Асецыя і атрымалі прызнанне з боку Расіі і Нікарагуа, адзначыў Вершбоу, «гэтыя сепаратысцкія рэгіёны сталі яшчэ больш ізаляванымі». ЗША «ніколі не прызнаюць Абхазію і Паўднёвую Асецыю ў якасці суверэнных дзяржаў» і «працягнуць працаваць са сваімі міжнароднымі партнёрамі з мэтай супрацьдзеяння шырэйшаму прызнанню гэтых сепаратысцкіх рэжымаў», падкрэсліў намеснік міністра.

Вершбоу зноў паўтарыў выказаныя раней адміністрацыяй Абамы словы шкадавання з нагоды спынення місій назіральнікаў АБСЕ і ААН, усклаўшы адказнасць за гэта на Расію.

ПАДЛОДКІ РФ ПАТРУЛЮЮЦЬ УЗБЯРЭЖЖА ШТАТАЎ

Расійскія падводныя лодкі ніколі не спынялі несці баявую службу і патруляваць воды Сусветнага акіяна. Так высокапастаўлены прадстаўнік галоўнага штаба ВМФ РФ пракаментаваў інфармацыю аб набліжэнні да заходняга ўзбярэжжа ЗША двух атамных субмарын РФ.

Нагадаем, учора ў СМІ ЗША са спасылкай на крыніцы ў Пентагоне і разведцы апублікавалі інфармацыю аб тым, што адна атамная субмарына РФ падышла да амерыканскага ўзбярэжжа на адлегласць прыкладна 200 міль. Месцазнаходжанне другой падлодкі невядома, па адных звестках, яна набліжалася да Кубы, па іншых, рухалася ў паўночным кірунку.

Паведамлялася, што з часоў заканчэння халоднай вайны расійскія лодкі не падыходзілі так блізка да берагоў Злучаных Штатаў.

ЕЎРАПЕЙЦЫ СТАЛІ МЕНШ НАРАДЖАЦЬ

У Германіі нараджаецца дзяцей менш, чым у любой іншай краіне ЕС: на 1000 чалавек у 2008 годзе прыйшлося ў сярэднім 8,2 нованароджанага, паведамляе DW-WORLD.

Больш за тое, Германія стала адзінай дзяржавай ЕС, дзе за апошні год было зафіксавана падзенне ўзроўню нараджальнасці. Паводле звестак Eurostat, у 2008 годзе ў ФРГ на 675 тысяч выпадкаў нараджэння прыйшлося 844 тысячы смерцяў.

Самыя лепшыя паказчыкі ў Ірландыі: там на 1000 жыхароў у сярэднім прыходзіцца 16,9 нованароджанага, затым ідуць Францыя (13/1000) і Вялікабрытанія (12,9/1000).

У канцы ліпеня Федэральная служба статыстыкі ФРГ апублікавала свае звесткі, паводле якіх у кожнай пятай немкі ва ўзросце ад 40 да 44 гадоў ніколі не было дзяцей. Пры гэтым найбольшая колькасць бяздзетных жанчын прыходзіцца на заходніх немак з вышэйшай адукацыяй — 28 працэнтаў.

ЛЕПШЫМІ МУЖАМІ Ў СВЕЦЕ ПРЫЗНАНЫЯ ШВЕДЫ

Паводле вынікаў даследавання, праведзенага спецыялістамі з Оксфардскага ўніверсітэта сярод прадстаўнікоў развітых краін, лепшымі мужамі ў свеце з'яўляюцца жыхары Швецыі.

У якасці ключавога паказчыку, які лёг у аснову складзенага рэйтынгу, была прынята ступень дапамогі ў хатняй працы мужа сваёй жонцы. Сюды ўваходзіць сумеснае выхаванне дзяцей, клопат аб доме і нават жаданне, з якім муж дапамагае ў падрыхтоўцы ежы, мыцці посуду і бялізны.

Усяго ў апытанні ўзялі ўдзел каля 13 тыс. 500 мужчын і жанчын з 12 краін. Як аказалася, лепшыя мужы жывуць цяпер у Швецыі. На другое месца выйшла Нарвегія, а першую тройку замыкае Вялікабрытанія. Мужчыны з ЗША занялі чацвёртае месца ў рэйтынгу. Ніжняя тройка выглядае так: на апошнім месцы апынуліся жыхары Аўстраліі, якія вядомыя сваёй любоўю да піва, спартыўных мерапрыемстваў і вечарынак. Вышэй за яе Аўстрыя і Германія.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩЕМ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			Республиканское унитарное предприятие «Гомельский вычислительный центр» (РСУП «Гомельский вычислительный центр») Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь
Адрес			246044, г. Гомель, ул. Барыкина, 230
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Деятельность в области архитектуры, инженерные услуги; разработка программного обеспечения и консультирование в этой области
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			3 квартал 2009 г.
Предполагаемый

Пра бясплатны электрачайнік і чалавечы фактар

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Паколькі літаральна днямі на старонках газеты была закранута «халадзільная» тэма (наконт прадукцыі вядомага «Атланта»), па законе парнасці (услед за пытаннем па пэўнай тэме, як правіла, неў-забаве гучыць падобны ці аналагічны зварот ад іншых заяўнікаў) рэдакцыя атрымала па «гарачай лініі» яшчэ адно пытанне.

— На працягу ліпеня «Атлант» праводзіў цудоўную акцыю: пры набыцці пэўнай мадэлі пральнай машыны або халадзільніка пакупнік атрымліваў падарунак — электрачайнік вытворчасці таго ж вытворцы. У мінулым месяцы мы сапраўды набылі новы халадзільнік у адным з райцэнтраў Мінскай вобласці. Аднак, як высветлілася, абяцаны электрачайнік можна было атрымаць не ў месцы набыцця халадзільніка, а толькі ў сталіцы, прычым у некалькіх вызначаных крамах, у пэўныя дні і гадзіны. У краме ў райцэнтры нам патлумачылі, што ім электрачайнікі для ўручэння пакупнікам не выдаюць. Чаму? Давялося марнаваць час, выдаткоўваць грошы на паездку ў сталіцу, хоць гэта не вельмі ўваходзіла ў нашы планы, — гаварылі нам чарговыя заяўнікі. — І яшчэ, паколькі ў момант атрымання падарунка мы стаялі ў чарзе, не паспелі спытаць у прадаўцоў наконт гарантыі на атрыманы бясплатна электрачайнік.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па каментар мы звярнуліся на ЗАТ «Атлант». Вось што нам распавялі яго прадстаўнікі па вышэйагучаных пытаннях.

— Па нашых падліках, дастаўка і ўручэнне падарункаў — электрачайнікаў — пакупнікам разам з іх коштам складае каля 1 мільярда рублёў. Калі б мы паставілі мэту даставіць іх сапраўды ў кожную краму, а іх 800, гэтая лічба магла б узрасці, умоўна кажучы, да 10 мільярдаў. Таму і было прынята рашэнне вызначыць у кожным абласным цэнтры месцы, дзе пакупнікі маглі б атрымаць падарункі. Прычым зрабіць гэта можна было не толькі ў сваім рэгіёне, а ў любым іншым месцы. Гэта, наадварот, зручна. Напрыклад, купілі дзеці ў сталіцы сабе халадзільнік, а дакументы на атрыманне электрачайніка перадалі сваім бацькам па іх месцы пражывання. Ці бацькі ў вобласці набылі пральную машыну, а электрачайнік — ужо для сябе — у Мінску атрымалі іх дзеці, — патлумачылі нам.

Далей спецыялісты завода прапанавалі зірнуць на быццам бы ўзніклую праблему па-іншаму.

— Калі, скажам, у якім супермаркеце ў сталіцы стаіць чарга на два паверхі за бясплатнай запальнічкай ці кубкам, што ўручаюцца падчас розыгрышу прызоў пэўнай кампаніяй, гэта абсалютна нікога не засмучае. А калі чалавеку даводзіцца крыху пастаяць, каб атрымаць электрачайнік коштам амаль 80 тысяч рублёў, чамусьці ўзнікаюць пытанні. Так, у нас сапраўды былі выпадкі, калі гэтыя падарункі элементарна заканчваліся (хоць і завозілі мы іх у крамы, дзе адбывалася ўручэнне, з запасам). Чалавеку прапаноўвалі запоўніць усе патрэбныя дакументы, а ўласна па сам падарунак звярнуцца ў іншы дзень выдачы. А грамадзянін адказваў — хачу прама зараз. Думаецца, тут справа ў так званым чалавечым фактары. Хоць трэба прызнаць: падчас правядзення акцыі ўручана каля 28 тысяч падарункаў. Гэта больш, чым мы планавалі напачатку. Дарэчы, апошні раней заяўлены дзень выдачы падарункаў пакупнікам нашай тэхнікі — гэтая субота. Аднак мы плануем спецыяльна ўвесці яшчэ адзін такі дадатковы дзень у жніўні — для тых, хто па нейкіх прычынах не змог скарыстаць сваю магчымасць атрымаць электрачайнік раней або проста забыўся пра яе. Хутчэй за ўсё, такім рэзервовым днём стане 15 жніўня, — распавялі далей прадстаўнікі завода.

Што ж датычыцца гарантыі на бясплатныя электрачайнікі, дык яна складае, паводле іх далейшых слоў, два гады. «Мы ўпэўненыя ў якасці нашай прадукцыі — як пральных машын і халадзільнікаў, так і электрачайнікаў — таму не палохаемся даваць такі гарантыйны тэрмін».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОЖДЖ ПРАЙШОЎ. РОБІМ ЗАХАДЫ

Праліўны дождж, які прайшоў у сталіцы 24 ліпеня, затапіў 77 участкаў. Пяць гадоў таму іх колькасць дасягала 200. Чаму навучыла стыхія?

1. Неабходна забараніць размяшчэнне ўстаноў з масавым знаходжаннем людзей — супермаркетаў, клубаў, кавярняў — у зонах пагрозы падтаплення на цокальных і паўпадвальных паверхах, — лічаць у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

— Падчас ліўня, які прайшоў у сталіцы 5 гадоў таму, загінуў адзін з уладальнікаў памяшкання, якое размяшчалася на цокальным паверсе, — патлумачыў ініцыятыву **Аляксей ВАРАБ'ЁЎ, начальнік Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Беларусі.** — Сёлета, на шчасце, абышлося без ахвяраў. Але гэта не значыць, што не было пагрозы жыццю людзей. Многія, напрыклад, не маглі выбрацца з падтопленых памяшканняў, бо вада падпірала дзверы.

2. У Мінску распрацавалі спецыяльны атлас па ўзаемадзеянні спецыяльных службаў на выпадак моцнага ліўня, паведаміў Сяргей РЭЗКІ, начальнік аддзела гарадской гаспадаркі Мінгарвыканкама.

— Згодна з новым планам, права прымаць рашэнне, якія вуліцы перакрываць да пачатку дажджу, а якія не, замацоўваецца за Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Арыентавацца яны павінны на кароткачасовыя прагнозы гідраметэаралагічнага цэнтра.

3. Праз пяць гадоў у Мінску з'явіцца новы калектар «Цэнтр».

— Ліўневая каналізацыя, якая выкарыстоўваецца цяпер, разлічана на 28 мм ападкаў у суткі, — кажа Сяргей Рэзкі. — Яе пабудавалі яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Лічэнь жа, які прайшоў у пятніцу, вымяраўся лічбай 52 мм ападкаў. Новы калектар пракладваецца на глыбіні 26 метраў. Плануем скончыць яго будаўніцтва да 2014 года.

Акрамя таго, Мінгарвыканкамам запланаваны шэраг мерапрыемстваў па абсталяванні гарадскіх пляцовак, якія размешчаны ў нізіне.

4. Гаспадары падвальных памяшканняў не павінны спадзявацца наўдалую, а напярэдадні паклапаціцца аб абароне сваёй маёмасці ад ліўня.

Паводле слоў Сяргея Рэзкага, толькі адзінкі мінчан падрыхтаваліся да праліўнога дажджу, які прайшоў 24 ліпеня: закупілі мяшкі з пяском, спецыяльнае абсталяванне для адпампоўвання вады. І, паверце, іх выдаткі значна меншыя, чым выдаткі непрадбачлівых калег. Калі вада стаяла па вокны, яны абмежаваліся толькі працаўніцтвам падлогі.

Праблема ў тым, што ад выратавальнікаў, на жаль, залежыць не ўсё, — адзначыў Сяргей Рэзкі. — Эксперты прыйшлі да высновы, што, каб пазбегнуць падтапленняў, большасць з 77 падтопленых месцаў трэба цалкам рэканструяваць.

5. Навальніцапеленгатары з'явяцца ва ўсіх абласных цэнтрах?

Цяпер у сталіцы адзін такі навальніцапеленгатар праходзіць тэсціраванне. Паводле слоў **Дзмітрыя РАБАВА, начальніка службы гідраметэаралагічных прагнозаў рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра,** пры дапамозе гэтай апаратуры можна будзе фіксаваць прадвеснікі навальніцы на адлегласці да 2 тысяч кіламетраў. Калі тэсціраванне пройдзе паспяхова, то навальніцапеленгатары будуць усталёўваць ва ўсіх абласных гарадах нашай краіны. Дарэчы, прагноз надвор'я, які робяць у Рэспубліканскім гідраметэацэнтры на суткі спраўджваецца на 95—96 %, на трое сутак — на 88—90%.

Надзея ДРЫЛА.

Фота БЕЛТА.

НАЧНЫЯ ХУЛІГАНЫ

Ноччу небяспечна гуляць па вуліцы, асабліва дзяўчатам і маладым жанчынам. Але не ўсе ўлічваюць гэта. У дзве гадзіны ночы каля новага гандлёвага цэнтра «Мікс» у мікрараёне «Кавалёва» Брэста грамадзянін 1967 года нараджэння без усялякай прычыны ўдарыў грамадзянку 1982 года нараджэння бутэлькай па галаве.Так яна, прынамсі, расказала медыкам, якія аказвалі дапамогу, і міліцыянерам, якія разбіралі справу.

А ў гадзіну ночы ў Пінску школьнік збіў дваіх старэйшых за сябе гараджан. Хуліган затрыманы і дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрымання.

Яна СВЕТАВА.

Зваротная сувязь

«Усё лепшае... зэкам?»

«Звязда» атрымала ліст ад чытачкі з Віцебска, якая ад імя бацькоў дзетак, што наведваюць садок № 39, абуралася, што на тэрыторыі гэтага дзіцячага садка па вуліцы Гагарына будзе адкрыты цэнтр па рэабілітацыі былых зняволеных.

«Трэба адзначыць, гаварыцца ў пісьме, што гэты дзіцячы садок карыстаецца вялікай папулярнасцю ў бацькоў. Тут створаны самыя спрыяльныя ўмовы для інтэлектуальнага, творчага, духоўнага і фізічнага развіцця дзяцей...» Напрыканцы свайго ліста наша чытачка піша, што ў корпусе, які перададзены цэнтру, размяшчаліся пачатковыя класы школы. Яна абураецца тым, што ў будучым цэнтры вядзецца рамонт з выкарыстаннем сучасных будаўнічых элементаў, а на рамонт корпуса садка, што побач, сродкаў не выдзяляецца. Цячэ дах, а пра ўстаноўку шклопакетаў можна толькі марыць...

Ва **ўпраўленні адукацыі Віцебскага аблвыканкама** ўласнаму карэспандэнту «Звязды» растлумачылі, што будынак корпуса садка перададзены пад цэнтр з дазволу мясцовых уладаў.

У **аддзеле адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Віцебска** (менавіта ў Кастрычніцкім раёне будзе адкрыты цэнтр рэабілітацыі) адзначылі, што паміж тэрыторыяй садка і цэнтрам рэабілітацыі (старога будынка садка — **А.П.**) будзе ўстаноўлена высокая (каля 2,5 метра) агароджа. Такім чынам, не трэба хвалявацца, што, як піша чытачка, былыя зэкі змогуць трапіць на тэрыторыю садка.

Наконт таго, чаму на рамонт будынка садка няма грошай? Як растлумачылі спецыялісты аддзела, безумоўна, яго правядуць. Але, згодна з будаўнічымі нормамі, ёсць адпаведны тэрмін эксплуатацыі канструкцый. Садок параўнальна новы — эксплуатуецца менш за 20 гадоў.

Наконт прапановы чытачкі перадаць пасля рамонту адрамантаваны корпус пад цэнтр развіцця дзяцей, спецыялісты названага аддзела растлумачылі, што такі цэнтр будзе адкрыты ў садку № 73, ён знаходзіцца літаральна праз дарогу.

Ад аўтара. Не думаю, што гарадскія ўлады нейкім чынам забыліся, што суседства дзіцячага садка з цэнтрам рэабілітацыі былых зэкаў самае аптымальнае. Наколькі я зразумеў у размове з адказнымі асобамі, трэба было знайсці будынак пад адкрыццё такога цэнтра.

Дарэчы, пра неабходнасць стварэння апошняга гаварылася ўжо даўно. Вось канкрэтны прыклад. У двары нашага дома ў гаспадарчай пабудове жывуць былы зэк. Ягоная родная сястра — у кватэры гэтага ж дома, дзе таксама знаходзіцца карпункт «Звязды». У яе маленькай кватэры лішняга пакою для былога зэка няма. І што рабіць?

А ў цэнтрах рэабілітацыі, што адкрыюцца не толькі ў абласным цэнтры, пра такіх людзей маглі б паклапаціцца. Даць ім шанц пачаць жыццё, як кажуць, з чыстага ліста.

Дарэчы, у Віцебску, на той жа вуліцы Гагарына літаральна насупраць калоніі для падлеткаў таксама дзейнічае дзіцячы садок. І наколькі я ведаю (а ў калоніі я часта бываў па рабоце), ніякіх непрыемных інцыдэнтаў у сувязі з гэтым не было...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў... АПЛАЦЕ ЗА НАВУЧАННЕ

Першая чарга on-line сістэмы аплаты за навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце пачне дзейнічаць з 5 жніўня. З гэтага дня студэнты БДУ змогуць атрымаць праз інтэрнэт і ў разлікова-касавых цэнтрах «Белінвестбанка» поўную інфармацыю аб парадку і тэрмінах аплаты за адукацыйныя паслугі (аднаўленне, ліквідацыя акадэмічнай розніцы і г.д.). Для аплаты ім цяпер не трэба будзе паказваць квітанцыі, дагаворы і іншыя дакументы, дастаткова будзе толькі прад'явіць свой студэнцкі білет ці назваць нумар дагавора. Прычым зрабіць гэта можна будзе ў любым аддзяленні «Белінвестбанка».

Наступным этапам стане ажыццяўленне плацяжоў праз банкаматы і інфакіёскі (з 1 снежня гэтага года). А са студзеня 2010 года «Белінвестбанк», з якім супрацоўнічае БДУ, плануе даць магчымасць ажыццяўляць аплату і праз інтэрнэт. Падобная сістэма аплаты за навучанне ўводзіцца ў беларускіх ВНУ ўпершыню. Яна стала магчымай дзякуючы новай сістэме ўліку платных паслуг, распрацаванай у Цэнтры інфармацыйных тэхналогій БДУ на падставе сучасных тэхналогій, і рабоце, праведзенай «Белінвестбанкам» па навучанні сваіх супрацоўнікаў. Для таго, каб сістэма працавала, была спецыяльна ўстаноўлена асобная, абароненая тэлекамунікацыйная лінія з банкам. Дзякуючы новаўвядзенню, працэс аплаты за навучанне абяцае стаць больш празрыстым і адкрытым як для студэнтаў, так і для кіраўніцтва ВНУ. Наваспечаныя першакурснікі яшчэ да атрымання студэнцкіх білетаў змогуць з 5 жніўня ўносіць грошы за навучанне, назваўшы толькі нумар дагавора і сваё прозвішча. Скарыстацца новай сістэмай могуць усе студэнты Белдзяржуніверсітэта за выключэннем трох яго вучэбных падраздзяленняў БДУ: інстытутаў кіравання і сацыяльных тэхналогій, бізнэсу і менеджменту і Інстытута тэалогіі. Але ёсць надзея, што ў верасні плаціць за навучанне па-новаму змогуць студэнты ўсіх вучэбных структур БДУ.

Варта нагадаць, што залічэнне на ўмовах платнага навучання завяршаецца ва ўсіх ВНУ другога патоку 6 жніўня. І ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку заключэння дагавораў аб падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на ўмовах аплаты, дагавор можа заключацца толькі пасля прыёмнай камісіяй рашэння аб залічэнні. Заключаны дагавор з'яўляецца падставай для выдання загаду аб залічэнні на першы курс. Аплата ажыццяўляецца ўжо пасля выдання загаду аб залічэнні на першы курс. А на ўнясенне сродкаў за навучанне сям'і будучага студэнта даецца тэрмін, які не можа быць меншым за 15 каляндарных дзён з дня заключэння дагавора.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕ ГАНІСЯ ЗА ТАННЫМ

Жыхары адной са шматпавярховак з Івацэвічаў купілі мёд у невядомай гандляркі, якая хадзіла па кватэрах і прапаноўвала трохлітровік мёду ўсяго за 50 тысяч рублёў. Як потым высветлілася, прадукт быў падробкай. Восем чалавек звярнулася ў міліцыю. Але дзе цяпер тую махлярку шукаць?

Яна СВЕТАВА.

АДДАЛЕНЫЯ НАСТУПСТВЫ ЛІЎНЯ,

які прайшоў у Жлобінскім раёне паўтара тыдня таму, адчула рачулка Добасна, што цячэ праз пасёлак Чырвоны Бераг. Быццам вясной, яна выйшла з берагоў на пойму. І сёння падлеткі збіраюць прама на полі невялікую рыбінку сачкамі. З-за высокіх тэмператур і працэсаў гніення расліннасці, якія актывізавала спякотнае і вільготнае надвор'е, рыба пачала задыхацца. Адначасова з'явіліся чуткі, што ў ваду трапілі ядахімікаты з палёў. Іх абвяргае намеснік начальніка Жлобінскай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалай Марчанка. Мы размаўлялі з ім у момант, калі ён непасрэдна даследаваў сітуацыю з заморам рыбы на рацэ Добасна. Спецыяліст сцвярджае, што праверыў ачышчальныя збудаванні населенага пункта і крухмалапатачнага завода, які цяпер не працуе увогуле. Парушэнняў не выявілена. Больш за тое, у гэты момант нідзе ўздоўж ракі не ўносіліся хімічныя ўгнаенні — паўсюль ідуць работы па ўборцы збожжа. Ён адзначае, што рака бярэ пачатак у балотах і тарфяніках, якія таксама «забіраюць» кісларод, патрэбны для рыбы. Між тым і пробы, узятыя на канец ліпеня, ужо сведчылі аб яго недахопе ў вадзе. Зараз міжраённай лабараторыяй зроблены новы забор аналізаў, вынікі якіх будуць вядомыя праз некалькі дзён. Але ж, падкрэслівае Мікалай Марчанка, для панікі падстаў няма.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КРОПКА НАД «І»

Казкі для дарослых

Фота Пятра ФАМІНА.

...Лёс звёў нас з Тамарай у Гомелі. Прычым звёў неяк дзіўна, не па-добраму. І, відаць, засталася б у душы прыкрасць ад таго знаёмства, калі б сама Тамара не выправіла сітуацыю...

Мяне пасялілі ў выдатным двухмесным нумары з відам на вясновы, заліты сонцам горад. Суседка на той момант адсутнічала, але па неахайна раскіданых прыгожых рэчах можна было зрабіць некаторыя высновы адносна яе звычак... Паставіўшы каля ложка пакаёвыя тапачкі (падараныя клапатлівай бабуляй «спецыяльна для камандзіровак») і кінуўшы сумку ў шафу, я адправілася ў горад па справах. Вярнулася толькі ўвечары, стомленая і галодная. Дайшла да свайго нумара і аслупянела: перад дзвярыма стаяла мая нераспакаваная сумка, а зверху — акуратна — пакаёвыя тапачкі. Я пастукала ў дзверы — ціха, ніякіх прыкмет жыцця. На дапамогу прыйшла дзяжурная па паверсе, патлумачыўшы, што адміністратар памылілася, засяліла мяне «няправільна». І прапанавала ключы ад іншага пакоя.

«Дазвольце, а хто ж выставіў мае рэчы?» — не супакойвалася я, абураная гэткім самаўпраўствам. — Ды, відаць, ваша суседка пастаралася, — зашаптала дзяжурная, азіраючы цераз плячо. — Не першы раз яна прыязджае. Раней усё «люксы» займала, а цяпер, відаць, і кавалер не дапамог — абласная канферэнцыя ў нас, са свабоднымі нумарамі напружанне, вось яе ў двухмесны і засялілі. Але паабяцалі, што падсяляць нікога не будуць. Напэўна, нешта перабыталі... Давайце я вам іншы нумар пакажу».

Зразумела, падумала я. Нейкі мясцовы «туз» уладкоўвае такім чынам сваё асабістае жыццё. Утульны «нумарок», шампанскае з кейса, «закусь» з гасцінічнага рэстарана, дарагія вясновыя ружы ў сціплым графіне... Усё гэта я ўявіла з такой дакладнасцю, што неяк адразу расхацелася перашкаджаць чужому шчасцю. Уздыхнуўшы, нахілілася за сумкай. І нечакана пачула: «Ой! А я вас зусім інакш уяўляла. Гэта з-за тапачак. Такія звычайна бабулькі носяць... Заходзьце!» І не даўшы мне апамятацца, Тамара падхапіла маю «камандзіровачную» сумку і занесла ў пакой. «Злуяцеся? Не злуйцеся. Я думала: падселяць якую-небудзь бабуленцыю-інспектарку, будзе ныць па вечарах, што позна вяртаюся, спаць не даю. Вось і перастрахавалася. Дырэктар гасцініцы, дарэчы, мой прыяцель — нас адзін добры чалавек пазнаёміў...».

Я глядзела на яе і адчувала, як хутка знікаюць некуды ўсе непрыемныя эмоцыі. Хіба можна доўга злавацца на прыгожую жанчыну? А тое, што Тамара была прыгожай, не выклікала ніякіх сумненняў. Думаю, калі б яна захацела стаць якой-небудзь «міс», то дабілася б гэтага без асаблівых цяжкасцяў.

Самае смешнае, што потым яна прапанавала мне шампанскае («засталося ад вячэры»). Пасля гэтага мы, натуральна, разгаварыліся. Дакладней, гаварыла ў асноўным яна, я ж слухала, зрэдку ўстаўляючы малазначныя рэплікі. Яе шчырасць зусім не здзіўляла. У жыцці такое здараецца часта: саромеемся бліскага чалавека, не рашаемся выгаварыцца да канца, а перад першым сустрэчным распахваем душу. Бог яго ведае, чаму. Магчыма, блізкія не здольныя на аб'ектыўнасць. А чужыя хоць выслухаюць без істэрык. Яшчэ і парадай разумнай дапамогуць.

...Іх раман пачынаўся банальна. Ён — начальнік аддзела буйнога прадпрыемства, яна — эканаміст-пачатковец. Два гады працавалі побач, а пазнаёміліся — горш не прыдумаеш — у звычайнай сталоўцы. Сяргей Пятровіч, пасварыўшыся з жонкай, не паехаў абедаць дадому. Тамара не спадабаўся выбраны спачатку столік ля ўвахода, і яна перасела бліжэй да акна, дзе амаль не было людзей. Так яны апынуліся побач. Некалькі секундаў хапіла ёй на тое, каб заўважыць і наспех адпрасаваную кашулю, і сумныя карыя вочы, і высокі лоб з зачасанымі назад цудоўнымі каштанавымі валасамі. Мелькам глянуўшы на Тамару, ён уткнуўся ў талерку.

«Усё, — падумала яна, — будзе мой». Тады ў слова «мой» Тамара не ўкладвала асаблівага сэнсу. «Мой» на адзін дзень, на тыдзень, на месяц... Якая розніца? Нешта ўскалыхнулася ў душы, і гэтага было дастаткова. «Ён павінен быў мяне пакахаць — няшчасны, адзінокі, лёгкаранімы. Я зразумела гэта адразу».

Сяргей Пятровіч пачаў падвозіць яе дадому на сваёй машыне. Падарункаў асаблівых не рабіў, але кветкі купляў пастаянна. Разам «на людзі» яны не паказваліся. «Наш райцэнтр — вялікая вёска, усе адно аднаго ведаюць, тым больш яго». Рэстараны і кавярні таксама былі для іх зачыненыя... Тое, што павінна было рана ці позна паміж імі здарыцца, адбылося ў машыне, за горадам. Сядзелі, размаўлялі, і раптам ён рэзка адкінуў Тамарына сядзенне... Нічога падобнага яна да гэтага не зведвала, хоць і адносіла сябе да «катэгорыі» жанчын з вопытам... Потым ён доўга, з нейкім хваравітым замілаваннем, цалаваў яе ўсю, і паўтараў: мілая, любая, адзіная мая...

Яны жылі як у сне, ад сустрэчы да сустрэчы. І ён, і яна нібыта крыху звар'яцелі. Іх вынаходлівасць (як сустрэцца, каб ніхто нічога не западозрыў) не ведала межаў. Ён ехаў «у камандзіроўку», і клапатлівая жонка Вера Мікалаеўна складвала ў пакет хатнія піражкі, налівала ў тэрмас рамонкавы адвар (для прафілактыкі ўсякіх запаленняў) і клала ў кішэню піжака шкляначку з валідолам. Тамара ж адпраўлялася «ў госці» да інстытуцкай сяброўкі або таксама ездзіла «па рабоце». Яны здымалі нумар ці два ў якой-небудзь гасцініцы і без усялякіх перашкод дарылі адно аднаму сваё каханне... У «перапынках», змучаныя гарачым пачуццём, галодныя і шчаслівыя, елі вельмі смачныя Верыны піражкі (Сяргей хваліў жонку за кулінарны талент і жартаваў: у наступны раз папрашу не з мясам, а з капустай). А потым будавалі планы на будучыню, якая пакуль была не вельмі акрэсленай. Натуральна, кватэра Сяргея Пятровіча і ўсё ў ёй заставалася Веры і дзецям. Машына таксама. У якасці кампенсацыі за будучы маральны ўрон сям'і пераходзіла дача — трохпакаёвы дамок непадалёк ад горада. Будаўніцтва дачы, праўда, было не завершана. Заставаліся апрацоўчыя работы і сёе-тое з драбязы. Толькі пасля гэтага, забяспечыўшы сям'ю ўсім неабходным, Сяргей Пятровіч збіраўся праінфармаваць жонку аб сапраўдным становішчы рэчаў.

Але шчасце ніколі не бывае вечным. Гром, як заўсёды ў падобных выпадках, грымнуў нечакана. Аднойчы вечарам нехта пазваніў у дзверы Тамарынай кватэры. Узрадаваная прыходам каханага (а хто гэта мог быць яшчэ?!), яна кінулася адчыняць. На парозе стаяла Вера Мікалаеўна ўласнай персонай (вось табе і канспірацыя). Змерыўшы суперніцу поглядам, які не меў патрэбы ў каментарыях, яна дакладна і без доўгіх прамоў сфармулявала сваю думку: «Значыць так. Сяргея я табе не аддам, нават не спадзявайся. Хутчэй, сама на сябе рукі накладу».

Вера Мікалаеўна была страшная ў гневе. Але Тамара не спалохалася. Яна была ўпэўнена, што кожны чалавек мае права змагацца за сваё шчасце. А перамагае мацнейшы. Тамарына шчасце заключалася ў Сяргеі. Яна зразумела, што час чакання скончыўся, настала пара пераходзіць у наступленне. Іх спатканні сталі больш рэдкімі, але больш палкімі, з нейкім надрывам. Кожны раз Сяргей Пятровіч паводзіў сябе як чалавек, якому на гэтым свеце адпушчаны адзін дзень жыцця. Нават плакаў, паклаўшы галаву на Тамарыны калені і прыціскаючыся да яе ног. Прасіў не падганяць яго, пачакаць. Яна быццам бы згаджалася, і тым не менш не магла зразумець: ну што яго там трымае? Жонка не вельмі маладая і, шчыра кажучы, не надта прывабная — ніякага шарму. У сэнсе сэксу ў іх там — Сяргей сам прызнаўся — усё аднастайна і прэсна. Характар у яе таксама не падарунак. Успыліць, накрычыць, нагаворыць лішняга, потым тыдзень маўчыць... Не тое што Тамара. О! Яна ведае, як трэба любіць мужчын...

Узяўшы адпачынак, Вера Мікалаеўна з дзецьмі нечакана з'ехала да маці ў вёску, пакінуўшы Сяргея Пятровіча распараджацца кватэрай як уздумаецца. Тамара была ўпэўненая, што ў першы ж вечар ён запросіць яе да сябе. І памылілася. Але і тут знайшла яму апраўданне: суседзі маглі ўбачыць і паведаміць «каму трэба».

Сустрэліся, як заўсёды, у машыне, паехалі на дачу... Раніцай, шчаслівы і задаволены, ён паабяцаў паспяшацца з заканчэннем будаўніцтва і, адпаведна, разводам...

— І даўно гэта было? — спытала я ў Тамары.

— Амаль год таму, мінулым летам.

— Што, будаўніцтва зацягнулася?

Яна засмяялася, але нявесела:

— Ну, у нейкім сэнсе... З дачай усё ў парадку, але цяпер ён будуе гараж, каб ім было куды ставіць машыну. Сустракаемся па-ранейшаму ў «камандзіроўках», вось у Гомель зачасцілі: дырэктар гасцініцы — Сярожаў школьны сябар. Па праўдзе кажучы, гасцініцы ўжо надакучылі. Стамілася ад іх. Але куды падзенешся? Рана ці позна Сярожа дабудуе ім гэты праклятый гараж...

Я прамаўчала. А што было гаварыць? Што пасля гаража Сяргею Пятровічу тэрмінова можа спатрэбіцца лазня? Гэта было б падобна на нязмушаны жаночы ўдар «пад дых»... Мы прасядзелі амаль да апоўначы. А яшчэ пазней у нумары раздаўся тэлефонны званок. «Гэта мне», — сказала Тамара, здымаючы трубку. Потым пажадала мне добрай ночы і пайшла, папярэдзіўшы, што вернецца раніцай. Але на наступны дзень мы так і не ўбачыліся. Вечарам дзяжурная па паверсе перадала мне нумар яе хатняга тэлефона.

Столькі год мінула... Я так і не патэлефанавала ёй, ды, уласна кажучы, не вельмі і хацела. Для сябе ў той гісторыі я даўно паставіла кропку, і мне зусім не цікава, чым яна скончылася насамрэч...

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ЗА ШТО ДАЮЦЬ ПРЭМІЮ НОБЕЛЯ?

Чытаць працы лаўрэатаў прэстыжнай прэміі можна ў Беларусі.

Чатыры камплекты 67-томнага поўнага збору навуковых і грамадскіх прац нобелеўскіх лаўрэатаў ужо закуплены, яны будуць даступныя для чытачоў Цэнтральнай бібліятэкі Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Выданні былі закупленыя згодна з даручэннем Урада нашай краіны. І цяпер нашы навукоўцы і зацікаўленыя асобы маюць магчымасць пазнаёміцца з працамі сусветнавядомых даследчыкаў у галіне фізікі, хіміі, фізіялогіі, медыцыны, эканамічных навук, літаратараў і лаўрэатаў прэміі свету ў перыяд з 1901 па 2000 год. Выданне афармляў мастак Эрнст Невядомы. Аднак гэта не ўсё. Яшчэ тры камплекты збору ў хуткім часе папоўняць калекцыі Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі і абласной бібліятэкі Магілёва і навуковай бібліятэкі Гродна.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Минский городской центр недвижимости

ОАО «ВИТЕБСКОБЛРЕСУРСЫ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складских помещений с элементами благоустройства, гаражей и иного имущества, расположенного на ул. М. Горького, 197 в г. Витебске, единым лотом.
В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Литер
1.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50614 (здание складских помещений) общей площадью 690 кв. м, (год постройки – 1969) в том числе составные части:	В1/к
1.1.	Площадка – 1550 кв. м	А
1.2.	Камень бортовой – 115,15 м	а1
1.3.	Участок ограждения – 7,55 м	б1
1.4.	Ворота въездные – 5,9 м.	б2
1.5.	Участок ограждения – 12,35 м	б3
1.6.	Участок ограждения – 2,20 м	б4
1.7.	Участок ограждения – 118,3 м	б5
1.8.	Участок ограждения – 2,85 м	б6
1.9.	Ворота въездные – 5,90 м	б7
1.10.	Участок ограждения – 30,35 м	б8
1.11.	Калитка – 1,5 м	б9
1.12.	Труба дымовая – 1 кв. м	
1.13.	Уборная – 3 кв. м	
2.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50616 (здание гаражей) общей площадью 53 кв. м (год постройки – 1993)	
3.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59952 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть) протяженностью 233,7 м	
4.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59951 (сооружение специализированное энергетики – тепловая сеть) протяженностью 83,1 м	

Земельный участок площадью 0,2681 га, кадастровый номер 240100000003000118 предоставлен в постоянное пользование для содержания и обслуживания существующих зданий по ул. М. Горького, 197 в г. Витебске.

Начальная цена лота – 311 773 392 белорусских рубля без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 30 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Аукцион состоится **14 августа 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **13 августа 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(0212)27 23 16 – ОАО «Витебскоблресурсы».

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)
07 сентября 2009 года проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белаттракцион» (продавец)

На аукционные торги выставляются:

Номер лота	№ 1	№ 2	№ 3	№ 4
Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- здание административно-хозяйственное, инв. номер 500/С-48231, площадь 69,6 кв.м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 500/С-48232, площадь – 67,0 кв. м; - ограждение металлическое, протяженность – 470 м; - асфальтобетонное покрытие, площадь – 29,6 кв.м.	- здание специализированное иного назначения (павильон), инв. номер 500/С-48537, площадь – 59,3 кв.м.	- здание специализированное энергетики, инв. номер 500/С-48263, площадь – 8,9 кв.м.	- здание административное инв. номер 400/С-2446, площадь – 178,7 кв.м.
Местонахождение имущества	г. Минск, ул. Ташкентская, д. 25	г. Минск, ул. Фрунзе, д. 2	г. Минск, проспект Независимости, д. 84	г. Гродно, ул. Виленская, д. 20
Сведения о земельном участке	площадь – 0,0090 га, кадастровый номер 500000000002006760; назначение – эксплуатация и обслуживание здания специализированного складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранил

Наш культурны асяродак
ЖЫВАНДОЛЯ
Выпуск № 18 (64)

Рыштаванні Бацькаўшчыны

100 ПАКОЯЎ КАЗІМІРА РДУЛТОЎСКАГА

Унікальны палац у Снове захоўваецца сіламі... памежных войскаў і агракамбіната!

Нават адышоўшы на 100 метраў да самай агароджы, немагчыма цалкам змясціць у кадр палац Казіміра Рдултоўскага.

Цэнтральны ўваход у Сноўскі палац. Цяпер за гэтымі дзвярыма месціцца вайсковы клуб.

Сноў можна назваць малодшым братам Нясвіжа — знаходзіцца ўсяго за 20 кіламетраў, а ў мястэчку — вялізны палац, сядзіба, касцёл і царква. Пры лепшым раскладзе лёгка можна было б дапасаваць да турыстычнага маршрута Мір—Нясвіж...

Палац сёння належыць памежнай службе. Гэта добра, але з пэўнай агаворкай. Безумоўна, вайскоўцы падтрымліваюць помнік архітэктуры ў належным стане, усімі сіламі клапоцяцца пра ягоную захаванасць, дапамагае ў гэтым таксама мясцовы агракамбінат «Сноў». Але — паколькі аб'ект вайсковы — простаму турысту сюды ходу няма.

Аднак для карэспандэнта «Звязды» робяць выключэнне. Спадарыня на КПП тэлефануе ў часць дзяжурнаму — той спраўджвае пасведчанне, тэлефануе «таварышу палкоўніку» — і кажа: «Хадзем».

«Цалкам у кадр ён змяшчаецца толькі з самалёта...»

Да палаца вядзе дарога. Адсюль, з-за дрэваў, немагчыма зразумець ягоны сапраўдны памер.

— Агромністы ён. Пасля вунь да таго плота адыдзеш, адтуль яго найбольш у кадр змесціца. А цэлы — толькі з самалёта... — раіць мой гід, які прасіў не называць яго.

Ля палаца памежнік з гонарам паказвае мне валун з мармуровай шыльдай, дзе напісана па-беларуску: «1827-2007, Камень закладзены ў гонар 180-годдзя з дня пабудавання палаца. Архітэктурна-паркавы комплекс заснаваны павятовым маршалкам Казімірам Рдултоўскім у 1827 годзе па праекце архітэктара Б. Тычэцкага. Сноў, 2007».

— Гэта мы паставілі, — хваліцца ён.

Дарэчы, цяпер дата пабудовы палаца аспрэчваецца некаторымі даследчыкамі. Бо ёсць звесткі, што ў Снове ў 1784 годзе быў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Панятоўскі гасцяваў у Нясвіжы ў Радзівілаў, і Ян Рдултоўскі запрасіў манарха наведаць заадно ягоную блізкую рэзідэнцыю, на што Панятоўскі згадзіўся. Пасля кароль напіша ва ўспамінах: «Дня 15 верасня прыбылі мы ў Сноў, уладанне Рдултоўскага, харужага навагрудскага, каля апоўдні, тут мы мусілі мець абед і ночыць. Пабачылі мы дом вельмі выгодны, мураваны, з крыламі і шыкоўнымі памяшканнямі». Ці быў гэта цяперашні палац, ці які ранейшы — вызначыць па гэтым абстрактным апісанні цяжка...

Палац, які мы маем сёння, не надта дэкараваны. Троху ляпніны, калоны з пілястрамі.

— Мы іх белім пацэху, — кажа вайсковец. — Толькі дажджу сёлета шмат. А як мокра — не пабеліш асабліва, усё адваліцца. Дык чакаем, пакуль пару дзён не лье, глядзім прагноз — і белім.

Галоўнае выкарыстанне палаца сёння — шпіталь. Тут лекуюцца і аднаўляюць здароўе памежнікі, супрацоўнікі МУС... Адначасова палац здольны прымаць 150 пацыентаў. Цяпер, па словах майго суразмоўцы, больш за 100 месцаў занята. У іншых частках палаца — штаб і клуб. На жаль, у выхадны большасць памяшканняў зачынена і пастаўлена на сігналізацыю, таму паглядзець іх не ўдаецца.

— Там ніякага асаблівага дэкору не засталося, — пераконвае мой гід. — Хіба што вокны прыгожай формы, дык вы гэта і адсюль пабачыць можаце.

Памежнікі даглядаюць і старую панскую сажалку. Наўкол палаца — ахайныя газоны, кветкі, хвоі, птушкі спяваюць, прысады парку (37 гектараў!), сцежкі, лавачкі... Я таксама тут тыдзень адпачыў бы...

— Забаронена, — паціскае плячыма вайсковец. — Толькі для супрацоўнікаў...

Якое ж было маё здзіўленне, калі мой экскурсавод прапанаваў паглядзець разам гісторыю палаца ў ягоным працоўным камп'ютары. Прыемна, што не толькі карыстаюцца, але і вывучаюць!..

Сноўскі палац быў... прайграны ў карты

А гісторыя гэтая цікавая. Мястэчка Сноў вядомае ад XVI стагоддзя. Першапачаткова належала Радзівілам, затым Гарабурдам. У 1639 годзе Ян Геранім Рдултоўскі набыў яго ў Ежы Гарабурды, «дэпутата слонімскага на Трыбунал Літоўскі», за «13 600 коп грошай літоўскіх». Заснавальнікам сноўскай лініі лічыцца Ян Багуслаў Рдултоўскі, навагрудскі кашталян. Ягоны ўнук Казімір і пабудаваў гэты велічны палац на 100 пакояў, а таксама — у 1836 годзе — царкву Пятра і Паўла. У той час у Снове было 2000 прыхаджанаў.

Казімір быў вельмі цікавай і неадназначнай асобай. Адукаваны — у найлепшых традыцыях таго часу: ад ранняга веку жыў і вучыўся ў Англіі, у Оксфардзе атрымаў ступень доктара філасофіі. Пікантным момантам стаў ягоны шлюб з сястрой Тэрэзай (дачкой бацькі ад іншага шлюбу). За дазвол на гэта Казімір заплаціў немалую індульгенцыю Ватыкану. Шлюб быў шчаслівы, сужэнцы мелі траіх дзетак. У палацы Казімір стварыў зімовы сад, галерэю, абсталяваў вялізную бальную залу — да яго, навагрудскага павятовага маршалка, прыязджала на балі ўся тагачасная шляхта. Аднойчы Рдултоўскі нават прымаў у Снове спадара Ераніма, брата Напалеона Банапарта. Сын Казіміра Канстанцін стаў маршалкам Слуцкага павета, скончыў Сарбону, захапляўся паэзіяй, сябраваў з Міцкевічам, перакладаў яго на англійскую, сустракаўся з Пушкіным. Міцкевіч называў Канстанціна Рдултоўскага «ліхім» паэтам. Аднак пасля смерці Казіміра Сноў атрымаў ягоны малодшы сын Яўстах і ў 1854 годзе... прайграў палац у карты...



Сноўскі касцёл, збудаваны ў 1760 годзе, — яшчэ адзін цікавы пункт для турыстаў.

У выніку ад 1854 года Сноў пераходзіць ва ўладанне да барона Густава Гарцінга, затым да ягонага сына Мікалая, пасля да сына Генрыха. Гарцінгі збудавалі сабе тут яшчэ адзін маёнтак, які атрымаў назву Горны Сноў. Аднак, як адзначалі даследчыкі таго часу, «сам палац пасля Рдултоўскіх заселены мала, стаіць пусты».

І зноў вяртаюся да пачатку: палац стаіць — а паглядзець і сфатаграфаваць простаму наведніку яго нельга. Можа, варта было б падумаць над вырашэннем гэтага пытання?.. Напрыклад, замацаваць спецыяльнага чалавека і браць з турыстаў за ўваход сімвалічныя грошы. Глядзіш, і на фарбу б назбіралі для калонаў — і пачало б касметычнае аднаўленне палаца апраўдваць сябе...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

Сноўская сядзіба барона Гарцінга сярэдзіны XIX стагоддзя.

НЕ ТРЭБА НАС У ЛАПЦІ АБУВАЦЬ!

«Мы ў XVII стагоддзі ў ботах са шпорамі хадзілі», — кажа археолаг Сяргей Расадзін і паказвае рэшткі таго, што калісьці было ботам і шпоры да яго — дакладна такія, як на помніку, што ўзведзены Раману Шацілу — легендарнаму заснавальніку горада, сённяшняга Светлагорска.
— Шпору мы знайшлі зусім нядаўна. Яна з металу, тут былі цвікі, якія прымацоўвалі яе да абцаса, тут зорачка з шыпамі.
Між тым, завершаны трэці этап раскопак на Шацілінскім востраве. Навукоўцы і грамадскасць падводзяць вынікі.

Бронзавы помнік Раману Шацілу на Цэнтральнай плошчы ў Светлагорску.

І дзе той вербалоз?

Прафесар Расадзін тры гады запар прыязджае ў Светлагорск для таго, каб значна састарыць «самы малады» горад Беларусі. Калі жанчыны баяцца лічбы кожнага пражытага года, то мясцовыя энтузіясты-краязнаўцы, пошукі якіх узначаліў знакаміты доктар навук, толькі рады таму, што іх родны горад над Бярэзінай можа стаць у адзін шэраг са старажытнымі славутасцямі краіны.

— З мясцовымі краязнаўцамі мы некалькі разоў хадзілі па гэтых Шацілках, лічылі, што гэта дзесьці на агародах. Між іншым, доктар філалагічных навук з Гомеля Аляксандр Рогалеў напісаў, што востраў Шацілінскі ўвогуле змыты Бярэзінай, а нізіна заросла вербалозам. У мяне пытанне да калегі ўзнікла: даражэнькі, а ты там быў, ты бачыў гэтую нізіну, той вербалоз? Нічога там не знікла, усё там ёсць, і мы знайшлі, акрамя слаёў XVI—XVIII стагоддзяў, слаі старажытнарускія — не пазнейшыя за XIII стагоддзе.

Светлагорск сталеў некалькі разоў. Сапраўды, спачатку ў яго была толькі найноўшая гісторыя, і пачыналася яна ў 1961 годзе: з будаўніцтва прамысловага гіганта — прадпрыемства штучнага валакна. Потым была звернута ўвага на дакументы, якія вызначылі ўзрост прабацькі Светлагорска — Шацілак, або Шацілавіч — ад 1639 года. А яшчэ праз некаторы час у фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь быў знойдзены Прывілей ад 15 чэрвеня 1560 года за подпісам Жыгімонта II Аўгуста, караля Польскага і Вялікага князя Літоўскага. У ім гаварылася, што маёнтак «Востраў Шацілінскі», на гары, на тракце Горвальскім, на рацэ Бярэзіна ў Рэчыцкім павеце, пасля смерці папярэдняга ўладальніка Рамана Шацілы перадаецца новаму ўладальніку Ждану Манкевічу ў пажыццёвае ўладанне з абавязковым выкананнем вайсковай службы. Такім чынам, у наступным годзе гораду Светлагорску споўніцца ні многа ні мала — 450.

— Але ж, — кажа Сяргей Расадзін, — акрамя пісьмовага перыяду быў дапісьмовы, калі гэта паселішча яшчэ не трапіла на старонкі пісьмовых крыніц. Там, дзе ад Бярэзіны адыходзіць так званы «халодны канал» на Светлагорскую ГЭС, было знойдзена першае пасяленне людзей. Яны, па меркаванні вучонага, прыплылі на востраў у эпоху мезаліту, у VII—V тысячагоддзях да нашай эры. Сведчанне гэтаму — знойдзеныя мезалітычныя крэмені.

Самыя першыя разведкі тут правяла кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Наталля Дубіцкая, а з 2007 года рэгулярныя раскопкі вядзе прафесар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, член Гераldычнага савета пры Прэзідэнце Беларусі Сяргей Расадзін. Ён называе кардынаты Вострава Шацілінскага і паказвае прадметы, знойдзеныя на раскопках, якія і служаць доказамі старажытнасці гэтага паселішча.

Прынамсі, яшчэ да пачатку афіцыйных раскопак мясцовыя жыхары на сваіх прыватных агародах, размешчаных на гістарычным месцы, часта знаходзілі тое, што сёння прынята называць артэфактамі.

Гламурная завушніца і плямісты алень

— Што цікава, у старажытнай Русі на зямлі цяперашняга прамысловага Светлагорска было пасяленне металургаў, — знаёміць Сяргей Расадзін з таямніцамі гісторыі. — На Шацілінскім востраве былі знойдзены рэшткі печы-дамніцы па выплаўцы жалеза з жужалю — балотнай руды. Метал гэты асядаў крыцамі — паўфабрыкатам металургічнай вытворчасці, крыцы пракоўваліся, і атрымлівалася вельмі якаснае жалеза. Каб дасягнуць высокай тэмпературы, ужываліся пераваднікі ад скуранога меху да распаленай печы. Пра гэта сведчаць знойдзеныя даволі вялікая крыца, соплы, кавалкі пячной абмазкі. Выходзіць, Светлагорск пачынаўся з доменнай вытворчасці.

Самы юны ўдзельнік раскопак Глеб УСЦІНАЎ знайшоў зуб аленя.

І хоць археалагічны матэрыял яшчэ патрабуе дасканалага вывучэння і аналізу, гісторыка-археалагічныя версіі ёсць ужо сёння.

— Масавыя знаходкі — розных мадэфікацый нажы: складны з касцянымі накладкамі, нож на заклёпках, ражковы, з абойніцамі — гэта мяжа XVI—XVII стагоддзяў. Нерадавы статус гэтага пасялення даказвае такая дэталь. Летась у слаі XVI—XVII стагоддзяў мы знайшлі косці плямістага аленя. А па тых часах плямісты алень — далёкаўсходні від — мог трапіць у Еўропу толькі ў заапарк Версаля або Лондана. А ў нас тут цэлыя дзве асобіны. Якім шляхам аказаўся ён тут? Можа, як нейкі рарытэт, дзіва... «Каралеўскі статус» паселішча засведчаны і... знойдзенай гламурнай мужчынскай завушніцай. Якраз такой, як на выяве караля Карла I Сцюарта работы Ван Дэйка, — кажа прафесар Расадзін і дэманструе фотаздымкі-параўнанні.

За тры гады знойдзены вельмі разнастайныя рэчы. Тут і касцяная прылада «качадык» — для пляцення лапцяў, тут і міргалёвая чарнілітца для чалавека-пісара. І асялок, каб касу тачыць, і пісталетныя крэмені, свінцовая куля. Гісторык лічыць, што складаным і разнастайным быў лад жыцця людзей, якія жылі тут. Мірнае жыццё земляроба і зусім іншае — воіна. Знойдзена на раскопках вельмі многа шкла, у тым ліку рыльцаў ад бутэлек, частка — ад штофаў.

— Я не думаю, што Манкевічы пілі з іх мультывітамінны сок, — усміхаецца прафесар. — Вось гэтыя скроневыя кольцы-завушніцы. Датаванне вельмі ранняе — першыя стагоддзі сярэднявечча — VI—VII, яшчэ больш ранняе датаванне мае гэтая шпілька, мабыць мяжа IV—V стагоддзяў да нашай эры. Люлек для паленні тытуню знойдзена цэлая калекцыя: як бы было цудоўна, калі б іх можна было атаясаміць з носьбітамі шкодных звычак — панамі Манкевічамі...

У Шацілках ў 1638 годзе быў заснаваны касцёл, і яго рэшткі Сяргей Расадзін збіраецца шукаць у наступным годзе. Навуковы кіраўнік светлагорскіх раскопак сцвярджае, што разумее, чаму гэтае месца было пакінута ўладальнікамі ў XVIII стагоддзі. Ён звязвае гэта з ростам іх сям'і.

— У выніку дэмаграфічнага выбуху, калі ў сям'і паноў Манкевічаў пачалі ў вялікай колькасці нараджацца дзеці, им давялося перабірацца ў Шацілкі, — лічыць прафесар Расадзін. — Цесна ім стала на бацькоўскай сядзібе. А крыху пазней менавіта ў Шацілках ўзнікае «мытны страж» — мытны пост. Так што гэта паселішча ніяк нельга назваць звычайным. Я так думаю, яно выконвала ролю нейкай базы гандлю на дзяржаўным шляху, які вёў у Горваль. Умацаваная сядзіба тут магла быць. Яшчэ большы важны вынік мела тое, што ў 1638 годзе ў Шацілках быў заснаваны касцёл. З яго з'яўленнем Шацілкі сталі цэнтрам пэўнай парафіі, і такім чынам спалучылася эканамічнае, адміністрацыйнае і духоўнае значэнне гэтага месца.

Апошнія знаходкі Шацілінскага вострава.

Гісторыка-археалагічныя версіі Сяргея Яўгенавіча пацвярджаюць знойдзеныя на гэтых раскопках адмысловыя рэчы: маленькі грабеньчык, магчыма, для вусоў; гузікі: бронзавы і касцяныя, але зробленыя з выкарыстаннем такарнага станка; лыжка з кляймом — медная са слядамі срэбра; крэмені ружэйныя... Калекцыя настолькі прадстаўнічая, што ставіць пад сумненне датаванне, шматразова пацверджанае, ужо ніхто не можа — гэта стала фактам навуковага жыцця, але ж, можа, больш важна, што гэта стала фактам жыцця грамадскага. Малыя дзеткі ўжо ведаюць, што Светлагорску не 48 гадоў, а значна больш. Горад атрымаў сваю гісторыю. Не менш важна і тое, што жыхары навучыліся распараджацца сваёй гістарычнай спадчынай.

Тут будзе горад узведзены

Шацілінскі востраў для Светлагорска — гэта як Крэмль для Масквы. Сёння Светлагорскім райвыканкамам рыхтуецца афіцыйнае рашэнне аб пачатку працы над яго аднаўленнем. Ёсць планы стварыць на гістарычным месцы рэканструкцыю старажытнага паселішча. Папярэдняе рашэнне аб аднаўленні сядзібы было прынята ў Светлагорску на сустрэчы прадстаўнікоў мясцовай улады з грамадскасцю.

Ёсць канцэпцыя аднаўлення Шацілінскага Вострава як сучаснага комплексу, турыстычнага і культурнага цэнтра. Тут размесціцца філіял музея горада Светлагорска, дзе можна будзе пабачыць вопратку, зброю, посуд XVII—XVIII стагоддзяў. Як жылі нашы продкі, што елі і на чым спалі, якой зброяй ваявалі, чым аралі зямлю, як выраблялі керамічны посуд — пра гэта раскажуць сапраўдныя майстэрні традыцыйных рамёстваў. Плануецца прадугледзець і інфраструктуру па абслугоўванні турыстаў. Гэта дазволіць правадзіць у Шацілках святочныя і тэатралізаваныя мерапрыемствы, у тым ліку фестывалі старажытнай рыцарскай культуры.

Праект распрацоўваецца ўжо сёлета, а ў наступным годзе пачнецца яго паэтапная рэалізацыя. Ну а цікавыя артэфакты, знойдзеныя падчас раскопак, хутка зойміць ганаровае месца ў мясцовым краязнаўчым музеі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара
і з архіва Сяргея РАСАДЗІНА.

Адзін з удзельнікаў раскопак — Генадзь РЫЗНАОКІ ў апошні дзень раскопак на Шацілінскім востраве.

Запрашальнік

ПАД МІНСКАМ ПРОЙДЗЕ «НАВАЛЬНІЦА» З ЗАРАПАДАМ

У апошнія выхадныя лета ў гарналыжным комплексе «Лагойск» адбудзецца навальніца... але без дажджу. «Навальніца» — гэта міжнародны фестываль феерверкаў, упершыню наладжаны ў Беларусі.

Цягам трох дзён, 28, 29 і 30 жніўня, наведвальнікі ўбачаць выступленні тытулаваных еўрапейскіх камандаў піратэхнікаў — з Францыі, Германіі, Чэхіі, Славакіі, Латвіі і Літвы. Ацэньваць спецыяльна падрыхтаваныя відовішчныя праграмы, дарэчы, будуць не толькі гледачы, але і міжнароднае журы, якое ў заключны дзень назаве пераможцаў фестывалю. «Па рэгламенце выступленне кожнай каманды павінна ўключаць каля 5 тысяч зарадаў рознага калібра, — расказвае кіраўнік аргкамітэта «Навальніцы» Ігар Сідаровіч, — але галоўнае нават не гэта. Усе выступленні будуць суправаджацца адмыслова падабранай музыкай, настрой і рытміку якой павінен адлюстроўваць феерверк. Мы хочам паказаць у начным небе не проста серыю эфектных выбухаў, а жывыя карціны». Напрыклад, 28 жніўня выступленні піратэхнікаў падтрымае гурт «J:Морс», 29 — «Ляпіс Трубяцкой», 30 — «Палац».

Акрамя таго, пасля заканчэння вячэрняй праграмы ў першыя два дні фэсту будзе яшчэ і начная — выступленні папулярных дыджэяў. А ў трэці, заключны вечар арганізатары рыхтуюць свой асаблівы падарунак: гранд-феерверк ад беларускай каманды «Кальвін». Дзяржынская кампанія «Кальвін», дарэчы, не толькі стала пераможцам чэмпіянату Еўропы ў 2007 годзе, але і беларусам добра знаёмая — менавіта яна шмат гадоў запар забяспечвае феерверкі на святочныя даты: дзень горада ў Мінску, Новы год і г.д.

Да фестывальнай пляцоўкі, запэўніваюць арганізатары, можна будзе дабрацца як на асабістым транспарце, так і на спецыяльным аўтобусе ад станцыі метро «Усход». А вось білеты на саму «Навальніцу» рэкамендуюць набыць загадзя, бо бліжэй да пачатку мерапрыемства цэны будуць расці.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Пры ўсёй фантасмагарычнасці, знешнім і рэальным антуражы апавядання Віталя Воранава, яно вельмі дакладнае ў перадачы стану душы творцы. Стану душы, якая ўжо ў працэсе творчасці. І гэта выпісана дакладна і строга. Таму некалькі слоў пра самога Віталя Воранава: дваццаць шэсць гадоў, нарадзіўся ў Мінску. Літаратар, перакладчык, выдавец... Друкаваўся ў часопісе «Маладосць».

Віктар КАЗЬКО.

Віталь ВОРАНАЎ

КАРЦІНА «ВЯРТАННЕ»

Майстэрня мастака месцілася на чацвёртым паверсе. Угору вялі драўляныя, спарахнелыя сходы, паверх якіх пяліся парэнчы, памаляваныя ў цёмна-карычневы колер. Кожны раз, калі мастак бачыў гэтыя парэнчы, яму рабілася млосна і ён прыспешваў, каб як найхутчэй апынуцца за дзвярыма сваёй майстэрні.

У памяшканні было толькі адно акно, якое выглядала на панадворак камяніцы. Звонку пагрозліва пазіралі брудныя сцены будынкаў. Яны надавалі святлу, якое падала ў пакой, своеасаблівае адценне. Гэтае адценне можна было заўважыць на ўсіх карцінах, якімі быў завалены цэлы доўгі калідор майстэрні.

Сцены пакояў былі размаляваныя звярху данізу. Яны мала чым нагадвалі пячорныя малюнкі дагістарычнага чалавека ці фрэскі старажытнасці. Гэта хутчэй, былі чарнавыя накіды. Відаць, што ў момант, калі трэба было зрабіць нейкія замалёўкі пад рукою не было ўжо чыстых аркушаў паперы. Калі б не гэтыя сцены, шмат якія вобразы маглі б страціцца назаўсёды, так як і ўся кватэра майстэрні магла б страціцца ў шэрасці суседскіх камяніцаў, калі б не гэтыя сцены...

Майстэрня займала паверхню цэлае кватэры, але ўявіць, што хтосьці па-за палотнамі, фарбамі і старымі рамамі мог бы ў ёй жыць, было немагчыма. Два пакоі кватэры былі малымі і больш падобныя да прахадных, якія, аднак, нікуды не вялі. У канцы аднаго пакоя быў умывальнік, ручкі і кран якога былі суцэльна запэцканыя алеем і распушчальнікам. Усюды стаяў выразны пах фарбы, да якога мастак прызвычаіўся і якога ўжо зусім не адчуваў. Магчыма, з часам ён проста стаў ад яго залежны. Бывалі дні, калі мастак заходзіў у майстэрню, стаяў нейкі час, гледзячы ў акно, пераступаў з кута ў кут, а потым проста выходзіў. Здаралася, што ён не маляваў дзень, другі, нават месяц, ці два, але падыхаць паветрам майстэрні ён заходзіў штодня.

І сёння маляваць яму не хацелася як ніколі. Ён проста хацеў пастаяць ля акна з пустым кубкам пасля даўно ўжо выпітай кавы, утапіцца ў цені забытага панадворка, прыгадаць тую вясну, успамін якой спараджаў у ім гэты вобраз, гэты неад'емны вобраз ніцасці. Пра тую вясну гаварыла спарахнелая рама акна, якая рыпела пры кожным подзьмуху скразняка, нагадвала тоўстая нага падрамніка, што выставала з падлогі бы тыя дрэвы, павытыркваныя з сумётаў яшчэ не стапнелага снегу, нашэптвала белае палатно, што нібы цяжарныя хмары захуталіся небасхіл у дзень ягонага вяртання. Бадай так вяртаюцца з выраю, бадай такой парой, падуваю ён. Толькі цяпер, брыдучы па гэтым бездарожжы, ён пачынаў разумець, навошта людзі пракладаюць пуцявіны і трымаюцца іх, чаго б гэта ім ні каштавала. Убіваючы стомлены позірк у небакрай, мастак намагаўся накрэсліць хоць нейкую праяву жыцця свайго небакраю, але заслязёныя вочы злівалі даляглад у адну застылую палітру... Хлусня, што птушкі вяртаюцца, вясною. Птушкі ніколі не вяртаюцца падумаў ён, бо іхнія гнёзды там, дзе яны, ці вырай гэта, ці пекла. Вяртаюцца толькі людзі. Вяртанне — чалавечая пакута.

Перад мастаком расцігнулася доўгая і простая як пэндзаль сцяжына. Ён быў на паўшляху да невядомага, якое заўжды клікала яго да сябе, а пасля праганяла яго з парога прэч. Некалькі абсурдна — вяртацца немаведама да чаго і навошта — прамільгнула ў галаве. Каб знайсці спакой, ці суцяшэнне? Але ж пакуль гэта адно пякучы боль і нічога болей. Сапраўдны боль сціснуў цяжкія лёгкія і гэта прымусіла яго спыніцца. Як жа ўрэшце навучыцца адрозніваць жыццё ад імітацыі, а ўспамін ад цяперашчыны? Чаму так цяжка прыняць простыя і выключныя катэгорыі падзелу на добра і зло, любоў і нянавісць. Няўжо перашкаджае свядомасць таго, што ў чорным ёсць белае, а ў белым, нават у белым снезе, ёсць чорнае адценне зімы? Ён адчуў, як страх працінае яго ад галавы па самыя пяты, як тады, той вясною...

У гэты пакой наважвалася заходзіць толькі бабуля. Яна рабіла гэта так спакойна, быццам бы наразала цёплых хлеб; зайшоўшы ўсярэдзіну, абавязкова зачыняла за сабою дзверы. Ягонай адвагі ставала хіба на тое, каб зазірнуць у пакой, калі дзверы прыадчыняліся і зачыняліся. З нутра даносіўся пах саломы і попелу. З пакою чуваць было адно бабуліны крокі, якія былі надзвычай акуратнымі. Пасля даносіўся нук сыпанага на падлогу зерня, які перабівала ўхвальнае квактанне квактухі. Бабуля сыпала зерне моўчкі. Пасля выходзіла і шчыльна зачыняла за сабою дзверы. Ён чуў, як квактуха памалу і асцярожна злазіць з гнязда і пачынае дзюбаць зерне.

Ішоў трэці тыдзень, як квактуха выседжвала яйкі. З кожным днём яму ўсё мацней карцела пабачыць зблізу і дакрануцца да гэтых яек. Ён ведаў, што з іх павыклёўваюцца малыя пісклюкі, але ніяк не мог зразумець, як гэтыя жоўтыя цёплыя мячыкі вылускваюцца са шкарлупіны. Вядома, зайсці ў пакой было б самагубствам. Насуперак бабулінай перасцярозе ён спрабаваў аднойчы прыадчыніць дзверы. Убачыўшы яго, квактуха распусціла свае крылы, а ейнае пер'е натапырылася. Яна мігам ускочыла з гнязда і пабегла ў бок чужаніцы. Ён ледзь паспеў зачыніць дзверы. Здавалася, яшчэ момант і курыца павыдзёўбвала б ягоныя вялікія як яблык ад страху вочы. Аднак упартая цікаўнасць з часам узяла верх над бояззю перад квактухай, і малы ўсё ж наважыўся пераступіць парог. Дзеля гэтага ён задумаў накінуць на сябе дзедаву куфайку, якая прыкрывала яго з галавы да пятаў. Ён зашпіліў куфайку на ўсе гузікі, і не ўстаўляючы рукі ў рукавы, нацягнуў на сябе. Гэта было бяспечнае сховішча. І ўсё ж не зважаючы на надзейную заслону, сэрца калацілася як ніколі. Ён хуценька адчыніў дзверы і зайшоў у пакой. Курыца насцярожана прыўзнялася. Ён бачыў яе праз вузенькі прамежак на дзірцы для гузіка, адзін з якіх пакінуў незашпіленым. Калі малы зрабіў пару крокаў у бок да гнязда, курыца ўзняла нечуваны лямант, але кідацца, як папярэдне, на яго не стала. Відаць, перапалоханая ўбачаным, квактуха не ведала нават, як сябе з такім дзівам паводзіць. Падбадзёраны сваёй перамогай, ён пайшоў у наступ. Курыца квактала штосілы, але бабуля, якая магла б ёй дапамагчы, была ў гэты час занятая ў полі. Сагнаўшы квактуху з гнязда, хлопчык стаў над ім так, каб цалкам засланіцца ад небяспечнай дзюбы і кіпцюроў. Прысеўшы, каб узяць у руку яйка, ён, аднак, аступіўся і на сваё няшчасце закрануў нагой некалькі цёплых яек. Перапалоханы, пабачыў, што сталтаў і тут жа кінуўся на ўцёкі. Не паспеў ён, аднак, дабегчы да дзвярэй, калі пачуў грукат. Грукаліся звонку, тры разы запар.

Ён анямеў і застыў. Усё было настолькі нечакана, тым больш што грукату не было ў гэтым успаміне. Тады ён проста выбег з пакоя, хутка павесіў куфайку на цвік і пабег у сваю схованку, што была ў садзе, за расцвілай яблыняй. Ці то мінулае стала раптам занадта рэальным, ці то цяперашчына нахабна ўварвалася ў даўні ўжо час, цяпер вырашаць было позна. Хтосьці стаяў там за ягонымі дзвярыма. Урэшце ён скрануўся з месца і падышоў, каб адчыніць. На парозе стаяў незнаёмец. Мастаку падумалася, што гэта мусіць быць адзін з кліентаў, якія выходзяць аднолькава нечакана і нязвана. Таму, не задаўшы ніякіх нязручных пытанняў, ён упусціў госця ў майстэрню. Той моўчкі зайшоў і разгледзеўся па пакоі. Здавалася, ён ведае, што дзе знаходзіцца, бо ўпэўнена наблізіўся да склада карцінаў, пасля хутка пераkруціўся на назе і накіраваўся да мальберта. Ён ступаў роўным крокам і спыніўся, калі амаль ушчыльную наблізіўся да палотнішча. Пачаў пільна ўзірацца, здавалася, у фактуру, а не ў карціну, якая была перад ягонымі вачыма. Працягвалася гэта ненатуральна доўга.

— Яна яшчэ незакончаная — урэшце знайшоў адпаведныя словы мастак.

Аднак госць ніяк не адрэагаваў. У дзвярах ён не надта каб паспеў разгледзець ягоны твар, а цяпер ён стаяў да яго плячыма.

— Мне трэба яшчэ дамаляваць неба.

Як і папярэдне, госць адказаў цішынёй. Гэта насцярожыла мастака і ён вырашыў падыйсці і разгледзець твар незнаёмца, аднак не паспеўшы рушыць з месца, пачуў госцеў голас.

— Патлумачце мне, што азначае гэтая карціна.

— Што? — здзівіўся мастак гэтаму недарэчнаму пытанню. — Што патлумачыць? — жаданне ўбачыць госцеў твар сталася яшчэ мацнейшым, але ступіць далей чамусьці не наважыўся. — Вы жартуеце?

— Я заплачу — сказаў госць і выняў з кішэні залатое яйка.

Яно так моцна ўразіла мастака, што на нейкі момант ён перастаў дыхаць і любое сказанае слова не мела б у гэты момант ніякага сэнсу. Мастак стаяў утаропіўшы позірк у залатое яйка, якое ляжала на бездрыготкай далоні незнаёмага. Гэта працягвалася больш чым магла б працягвацца натуральная цішыня ў падобнай размове.

— Хто вы? — урэшце прамовіў уражаны да касцей мастак.

— Патлумачце мне, што азначае гэтая карціна — настойліва паўтарыў сваё ці то прашэнне, ці то пагрозу дзіўны госць.

— Я, я... не магу вам патлумачыць — выцісnуў мастак. — Я... я сам дакладна не ведаю — дадаў і ажно ўвесь перакруціўся ад агіды да сказанага.

Ізноў запала цяжкая і непрыемная цішыня. Незнаёмец рэзка паклаў залатое яйка назад у кішэню, адвярнуўся ад карціны, прайшоў каля мастака, затрымаўся на нейкі момант, пасля чаго выйшаў з пакоя і знік у дзвярным праходзе. Мастак, усё яшчэ заварожаны, зразумеў, што так і не пабачыў ягонага твару. Ён выбег на лесвічную клетку, але незнаёмца там ужо не было.

Мастак вярнуўся ў майстэрню і падбег да акна, але не змог нічога пабачыць — на дварэ была ўжо цемра. Ясна было адно — ягоны шлях вядзе толькі назад. Ён вярнуўся да дзвярэй, зачыніў іх і накіраваўся ў бок незакончанай карціны. Аднак, не дайшоўшы пару метраў да палатна, ягоны твар працяў крывы боль. Ён імпульсіўна прыпадняў ступак, з якога сачылася чырвоная фарба. Толькі цяпер ён зразумеў, кім напраўду быў гэты дзіўны госць.

2007—2009

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1, 2.)

Сёння ў нашых падраздзяленнях працуюць 550 чалавек. Каля 150 займаюцца толькі інвестыцыйнымі праектамі. Калі спатрэбіцца, людзей на першачарговыя аб'екты выведзем дадаткова.

Акрамя капітальнага будаўніцтва і рамонтаў, займаемся вытворчасцю жалезабетонных вырабаў, агароджаў і бетону — у дзённую змену можам выдаваць яго да 240 кубоў, а таксама тратуарнай пліткі. Яна карыстаецца попытам, і гэта не дзіўна. Калі толькі наладзілі яе вытворчасць, то правялі эксперымент: на выкладзеную пліткай пляцоўку перад заводскай прахадной загналі гружаны БелАЗ. 8-сантыметровая плітка спакойна вытрымала гэтую махіну...

Маем арматурны і сталярны цэхі, і шэраг іншых дапаможных вытворчых і транспартных падраздзяленняў.

Прымаем удзел у праграме адраджэння вёскі. Пабудавалі за апошнія гады некалькі цялятнікаў і зернесушылак. І зарабілі 1 мільярд 600 мільёнаў рублёў на Гомельскім хімзаводзе — гамяльчанам спатрэбілася кваліфікаваная дапамога.

Тое, што ў свой час была створана такая спецыялізаваная арганізацыя, сябе апраўдала. Мы ў кароткі тэрмін — праз восем гадзін — здольны вельмі лёгка пераходзіць на кругласутачны рэжым работы, без выхадных і святаў, і можам з ходу выконваць з «чыстага ліста» работы любой складанасці. Працуюць прафесіяналы, якім не патрэбна ўваходзіць у курс справы, яны ўжо ў «тэме». Гэта вельмі важна для забеспячэння бесперабойнай работы тэхналагічных ліній акцыянернага таварыства.

Выпрабавальны цэнтр таварыства, які акрэдытаваны на адпаведнасць патрабаванням СТБ ІСО/МЭК 17025-2007, ажыццяўляе ўваходны кантроль сыравіны і матэрыялаў, аперацыйны і прыёмачны кантроль прадукцыі. З мэтай павышэння ўзроўню выпрабаванняў і забеспячэння прызнання іх вынікаў замежнымі партнёрамі выпрабавальны цэнтр пастаянна аснашчаецца новым сучасным абсталяваннем, якое дазваляе праводзіць выпрабаванні як па дзяржаўных і міжнародных стандартах, так і па еўрапейскіх нормах.

Уся прадукцыя, што выпускаецца па міждзяржаўных і дзяржаўных стандартах Беларусі, сертыфікавана ў рамках Нацыянальнай сістэмы пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь. Цэмент, вапна і сухія будаўнічыя сумесі, што выпускаюцца згодна з еўрапейскімі нормамі, сертыфікаваны замежнымі органамі сертыфікацыі на адпаведнасць еўрапейскім нормам з правам маркіроўкі іх знакам СЕ.

Высокія якасныя параметры з самага пачатку закладваюцца ў новыя віды прадукцыі. Сёлета распрацавана восем новых рэцэптур сухіх будаўнічых сумесяў, пашыраны асартымент поліэтыленавай плёнкі, асвоены тры новыя віды цэменту: цэмент для тынкавачных і кладачных растворaў EN 413-1 МС 22,5 Х, які сертыфікаваны на адпаведнасць патрабаванням стандарта EN 413-1 з правам маркіроўкі яго знакам СЕ, партландцэмент пясчаністы CEM II/A- PP 42,5 N і CEM II/B- PP 32,5 R, сертыфікаваны польскім органам па сертыфікацыі і прызначаны для рэалізацыі спажыўцам у Рэспубліцы Польшчы.

Кіпіць праца на будаўнічых аб'ектах таварыства. Разам з калегамі іх узводзяць калектывы «Цэмбуда», гродзенскіх «Спецбудмантажа» і «Інвестспецбуда», прадстаўнікоў якога — майстра Сяргея СЯМАШКУ і намесніка галоўнага інжынера Дзмітрыя КАРПОВІЧА — мы бачым за работай.

Слова — ветэранам

Яны — неад'емная частка калектыву акцыянернага таварыства. Сваёй працай закладвалі падмурак сённяшняга поспеху. Зусім апраўдана напярэдадні свята пацікавіцца іх справамі.

Аляксандр Іванавіч ГЕРМАН:

— Працаваў я ў механічным цэху стругальшчыкам. Калі неўзабаве пасля вайны дэмабілізаваўся з арміі, то прыйшоў на завод. І адпрацаваў тут да самай пенсіі. На падоўжных станках стругалі нават бронепліты тэхналагічных халадзільнікаў, што размешчаны пад цэментнымі печамі-гігантамі — для ахаладжэння клінкеру. Пліта — аграмадная, больш за 80 кілаграмаў вагою, і патрэбна было неяк упраўляцца.

Завод пра нас памятае. Я вельмі ўхваляю дырэктара, бо ён аказвае вялікую дапамогу. Дапамаглі адрамантаваць дом — падмацавалі падмурак, бо асыпаўся, пабялілі вуглы — хатка ажыла. Прывезлі дровы. На Дзень Перамогі віншуюць і грошай даюць. І нават сумку прадуктаў. Юбілейныя манеты падарылі. Я проста ўдзячны дырэктару, перадайце яму, калі можна.

Цяпер мой сын, таксама Аляксандр, працуе на аўтабазе, якая абслугоўвае завод — возяць і мел, і гліну, цэмент... Так што Германы па-ранейшаму звязваюць сваё жыццё з аб'яднаннем.

Валянцін Мікалаевіч АРХІПАЎ:

— Я 26-га года нараджэння, і калі пачалася вайна, вучыўся ў сябе на радзіме, у горадзе Вольску Саратаўскай вобласці, у сямігодцы. Закончыў, і вясной 42-га года пайшоў уладкоўвацца на працу. У Вольску былі чатыры цэментныя заводы, і на адзін з іх мяне прынялі вучнем слесара, хоць не было яшчэ і шаснаццаці. Далі бронь, і мы замянілі сабой тых, хто быў прызваны на фронт. На «Чырвоным Кастрычніку» займаўся рамонтам складанага тэхналагічнага абсталявання. З нашага цэменту робяць бетон, а з бетону — кулямётныя гнёзды. Затым сталі выпускаць ЦАБы — цэментныя авіябомбы запальнага дзеяння. А каб вырабіць цэментную бомбу, завод «Металіст» выпускаў спецыяльныя чыгунныя формы. (Цяпер прадпрыемства забяспечвае аснасткай цэментныя заводы, і «Краснасельскбудматэрыялы» падтрымлівае з ім цесныя сувязі.) І мяне адкамандзіравалі на гэты завод, дзе займаўся апрацоўкай формаў. Так што я і мае таварышы працавалі на абарону.

Атрымліваў хлебную картку — цэлы кілаграм. Маці — усяго 200 грамаў. Так што я адчувальна дапамагаў сям'і.

Радзіма ўзнагародзіла хлопчыка з Вольска, як удзельніка працоўнага фронту, медалём «За доблесную працу ў гады вайны». Медаль знайшоў мяне праз гады, ужо ў Беларусі.

Пасля вучобы ў індустрыяльным тэхнікуме ў Падмаскоўі тры гады адпрацаваў у Вялікіх Луках, і разам з жонкай пераехалі ў Беларусь. Яе бацька быў адным з першых дырэктараў мясцовага цэментнага завода — Аляксандр Васільевіч Калігін. У Беларусі я пачынаў канструктарам тэхнічнага аддзела. Пазней працаваў начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела завода. Ужо пасля выхаду на пенсію ўзначаліў майстэрню, якая шыла для рабочых спецадзенне, быў інжынерам па тэхніцы бяспекі. Беларусь стала другой Радзімай. Прыемна, што і адміністрацыя, і прафсаюзны камітэт, і намеснік генеральнага дырэктара Мар'ян Вацлававіч Юроўскі пастаянна цікавяцца — як жыццё, як здароўе, не пакідаюць без увагі і дапамогі. Вось і Марына, з якой вы прыехалі, пастаянна да нас заходзіць. (Марына Стырнік, работніца прафкама таварыства — **Рэд.)** Так што мы не адчуваем сябе адарванымі ад жыцця калектыву.

Людміла Сямёнаўна АПАЛКА, старшыня савета ветэранаў акцыянернага таварыства:

— За доўгія гады працы ў гэтым дарагім мне калектыве была я дырэктарам вапнавага завода, начальнікам лабараторыі АТК, затым — дырэктарам шыфернага завода. Краіне патрэбен быў шыфер, і ўсе шэсць ліній працавалі на поўную магутнасць. На яго вытворчасць ішоў заўсёды лепшы цэмент маркі 500 і шыфер разыходзіўся поўнасцю! Асабліва ахвотна бралі будоўлі, і прыватнік таксама. Якасць лістоў залежала і ад рэкупіратаршчыка, і ад машыніста, нават ад кранаўшчыка, ад усіх. Людзі гэта разумелі і стараліся не падводзіць адзін аднаго. Калектыў быў вялікі, за 600 чалавек, і дружны, працавіты, творчы, бо развітым быў рух рацыяналізатараў пад кіраўніцтвам галоўнага інжынера Дзмітрыя Кастоўскага. Гэтыя якасці засталіся і цяпер.

Вельмі складаны быў момант, калі перайшлі на КСУКП — комплексную сістэму кіравання якасцю вытворчасці. Знайшлі маленькую шчарбінку — бракавалі ўвесь ліст. Глядзелі, каб стапа не была касая з-за рознай таўшчыні бакоў. Здавалася б, якая там розніца, падумаеш, з аднаго боку ліст на міліметр-два таўсцейшы. А нельга, настолькі строга было з якасцю. Ведаю, што такое стаўленне засталося і цяпер.

Святлана Аляксееўна РЫБКО *(з ёю мы сустрэліся ў санаторыі таварыства «Пралеска»):*

— Сорак гадоў я адпрацавала ў будаўніцтве. Узводзіла шыферны і вапнавы заводы. А ў 1985 годзе пачалі будаваць прыгажун-санаторый, чарга за чаргой. Прайшоўшы школу вытворча-тэхнічнага аддзела, я ў той час была намеснікам начальніка, а затым начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва аб'яднання. Муж — майстрам транспартнага цэха, адпраўляў спажыўцам прадукцыю. Так што ўсе перамены адбываліся на нашых вачах і з нашым удзелам.

Радуе і цешыць, што кіраўніцтва акцыянернага таварыства не забывае пра нас. Завод актыўна падтрымлівае сваіх ветэранаў. Фактычна ў кожны заезд у тую ж «Пралеску» ёсць пенсіянеры. Традыцыі калектывізму, якія закладвала некалі наша пакаленне, жывыя, гэта вельмі важна.

Лячэнне для нас — бясплатнае. Асабіста я ўжо многа гадоў прыязджаю сюды з унучкай. Прыязджаю, як дамоў. І атрымліваю новы зарад бадзёрасці і аптымізму.

«Пралеска» вачыма гасцей

Мы даволі часта расказваем на старонках сваёй газеты пра санаторый «Пралеска» акцыянернага таварыства, пра тыя сучасныя медыцынскія тэхналогіі, якія тут прымяняюцца. Зусім нядаўна прысвяцілі гэтай медыцынскай установе асобную палосную публікацыю (гл. «Звязду» за 3 сакавіка г.г.). На гэты раз мы вырашылі расказаць пра «Пралеску» вуснамі тых людзей, што папраўляюць тут сваё здароўе.

Таццяна ГОЛУБЕВА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь:

— Мне гэтае аб'яднанне як роднае. У свой час працавала намеснікам міністра і на працягу дзесяці гадоў курыравала прадпрыемства. Чым адрозніваецца гэты калектыў? Ён заўсёды, у любыя складаныя часы, быў на «плыву», і заўсёды глядзеў у перспектыву. Таму пастаянна вялося тэхнічнае пераўзбраенне. І тут заўсёды былі кіраўнікі высокага класа. Цэментнікі — своеасаблівая каста, і яны заўсёды трымалі марку.

Аб'яднанне трывала ўваходзіла ў лік лепшых у Савецкім Саюзе, а яго прадукцыя выкарыстоўвалася на самых адказных будоўлях. Такіх, як Астанкінская вежа ў Маскве, Асуанская плаціна і Суэцкі канал у Егіпце, стартавыя пляцоўкі Байканура, Мінскае метро, Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

Прадпрыемства імкнулася забяспечваць сваіх людзей жыллём, будавала дамы для сем'яў. Тут цудоўны мікраклімат, людзі жывуць дружна і працуюць з поўнай аддачай. Працуюць пакаленнямі — дзяды, бацькі, сыны. Заўсёды была чарга, каб уладкавацца сюды на працу, бо быць цэментнікам — пачэсна. І тое, што яны захавалі сваю «Пралеску», робіць кіраўнікам «Краснасельскбудматэрыялаў» гонар, многія прадпрыемствы пазбавіліся такога галаўнога болю.

Што датычыцца самога санаторыя, то гэта сур'ёзная лячэбная ўстанова. Мне даводзілася быць у іншых санаторыях, і магу сказаць, што ад многіх «Пралеска» адрозніваецца ў лепшы бок. Моцная лячэбная база, кваліфікаваны персанал, які дэманструе ўпэўненую работу без мітусні, узаемазамяняльнасць, цудоўнае стаўленне да адпачывальнікаў. Усе працэсы гарманічна падагнаны. Чысціня, парадак, культура, усё зроблена сваімі рукамі, з любоўю. Я з задавальненнем пабыла тут дзесяць дзён. Мне добра пайшлі ванны, «капсула», солевыя працэдуры, якія цудоўна арганізаваны, а ахвотных падлячыць органы дыхання шмат.

Адно, што варта было б зрабіць, — на тэрыторыі і побач ёсць крыніцы з мінеральнай вадой. Магчыма, варта прабіць свідравіны і шырока карыстацца сваёй гаючай вадзіцай у медыцынскіх мэтах.

Марыля ЦЕНЕВСКА, жыхарка Лодзі, Польшча:

— Летась я адпачывала ў «Свіцязі». Ехала, каб пабыць перш за ўсё ў мясцінах Міцкевіча, а трапіла ў цудоўны санаторый. У «Пралесцы» я ўжо тыдзень, таксама вельмі падабаецца. Хаджу на масаж і падводны масаж, на ванны і душы, і з велізарным задавальненнем — у басейн. Напэўна, у мінулым жыцці я была рыбай, бо вада — мая стыхія.

Людзі тут працуюць вельмі сімпатычныя. Заўсёды ўсміхаюцца, дапамагаюць, няма праблемы з мовай — калі не разумеем адзін аднаго па-руску, то размаўляем па-беларуску, па-польску. Упадабала вашу кухню, асабліва кашы. Адчуваю сябе камфортна.

Ірына МАМАЙКА, урач паліклінікі Нацыянальнай акадэміі навук, і Валянціна ТУРКІНА, старшая аперацыйная сястра цэнтра дзіцячай хірургіі *(мінчанкі, родныя сёстры):*

— У «Пралесцы» адпачываем чацвёрты год, усёй сям'ёй. Знайшлі яе праз турыстычную фірму, і так спадабалася, што сталі старажыламі. Задаволены абсалютна ўсім, нас задавальняюць лячэнне, харчаванне, умовы пражывання, адносіны з боку персаналу, парадак. І наш чыста беларускі клімат, да якога арганізм прыстасаваўся і мяняць які не хочацца, нават на перыяд адпачынку.

Тут дастойны масаж, цудоўны лімфамат. Уніспок — магнітная кушэтка, таксама дае шмат карысці. Вуглякіслыя ванны — і гарызантальныя, і вертыкальныя. Гэта тое, што мы прымаем і што нам вельмі падабаецца.

Адна праблема — з кожным годам усё складаней становіцца з пуцёўкамі. Калі зможам — будзем прыязджаць і надалей.

Наталля ВАЗНЯСЕНСКАЯ, лагапед дзіцячага садка з Санкт-Пецярбурга:

— З мужам і пяцігадовым дзіцем прыехалі з Расіі, першы раз, знаёмыя вельмі хвалілі адпачынак у Беларусі. А менавіта «Пралеску» мы знайшлі па інтэрнэце, праз сайт «Беларускія санаторыі». Пуцёўку набылі ў мінскай турфірме, аплацілі дома праз «Ашчадны банк». Пераслалі фірме квітанцыю, а яна нам — ваўчары. Прыехалі і засяліліся ў той нумар, які нам абяцалі.

Цікава, што выбіралі па здымках, па інфраструктуры, па цэнах, якія нас задаволілі. І бачым, што не памыліліся, мы задаволены адпачынкам. Сёння, на жаль, апошні яго дзень.

Сыну вельмі падабаецца аквапарк. Мне — лімфамат, гемаскоп — гэта лячэнне сасудаў і венаў.

Заўважыла, што вельмі многія бацькі адпачываюць, як і мы, з дзецьмі. І сталовая санаторыя асобна гатуе для дзяцей — кашкі, супы, стравы з тварагу.

За час адпачынку паездзілі па Беларусі — былі ў Гродне, у Ваўкавыску, у Жыровіцкім манастыры. Спадабаўся агульны парадак: дарогі — ідэальныя, паўсюдна — чысціня, палі засеяныя і дагледжаныя, а таму прыгожыя. Фермы стаяць выбеленыя. Гэта вельмі прыемна. У нас не зусім так.

Ветэрана Аляксандра ГЕРМАНА на прадпрыемстве ведаюць многія — ён адзін з тых, хто на працягу дзесяцігоддзяў ствараў і памнажаў працоўную славу калектыву.

Побач з яго партрэтам да месца будзе паказаць фотаздымкі жылых дамоў, у якіх справілі навасселле работнікі акцыянернага таварыства, і зялёных краявідаў на яго тэрыторыі. Чым не светлая ява, якую прыбліжалі сваёй працай ветэраны?

Алена СЕРГІЕНКА, першы галоўны ўрач, і Галіна ЗЫБКО, першая старшая медыцынская сястра «Пралескі»:

— Калі ўсё пачыналася, «Пралеска» была маленькая, на 50 месцаў, і адпачывалі ў ёй толькі работнікі аб'яднання. Быў усяго адзін корпус, вось гэты, што бліжэй да лесу. Потым пабудавалі два наступныя. Лячэнне ўжо тады было нармальнае, самае перадавое, што мелася на той момант у медыцыне: фізіялячэнне, ванны, набылі лазер, якім вельмі ганарыліся. Сухая вуглякіслая ванна — адна з першых у рэспубліцы, абсталяванне паступіла з Масквы. Набылі барокамеру і ванну для падводнай выцяжкі. Выконвалі масаж і мануальную тэрапію. Затым павялічылі нам колькасць койка-месцаў, увялі ў штат урачоў, дабавіўся сярэдні медыцынскі персанал. Але пры ўсіх зменах заставалася і застаецца добрае, прыязнае і нават спагадлівае стаўленне да людзей. Бо галоўнае ў нашай прафесіі — выслухаць і пастарацца зразумець чалавека.

Ужо тады да нас пачалі прыязджаць «па здароўе» з Анголы, Польшчы, нават з Афганістана.

Мы, калі бываем на сваёй ранейшай працы, то бачым: лячэбная база вельмі развілася, удасканальваюцца медыцынскія тэхналогіі. І што яшчэ змянілася, — выраслі дрэвы, якія мы тады садзілі. Выкопвалі ў лесе маленькія елачкі, бярозкі, іншыя саджанцы і пераносілі на сваю тэрыторыю. Санаторый стаў дэндрарыем.

Прыблізна ў сярэдзіне III тысячагоддзя да нашай эры, каля сённяшняга пасёлка Краснасельскі пачала развівацца крэмніевая прамысловасць. Археалагічныя знаходкі з гэтых шахтаў-калодзежаў захоўваюцца ў музеі прадпрыемства — інструмент тагачасных здабытчыкаў і ўзоры апрацаванага імі крэмнію.

Намеснік генеральнага дырэктара Мар'ян ЮРОЎСКІ не першы раз прыводзіць гасцей на месца, дзе калісьці працавалі старажытныя шахцёры. Цяпер уваходы ў досыць глыбокія шахты «запламбаваныя» масіўнымі бетоннымі крышкамі.

Да вельмі далёкіх часоў адрасуе яшчэ адзін экспанат мясцовага музея — знойдзены ў кар'еры прадпрыемства кавалак зуба маманта. Гэтую мясцовую славутасць дэманструе мастак Таццяна ВАСІЛЕВІЧ.

Віншуем усіх з днём будаўніка і жадаем здароўя, поспеху. Міру і шчасця.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНП 590118061.



Адным з паўнапраўных філіялаў таварыства з'яўляецца санаторый «Пралеска», пабудаваны больш за 20 гадоў таму як прафілакторый для адпачынку і аздараўлення рабочых. Сёння «Пралеска» ўваходзіць у лік лепшых беларускіх санаторыяў. Усе, хто адпачываў тут, абавязкова пазнаюць на гэтых здымках галоўны корпус санаторыя, пляж на беразе возера. Многіх доктар Марына ЮРЧАНКА лячыла з дапамогай сучаснай медыцынскай баракамеры, вытворца якой — знакаміты Расійскі касмічны навукова-вытворчы цэнтр.

На ніжнім здымку — утульная, прыгожа аформленая, сучасная кавярня «У мудрай савы». Яна адкрылася на тэрыторыі санаторыя зусім нядаўна.

Згодна з еўрапейскімі нормамі

Вядучы інжынер-тэхнолаг аддзела галоўнага тэхнолага Святлана ЛАНЦЭВІЧ:

— У акцыянерным таварыстве «Краснасельскбудматэрыялы» пастаянна надаецца асаблівая (менавіта асаблівая) ўвага павышэнню якасці прадукцыі, яе канкурэнтаздольнасці, а таксама асваенню выпуску новых відаў.

Са старонніх арганізацый так мабільна не працуе ніводная, што нам яшчэ раз пацвердзілі ў Гомелі. Змяншэнне прастояў тэхналагічных ліній напрамую адбіваецца на іх высокай прадукцыйнасці і вядзе да эканоміі сродкаў.

Цікава, што працэнтаў 80 футыровак цэментных печаў выконваюць у рэспубліцы нашы спецыялісты. У нас 22 футыроўшчыкі (а ўсяго ў Беларусі набярэцца чалавек 30 прадстаўнікоў гэтай прафесіі, не больш), і мы можам адначасова весці футыроўку дзвюх тэхналагічных ліній.

Хочацца назваць імёны сапраўдных майстроў сваёй справы: каменшчыкі-футыроўшчыкі Сяргей Васілеўскі і Сяргей Струг, слесары-рамонтнікі Алег Харкоў і Уладзімір Касіла. З інжынерна-тэхнічнага персаналу найбольш вопытнымі з'яўляюцца прараб участка спецрамонту Яўген Манцэвіч, майстар будаўнічага цэха Мікалай Станкевіч і інжынер-механік па наладцы абсталявання Уладзімір Хоміч. Гэта кадры, якія працуюць з першых дзён стварэння «Цэмбуда». Дарэчы, першым нашым кіраўніком быў цяперашні генеральны дырэктар акцыянернага таварыства Валянцін Алегавіч Вераціла.

Ветэран працы, першы галоўны ўрач «Пралескі» Алена СЕРГІЕНКА лячыла людзей добрым словам, добрымі лекамі і ўсім «арсеналам» даступных медыцынскай установе сродкаў, а работніца сталовай санаторыя Людміла КУЗЬМІНА лечыць смачнай ежай і... усмешкай.

Беларуская экзотыка

КРЭЙДАВЫЯ КАР'ЕРЫ НЕАЛІТУ

Месца, дзе падаюць метэарыты ды трава «крывавага» колеру

У Беларусі няма гор і не падалі велізарныя метэарыты? Вы ўпэўненыя? Некалі і я думаў так, пакуль не пабачыў увачавідкі тое, што, найхутчэй, аднясе вас у далёкую Аўстралію альбо спякотную Саудаўскую Аравію. І гэтае «тое» не на нейкіх там ускрайках, але нават зусім недалёка па міжнароднай шашы «Варшава—Мінск—Масква», што здзіўляе яшчэ больш...

Гэты неверагодны аб'ект я даўно пабачыў на фотаздымках аднаго вандроўніка, які распавядаў, што нічога такога ён нават у нашых суседзяў не бачыў — не тое, што ў нашай раўніннай Беларусі. На здымках красаваліся агромністыя горы белага колеру ды невялічкае азярцо з «аквамарынавай» вадой. Акрамя гэтага паўсюдныя «крымскія» пясчаныя дарожкі-лесвіцы, выдзеўбаныя, здавалася, яшчэ неандэртальцамі, так і цягнулі прылегчы ў цені нешматлікіх сосен. Чаго і казаць, што я адразу захапіўся гэтым месцам, а таму праз пэўны час, спланаваўшы маршрут і прыхапіўшы палатку, два «звяздоўцы» рушылі ў шлях да беларускай экзотыкі...

Каб патрапіць на кар'еры, давялося ехаць з Мінска на чатырох перасадках праз Маладзечна, Ліду і Масты, а пасля ўжо з Росі пешшу ісці да пасёлка Краснасельскага — там, па звестках, знаходзілася мэта нашай вандроўкі. Пасля роспытаў навакольных жыхароў, карціна, якую мы ўяўлялі, паступова ўсё больш скажалася, бо часам нам казалі, што на кар'еры трэба ісці «налева», а часам — «направа». Усё яшчэ больш заблыталася, калі мы, пабачыўшы зусім нічым не знакавы былы кар'ер, пачулі ад адной бабулькі на веласіпедзе: «Ідзіце вось туды, потым налева... А там, у лесе, каго-небудзь запытаеце!» Але, на шчасце, па дарозе ішлі два мясцовыя хлапчукі (адзін з іх, аказалася, прыехаў сюды з Масквы), якія, нягледзячы на тое, што ішлі па нейкіх справах, згадзіліся нас правесці ледзь не па ўсіх навакольных кар'ерных азёрах.

Каб патрапіць да першага кар'ера з Краснасельскага, трэба было ў пасёлку ля разгрузачнай станцыі звярнуць направа (калі па компасе, на захад) і, мінаючы невялічкія рыбалоўныя месцы, дайсці да дачнага пасёлка (дзесьці з кіламетр), унутры якога павярнуць налева (на ўсход). Пасля, наперадзе вас будзе чакаць лясная дарога ды два запар павароты ўглыб лесу, першым з якіх сваёй вельмі крутой глінянай



Вось такі «метэарыт» удалося знайсці карэспандэнту «Звязды».


Дзейныя кар'еры.

сцежкай (ад чаго лепш трымацца за ўсё, што пападае пад рукі, калі вы трапіце пасля дажджу) прывядзе вас на першы астравок неверагоднасці. Тут, у месцы, якое тутэйшымі атрымала дзіўную мянушку «5-ы вінт», вы можаце палавіць рыбу, якой развялося ВЕЛЬМІ шмат, альбо выкупацца ў празрыстай зялёнай вадзе... Аднак затрымацца надоўга не ўдасца, бо наперадзе чакае сапраўдны Марс — другі кар'ер. Каб да яго патрапіць, дастаткова павярнуць на другім павароце і спусціцца па горнай дарожцы...

На глыбіні «Выбухоўкі», якую мы імгненна назвалі «Кар'ер імя Вялікага Выбуху», вам адкрыецца зусім не беларускае відовішча: на бліскучых склонах нешматлікая расліннасць, чырвоная патрэсканая зямля ды вада насычанага зялёнага колеру, што ў сваёй празрыстасці, бадай, не мае аналагаў у Беларусі, а таму ў добрае надвор'е бачны нават былы будаўнічы кран, што ляжыць ледзь не за 20 метраў ад берага ўглыб. Акрамя гэтага прама пад нагамі багата раскідана асколкамі «метэарытаў», якія, напэўна, некалі ўтварылі гэтае возера...

Насамрэч гэта крэмень і з'явіўся ён тут пасля выпрацоўкі крэйдавага кар'ера, калі рабочым па дасягненні крыніцы давялося хутка пакідаць гэтае месца. А яна, у сваю чаргу, шпарка ўтварыла паўсюль невялічкія, але працяглыя і глыбокія азёры. Ад таго, відаць, і такая чысціня навакольных азёраў, што незлічоная колькасць прыроднага фільтра проста запаўняе сабой усё наўкола. Калі пашукаць, можна на памяць пакінуць сабе які-небудзь шэдэўр прыроднага майстэрства у выглядзе нейкай жывёлы, альбо структуры малекулы...

Але гэта толькі некалькі са шматлікіх Краснасельскіх кар'ераў. Чаму ж іх тут столькі? Рэч у тым, што ў гэтым мястэчку знаходзіцца адзін з самых значных сусветных цэментных заводаў, а таму ўжо з савецкага часу тут ідзе здабыча карысных глебаў, сярод якіх таксама і крэйда. Некаторыя кар'еры з цягам часу выпрацоўваліся, а таму пазней парасталі дрэвамі, запаўняліся вадой і ператвараліся ўжо не ў прамысловую зону, а ў аб'ект турызму. Гэткі ж лёс, здаецца, чакае і новыя, пакуль яшчэ дзейныя кар'еры, якія рассыпаліся за Карпаўцамі на ўсход. Цяпер жа там сапраўды траціцца адчуванне глыбіні, бо свядомасці непадрыхтаванага чалавека надзвычай цяжка назіраць, як МАЗы ператвараюцца ў запалкавыя пачкі, ад'язджаючы ўсё ніжэй за сваёй «порцыяй» грунту. А рушэнне тут вельмі ажыўленае, бо кожную хвіліну-другую дарогу мінае новая машына.

У гэтым сэнсе нам вельмі пашанцавала, бо можна было на МАЗе дабрацца ледзь не да ўсіх кар'ераў. Дакладней, вельмі дапамог спадар Уладзімір, які яшчэ цягам паездкі расказаў крыху пра гарадское прадпрыемства і здабычу выкапняў. Так, паводле яго слоў, гарадскі цэментны завод, на якім працуюць, бадай, ці не ўсе жыхары горада (ад чаго, варта сказаць, апошні не надта і ад буйных гарадоў адрозніваецца) працуе бесперапынна, а самі кіроўцы цяжкаважных юрыдычна працуюць не на заводзе, бо прыналежаць не Міністэрству прамысловасці, а Міністэрству транспарту і камунікацый. Але, падаецца, ад гэтага сутнасць не мяняецца: хтосьці здабывае, хтосьці возіць, а хтосьці працуе з выкапнямі...

Яшчэ адна цікавая акалічнасць: увесь час па дарозе Краснасельскі—Карпаўцы вашы боты, як і вы самі, будуць паступова змяняцца з аднаго на іншы колер — то спярша стануць гліняна-чырвонымі, а потым цэментна-белымі. Не дзіўна, чаму ўся суседняя вёска, у літаральным сэнсе, афарбаваная цэментна-крэйдавым пылам, што здавалася, нават вада ў калодзежах ператварылася ў адпаведны раствор. А побач жа яшчэ пясчаныя кар'еры!...

На вялікі жаль, з-за няведання пабываць на самым прыгожым крэйдавым кар'еры не ўдалося. Пазней толькі ўжо даведаемся, што ён знаходзіцца далёка ад Краснасельскага (на поўнач ад Карпаўцаў), а таму без машыны лепш нават у шлях не выпраўляцца. А там фантастычныя скаты беласнежных гор і празрыстая блакітная вада!.. Але ж хто сказаў, што гэтага не зробіце вы?!

Мікола ТАМАШЭВІЧ.
Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

ЯК ДАБРАЦЦА ДА КАР'ЕРАЎ?

Паглядзець на гэтыя чалавека-прыродныя дзівосы можна, выправіўшыся двума шляхамі: з боку Мастоў альбо Ваўкавыска. У любым выпадку трэба будзе праз 15—20 кіламетраў патрапіць спачатку ў Краснасельскі, а далей, пры наяўнасці часу, можна наведаць нават усе кар'еры. Назвы тром кар'ерам «5-ы вінт», «Выбухоўка», «Прамысловы». Каардынаты для GPS: (53о 15'01.33''N; 24о 24'14.11''E), (53о15'48.66''N; 24о33'44.80''E), (53о17'14.35''N, 24о30'32.08''E).

МІНЧАНЕ СТАЛІ ЧАСЦЕЙ ЗАКЛЮЧАЦЬ ШЛЮБНЫЯ ДАГАВОРЫ

З кожным годам у сталіцы заключаюць усё больш шлюбных дагавораў. Пра гэта расказаў старшы дзяржаўны натарыус 1-й Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Сяргей Аляксееў.

«Калі ў 2001 годзе ў Мінску былі заключаны 86 дагавораў, у першым паўгоддзі 2007-га ўжо 170, то ў студзені—чэрвені 2009 года — 376», — адзначыў ён.

Згодна з беларускім заканадаўствам, шлюбны дагавор можна заключаць альбо да, альбо пасля рэгістрацыі шлюбу, але ўваходзіць у сілу ён толькі з моманту нараджэння новай сям'і.

Паводле слоў суразмоўцы, каля 70 працэнтаў шлюбных дагавораў у Мінску заключаюць для таго, каб цывілізавана падзяліць сумесна нажытую маёмасць перад афіцыйным скасаваннем шлюбу.

У шлюбным кантракце могуць рэгулявацца як маёмасныя, так і асабістыя немаёмасныя адносіны мужа і жонкі. Напрыклад, месца пражывання, нюансы ў выхаванні дзяцей пасля скасавання шлюбу. Часам у дагаворы пара ўключае пункт, які абавязвае мужчыну выплачваць пасля разводу былой жонцы пэўную суму.

Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,
«Мінск—Навіны».

Усміхнёмся!

— Доктар, я займаюся сэксам са сваёй жонкай дзевяць разоў за ноч. Гэта дрэнна або добра?

— Гэта хлусня!

☺

Самыя карысныя хатнія жывёлы — гэта рыбкі. Не брэшуць, не кусаюцца, блых не прыносяць, у сне не храпуць і на закусь ідуць з усмешкай.

☺

— Мікалай Мікалаевіч, як вам не сорамна? Вы сорак гадоў пражылі з жонкай, а зараз пакінулі яе і ажаніліся з маладой!

— Ды што вы разумееце! Са старой жонкай уначы змучышся: то ёй валідол падай, то кроплі, то фортачку адчыні-зачыні. Жах! А з маладой як добра: увечары сыдзе, раніцай прыйдзе, усю ноч спіш спакойна.


— А вось па такіх чарвяках мы знаходзім смачных рыбаловаў!

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.31	20.58	15.27
Віцебск —	5.16	20.53	15.37
Магілёў —	5.21	20.48	15.27
Гомель —	5.24	20.39	15.15
Брэст —	5.48	21.12	15.24
Гродна —	5.54	21.07	15.13

Месяц
Поўня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны
Пр. *Хрысціны, Барыса, Георгія, Глеба, Мікалая.*
К. *СПАС, Славаміра, Сцяпана.*

Фота Марыны ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

6 жніўня

Дзень Хірасімы. Сусветны дзень барацьбы за забарону ядзернай зброі. 6 жніўня 1945 года амерыканская авіяцыя падвергла атамнай бамбадзіроўцы японскі горад Хірасіму, упершыню ў гісторыі прымяніўшы атамную зброю супраць людзей.

1924 год — пры спробе перайсці дзяржаўную мяжу Савецкага Саюза на тэрыторыі Беларусі быў арыштаваны расійскі палітычны дзеяч, арганізатар многіх тэрактаў Барыс Савінкаў. У 1920-х гадах разам з С. Булак-Булаховічам арганізоўваў рэйды ваенных атрадаў у Савецкую Беларусь з тэрыторыі Польшчы. Свае ўражанні ад Беларусі, становішча сялян і іх настрою адлюстраваў у аповесці «Конь вараны», у якой імкнуўся апраўдаць свой удзел у тэроры.

1936 год — войскі лідара іспанскіх мяцежнікаў генерала Франка чатырма калонамі пачалі марш на Мадрыд. Паводле слоў генерала, да гэтых чатырох франтавых калонаў дабавіцца «пятая калона», якая ўзарве сталіцу знутры (маюцца на ўвазе яго прыхільнікі, якія наладжвалі акцыі сабатажу, устройвалі дыверсіі, сеялі паніку). Тым не менш, рэспубліканскі Мадрыд пратрымаўся ў франкісцкай асадзе яшчэ больш як два гады.

Цытата дня:

«Сябар — люстэрка для сябра, і няма люстэрка больш светлага».

Аухад ад-Дзін Анвары (пам. 1191), персідскі паэт.

ЖАБА

Жаба ў культуры ўсходніх славян заўсёды успрымалася як нячыстая жывёла, роднасная змеям. Часам жабы сяліліся побач з калодзежамі, а іх жыхарства ў вадаёмах набліжала іх да рыбаў. Па народных уяўленнях у жабаў ператвараліся ластаўкі, якія накіроўваліся на зіму ў вырай. Лічылася, што ў жабаў ёсць свой каранаваны цар. Часам жабам прыпісвалася здольнасць джаліць людзей накшталт змей. Існавала павер'е, што Бог ад стварэння свету забараніў ім кусаць чалавека.

● У адным з паданняў сказана, што «жабы — гэта былыя людзі, патопленыя сусветным патопам. У іх, як і ў людзей, па пяць пальцаў на руках і нагах: чатыры доўгія, а адзін — кароткі. Прыйдзе час, і яны зноў стануць людзьмі, а мы, тыя, хто жыве цяпер, ператворымся ў жабаў».

● Лічылася, што ў жабаў таксама ператвараліся тапельцы, якіх зацягнулі ў ваду русалкі. У народзе казалі, што такіх тапельцаў можна вярнуць да жыцця, калі пераадолець чароўныя сілы. Так узнікла забарона забіваць жабаў — магчыма, загубіш невінаватую душу.

● Паўсюдна лічылася, што забойства жабы пакліча за сабой працяглыя дажджы. Таму ў засуху выконвалі рытуальнае забойства і пахаванне жабы з надзеяй на доўгачаканы дождж. Часам з той жа мэтай жабу кідалі ў калодзеж.

● Жабу выкарыстоўвалі ў народнай магіі, каб навесці на хату бяду, раз'яднаць людзей.

● Па народных уяўленнях, жаба была звязана з галоўнай хатняй карміцелькай — каровай і яе малаком. Гэта міфалагічная сувязь прасочвалася і на бытавым узроўні: для таго, каб на больш працяглы час захаваць малако, у збан кідалі (саджалі) жабу. Таксама лічылася, калі без падставы забіць жабу, у каровы знікне малако.

● Паўсюдна жанчынам забаранялася браць у рукі жабу, інакш хлеб не будзе ўставаць. Лічылася, калі пад печкай сядзіць жаба, хлеб не атрымаецца.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

МАРЫЦЕ ПРА АДДАНАГА ЧАТЫРОХНОГАГА СЯБРА?

Тады вам абавязкова трэба знайсці час і прыехаць 15 і 16 жніўня на вуліцу Гурскага, 42. Там з 9.00 да 13.00 і з 15.00 да 19.00 кожны ахвотны зможа бясплатна выбраць сабе ката ці сабаку ў кватэру альбо для палявання. Многія гадаванцы прывучаныя да выгулу, туалета.

Арганізатары акцыі, якая, дарэчы, прымеркаваная да Дня бяздомных жывёл, — прадпрыемства «Фаўна горада» і валанцёры. Яны дапамогуць падабраць жывёл, сумяшчальных з вамі па характары і звычках, раскажуць, як іх трэба даглядаць і чым карміць. **Адзіная просьба — захапіце з сабой пашпарт.**

Надзея ДРЫЛА.

ОРГАНИЗАЦИЯ ПРОДАСТ
АВТОМОБИЛЬ УАЗ-31514
1998 года выпуска,
оценочная стоимость 2 826 530 белорусских рублей.
Справки по телефонам
8 (02155) 41 472, 41 085, 41 192, 42 388,
GSM 8 (029) 354 64 80, 896 37 81.
УНП 300229387

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 25 (314)

Жнівеньскія клопаты

Яшчэ не позна зрабіць апошнюю прарыўку **морквы**. Вырваную моркву вынесці з градкі, інакш муха, пачуўшы пах бацвіння, якое вяне, тут жа прыляціць і нашкодзіць.

Бурачкі прарэджваць трэба больш дэталёва, пакідаючы адзін ад другога на адлегласці 6—10 см. Пажадана абламаць лісток, які жаўцее, бо ён не працуе на якасць прадукцыі, а толькі забірае сілкаванне.

Калі **гарбузы** толькі нарошчваюць масу, то **кабачкі** стаміліся фарміраваць плады. Пажадана, каб на кусце выспявала не больш як два кабачкі і не больш як тры гарбузы. Астатнія завязі выразаць. Можна падкарміць гарбузы настоем каравяку (1:5), птушынага памёту(1:10). Пад кожную расліну выліць да трох-чатырох літраў.

Павышанае ўтрыманне ў паветры вугальнай кіслаты паскарае рост пладоў агуркоў і таматаў, а таксама качаной салаты. Крыніцай вугальнай кіслаты ў цяпліцах і парніках можа быць разведзены каравяк ці птушыны памёт. Бочкі ці вёдры з імі ставяць у тарцах. У пладовых і агародных раслін плады растуць у асноўным у начныя часы, калі да пладоў паступае ўзмоцнены прыток арганічных рэчываў з лістоў.

Не рэкамендуецца знімаць мокрыя пасля дажджу плады, а калі вы ўсё ж зрабілі гэта, прасушыце іх у памяшканні. У гарачыя сонечныя дні пакідайце ўраджай у цені дрэў, або адразу ж прыбярыце ў халадзільнік — нагрэтыя сонцам плады, хутчэй за ўсё, распаюцца і загніюць.

У **памідораў**, каб паскорыць выспяванне пладоў, прышчыкваюць верхавінкі, выдаляюць кветкавыя кісці і бакавыя парасткі даўжынёй больш як 5 см.

Перац у доглядзе нічым не адрозніваецца ад памідораў: адрэзаць пасынкі, зняць ніжні ярус лістоў. Карміць настоямі каравяку. Можна выкарыстаць попел і мачавіну. На вядро вады — адпаведна шклянку і сталовую лыжку.

Фасолю карміць не трэба. Асобныя кусты, якія пажоўклі, зрэзаць ля самай зямлі і пакласці на даспяванне. А вось гарох, калі ён занудзіўся і стаў здавацца ў тэмпах развіцця, падкарміць абавязкова: курыны памёт (1:6) і шклянка попелу на вядро вады.

Убіраюць раннюю і сярэдняпозднюю **бульбу**, падсушваюць на сонцы, абтрэсваюць ад зямлі. Клубні, якія пазелянелі, выкарыстоўваюць толькі на насенне.

У садзе прышчыкніце верхавінкі **парэчак**. Гэта даць магчымасць лепш падрыхтавацца да зімы, моцна цвісці і пладаносіць ў наступным годзе.

Як толькі сабралі ўраджай **маліны**, абрэжце сцёблы, якія адпладаносілі. Чым раней вы гэта зробіце, тым менш на ўчастку будзе шкоднікаў і інфекцыі. Выразайце зламаныя і хворыя парасткі. Не пакідайце пянькоў, бо на іх накопліваецца многа інфекцыі. Пакіньце да вясны і моцныя і слабыя парасткі — так будзе лепш затрымлівацца снег. А вясной зрабіце карэкціровачную абрэзку. У рэмантантных гатункаў маліны трэба адрэзаць сцёблы, якія адпладаносілі, а таксама парасткі гэтага года.

У жніўні нельга марудзіць са зборам ягад **чорнай** і **чырвонай парэчкі**. Інакш не толькі губляецца іх пажыўнасць, але і стваральцца менш спрыяльныя ўмовы для закладкі добрых пупышак пад ураджай наступнага года.

У гэты ж час у кветніку размнажаюць дзяленнем куста і перасаджваюць на новае месца **півоні, астыльбы, лілеі, флёксы, дэльфініумы**. Але спачатку рыхтуюць глебу пад новыя пасадкі. Вядома, што півоня, аканіт і дэльфініум пакідаюць пасля сябе вельмі збяднелую глебу, пасля гэтых раслін яе трэба ўгнойваць, вапнаваць. На гэта месца шматгадовыя травы высаджваюцца не раней, чым праз 2 гады.

У пачатку месяца можна падкарміць кветкі, якія цяпер бурна цвітуць — **выргіні, гладыёлусы, мантбрэцыі** — каліем і фосфарам або растворам попелу. Рыхтуюць яго так: 1 шклянку попелу абдаюць кіпенем і разводзяць у 10 л вады. У першай дэкадзе дзеляць трох- і чатырохгадовыя **прымулы**.

Самыя карысныя нарыхтоўкі

За сваю гісторыю людзі прыдумалі мноства спосабаў нарыхтоўкі ежы ў запас. Свежыя прадукты даволі хутка губляюць свае першапачатковыя якасці.

Хіт-парад

- Прадукты замарожаныя рассыпныя
- Садавіна і агародніна замарожаныя ў цукровым сіропе
- Замарожанае пюрэ
- Працёртыя прадукты
- Сокі з садавіны і агародніны з мякацю і без.

Даўно вядомы шырокапашыраны метад засолкі і квашэння. Дзякуючы малочнакіслым бактэрыям, цукар, які ёсць у пладах і агародніне, ператвараецца ў малочную кіслату, якая і з'яўляецца кансервантам. Таксама некаторую садавіну і агародніну можна зацукрыць, як гэта прынята на Усходзе. Аднак усё гэта ў значнай ступені мяняе смак і водар ежы.

Самы старадаўні метад захоўвання прадуктаў — сушка. Гэта працэс доўгі і патрабуе асаблівай ўважлівасці.

У пачатку XIX стагоддзя людзі адкрылі метад больш якаснага захоўвання прадуктаў — кансерваванне, які карыстаецца высокай папулярнасцю і цяпер.

Каб зменшыць страты біялагічна актыўных рэчываў пры кансерваванні, памятайце:

посуд і інвентар павінны быць з нержавеючай сталі, эмаліраваныя або поліэтыленавыя для харчовых прадуктаў;

неабходна да мінімуму зменшыць кантакт падрыхтаванага прадукту з паветрам;

гатуйце строга па рэцэпце;

прытрымлівайцеся рэжыму захоўвання прадуктаў.

У сарванай садавіне і агародніне хоць нейкі час працягваюцца працэсы жыццядзейнасці, але ж пажыўныя рэчывы распадаюцца і губляюцца вітаміны. Напрыклад, колькасць аскарбінавай кіслаты залежыць ад таго, наколькі хутка вы ачысціце, нарэжаце плод і наколькі якасна прыгатуеце. Таму, напрыклад, у сухафруктах гэтага вітаміну практычна няма, ён разбураецца. Затое ў правільна замарожаных прадуктах яго больш за ўсё. Самыя ўстойлівыя да цеплавой апрацоўкі вітаміны групы РР і вітамін В6. Усяго на 10 працэнтаў змяншаецца пры кансерваванні вітамін В1, які вытрымлівае награванне да 120 градусаў.

Травы-прыправы: як захоўваць і выкарыстоўваць

Вырасціць духмяныя травы ў агародзе нескладана, а пра іх мы даволі многа расказвалі з самай вясны. У свежым выглядзе вострыя духмяныя травы выкарыстоўваюцца вясной і летам. Некаторыя з іх (эстрагон, пятрушка, кервель) могуць захоўвацца працяглы час у поліэтыленавым пакеце ў халадзільніку. Нарыхтоўваюць такія расліны з вясны і да позняй восені, а летнія месяцы ліпень і жнівень — час цвіцення многіх духмяных траў, менавіта цяпер іх нарыхтоўваюць на зіму. У запас можна сушыць лісты пятрушкі, кропу, сельдэрэю, эстрагону, базіліка, мялісы, катоўніка, змеегалоўніка, манарды, мяты, чабору, барага (маладыя лісцікі), салатнай гарчыцы, кінзы, любісты, катрана, шніт-цыбулі, цыбулі-шалота.

У якасці спецыі выкарыстоўваюць таксама насенне пятрушкі, сельдэрэю, кропу, любісты і каляндры. У сушаныя сумесі можна дадаваць молаты барбарыс, салодкі перац, лаўровы ліст, духмяны перац, чорны перац-гарошак.

Зяленіва мыюць і раскладваюць на ручнік, каб яно падсохла. Сушаць травы-прыправы на свежым паветры, звязаўшы ў невялікія пучкі, якія развешваюць у зацененым месцы. У час сушкі зяленіва часта і асцярожна пераварочваюць.

Захоўвайце вострыя духмяныя травы ў шчыльна закрытых непразрыстых бляшанках, у керамічных або з цёмнага шкла ёмістасцях.

Кожную траву захоўвайце ў асобнай ёмістасці.

Палічкі для вострапахкіх траў размяшчайце ў сухім месцы, далей ад пліты.

Прыправы ў насенні — кмен, аніс, фенхель — трэба малоць у спецыяльным млыне або таўчы ў ступцы непасрэдна перад ужываннем.

Травы-прыправы, якія мы вырошчваем на сваім агародзе, лепш зрываць непасрэдна перад ужываннем. У выпадку неабходнасці іх можна захаваць у свежым выглядзе ў халадзільніку ці шклянцы з вадой.

Ліставыя прыправы можна захоўваць і выкарыстоўваць у сушаным выглядзе, але ў гэтым выпадку яны крыху губляюць свае першапачатковыя ўласцівасці.

Прыправы не варта сыпаць з бляшанкі, у якой яны захоўваюцца, у каструлю са стравай у час варкі. Яны паглынаюць вільгаць з пары і губляюць водар.

Ужываць прыправы трэба асцярожна, каб не сапсаваць смак стравы.

Вострыя прыправы кладуць у стравы перад заканчэннем варкі (закрываюць каструлю накрыўкай) ці непасрэдна ў талерку.

Пастарайцеся, каб на вашым стале заўсёды былі сумесі з вострапахкіх траў.

Буякі балотныя

Размова пойдзе пра ягады, якія растуць на тарфяных балотах, у сырых хваёвых і ліставых лясах, так званых буяках звычайных ці балотных. Растуць яны на кусце, вышыня

якога не больш чым 1 м, і які жыве да 100 гадоў і пачынае пладаносіць у сярэднім з 15-гадовага ўзросту. Куст з цёмна-зялёнымі авальнымі лістамі, блакітнаватымі знізу. Цвіце ў чэрвені, а ягады з'яўляюцца ў ліпені-жніўні. Ягады буякоў збіраюць у сухое сонечнае надвор'е.

У народзе гэтыя ягады называюць дурніцамі. Часам зборшчыкі ягад адчуваюць галаўны боль і ваніты. Гэта тлумачыцца тым, што буякі звычайна растуць побач з багуном, пылок якога, трапляючы на ягады буякоў, перадае ім свае дурманячыя ўласцівасці. Самі ж буякі ніякіх шкодных для арганізма чалавека рэчываў не маюць.

У ягадах буякоў змяшчаюцца цукры, якія лёгка ўсвойваюцца, пектынавыя рэчывы, арганічныя кіслоты, пераважаюць мінеральныя рэчывы.

Хоць па колькасці аскарбінавай кіслаты буякі саступаюць многім ягадам, яны больш устойлівыя і лепш захоўваюцца. Дзякуючы сваім уласцівасцям буякі маюць вялікае лячэбна-прафілактычнае значэнне як супрацьцынготны сродак.

Настой сухіх ягад, які валодае даўкім дзеяннем, народная медыцына рэкамендуе пры паносе, энтэрыце, гастрыце.

Свежыя ягады і адвар з сухіх ягад прымяняюць як гарачкапаніжальны сродак, а таксама як агульнаўмацавальны сродак пры дызентарыі.

Адвар з лістоў п'юць як слабіцельнае, а разам з адварам галінак прымяняюць пры хваробах сэрца. Настой і адвар лістоў рэкамендуюць пры дыябеце.

Буякі ўжываюць у свежым і перапрацаваным выглядзе. Сок са свежых ягад — добры агульнаўмацавальны сродак і прыемны асвяжальны напой. З ягад гатуюць варэнне, джэм, павідла, кампот, сок. Найбольш шырокае прымяненне знаходзяць сушаныя буякі, з якіх зімой гатуюць кісялі, морсы, кампоты.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №МАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4233. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12